ТЭМА НУМАРУ: *ДАЛІТОЎСКАЯ* БЕЛАРУСЬ

Апошнія 15 гадоў у беларускай гістарыяграфіі праходзілі ў значнай ступені пад знакам «вайны» з суседзямі-літоўцамі (як правіла, завочнай) за спадчыну ВКЛ. Нягледзячы на мноства перамог, гэтая вайна прынесла і вельмі адчувальныя страты: адчужанасць ад пераможцаў асноўнай масы грамадзянаў Беларусі, напружанасць у дачыненнях з суседзямі і, нарэшце, небяспеку скарачэння ўласнай гісторыі на 400 гадоў і страты ўласнага твару, уласнага пазітыўнага вобразу ў свеце. Магчыма, надыходзіць пара частковай змены акцэнтаў у гістарычных даследаваннях. Перыяд ВКЛ — самы доўгі ў гісторыі нашай краіны, адзначаны слаўнымі дасягненнямі. Менавіта ў гэты перыяд сфармаваліся падставы існавання асобнага беларускага этнасу, краіна атрымала сучаснае імя; большую частку яго Беларусь была злучана з заходнееўрапейскай цывілізацыяй. Гэта немагчыма адмаўляць.

Аднак насамрэч усё было без энтузіязму ўспрынята пераважнай бальшынёй насельніцтва, якое і нефармальна, і фармальна неаднаразова выказвала недавер да каштоўнасцяў літоўскага перыяду нашай гісторыі. Сёння відавочна, што ў мностве сацыяльных пластоў і рэгіёнаў краіны структуры свядомасці, створаныя ў далітоўскі перыяд, працягваюць дамінаваць. Таму для выжывання самастойнай беларускай нацыі надзвычай важна інтэграваць літоўскую і рускую, лацінскую і бізантыйскую традыцыі. Такая тэндэнцыя намецілася яшчэ ў даследаваннях школы У. Антановіча 100-гадовай даўніны, якая разглядала ВКЛ як Літоўска-Рускую дзяржаву. Магчыма, беларусы занадта паспешліва адкінулі такую фармулёўку; яе ўяўная небяспека для нацыянальнай тоеснасці сёння выглядае перабольшанай.

Заходнееўрапейская цывілізацыя выпрацавала многія сацыяльныя інстытуты, тэхналогіі, этычныя і эстэтычныя прынцыпы, якія апошнія 200 гадоў служылі ўзорам для развіцця ўсяму свету. Але сучасная Беларусь неабавязкова мусіць некрытычна наследаваць гэтым узорам. Таму ёсць некалькі прычынаў: па-першае, Заходняя Еўропа сама імкліва адмаўляецца ад тых каштоўнасцяў, якія доўгі час забяспечвалі ёй прыярытэт у свеце, найперш маральны. Адмову згадаць хрысціянства як падставу існавання еўрапейскай цывілізацыі ў канстытуцыі Еўрапейскага Звязу азначае рашучую адмову ад уласных падмуркаў. Або прынамсі спробу такой адмовы, якая ў кожным разе выкліча нестабільнасць, уплыў якой на Беларусь лагічна было б мінімізаваць.

Па-другое, рэзкае і наўрад ці кароткатэрміновае падаражанне энэргарэсурсаў і імклівы перанос матэрыяльнай вытворчасці ў Азію пакідае нявырашаным пытанне, ці безумоўнае далучэнне да Заходняй Еўропы сапраўды азначае для Беларусі выйгрыш у эканамічным развіцці. І, нарэшце, відавочна, што сам Еўрапейскі Звяз да пашырэння на хрысціянскі Ўсход ставіцца больш насцярожана, чым да прыняцця ў свае шэрагі краінаў Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Пакуль няма ніводнага прэцэдэнту інтэграцыі краінаў кірылічнай традыцыі. Усё гэта не так настройвае на ваяўнічы антызаходні лад, як вымушае стрымана ставіцца да банальнай рыторыкі і больш крытычна разглядаць працэсы, якія адбываюцца на Захадзе. І непазбежна павышае ў цане *арыенталізм*. Прыгадаем, што ён быў арганічным *сарматам* Рэчы Паспалітай.

Самы сымбалічны матэрыял нумару — артыкул А. Шаланды, які не толькі рэканструюе гістарычную сымболіку і геральдыку Полацкае дзяржавы X—XV стст., але і прапануе магчымасць кампрамісу, прымірэння прыхільнікаў *Русі* і *Літвы* ў праекце новага нацыянальнага герба Беларусі. Гэты праект адкрыты для абмеркавання і крытыкі; але аднолькава цяжка ўявіць поўную перамогу над апанентамі як *ліцвінаў*, так і *русінаў*. 500 гадоў таму Цюдоры, якія выйшлі пераможцамі ў доўгай і крывавай вайне Пунсовай і Белай Ружаў у Ангельшчыне, сцвердзілі ў якасці геральдычнага сымбалю іх злучэнне. Сучаснай Беларусі вострa патрэбныя падобныя сымбалічныя жэсты, без якіх немагчыма наладзіць мірнае жыццё.

Алесь БЕЛЫ.

Архетыпы гравіраваных выяваў і арнаментальнага аздаблення на касцяных вырабах каменнага веку

З калекцыі Музею старажытнабеларускай культуры

Калекцыя з Азярнога 2Б (Мінская вобласць, Любанскі раён) налічвае больш за 120 вырабаў з костак і рогу. Асноўная колькасць перададзена ў Любанскі музей, а некаторыя — касцяныя вырабы з унікальнымі гравіраванымі малюнкамі й арнаментальным аздабленнем — захоўваюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры.

Згаданыя знаходкі ў комплексе з іншымі артэфактамі каменнага веку — керамікай і крамянёвымі вырабамі — залягалі на дне в. Вячэра. Невялікае па плошчы возера (каля 3 кв. км) размешчана на плоскай затарфаванай нізіне, за 5—6 км у паўднёва-ўсходнім накірунку ад ракі Арэсы (басейн Прыпяці). На некаторых поймавых пясчаных узвышшах Вячэры адзначаюцца сляды старажытных паселішчаў *[Крывальцэвіч М., 1993а, с. 29—31]*. Адно з іх знойдзена на мысе паўднёва-ўсходняга берагу (Азярное 2А). Насупраць яго пад вадой залягалі культурныя адклады каменнага веку (Азярное 2Б) *[Крывальцэвіч М., 1993а; 1993б; 1996, с. 147; 1999, с. 30—31]*. Сярод знойдзеных у Азярным 2Б артэфактаў вылучаецца комплекс знаходак мезалітычнага перыяду *[Крывальцэвіч М., 1996, с. 147—168]*, які можа адносіцца да VII—VI/V тыс. да н. э. *[Крывальцэвіч М., 1996; Кривальцевич М., Симакова Г., 2004]*. Вялікая колькасць фрагментаў керамікі, крамянёвых, касцяных і рагавых вырабаў аднесена да неалітычнага этапу жыцця людзей у Азярным 2Б. Неалітычны комплекс Азярнога 2Б у асноўным пакінуты ў III тыс. да н. э. *[Крывальцэвіч М., 1996; Кривальцевич М., Симакова Г., 2004]*. Мяркуецца, што культурныя рэшткі апынуліся ў вадзе на месцы палевых паселішчаў ці ў выніку перыядычнага пад'ёму ўзроўню вады ў возеры і затапленні прыбярэжных старажытных стаянак *[Крывальцэвіч М., 1996]*.

Сярод знойдзеных на месцы Азярнага 2Б мастацкіх вырабаў найбольшай увагі заслугоўвае *трохфігурная кампазіцыя на рэштках апрацаванай косткі лася*. Бакавая частка косткі зрэзана, верх зачышчаны. Малюнкі наносіліся на апрацаваную локцевую костку лася, адна з асаблівасцяў якой — параўнальная вялікая даўжыня. Мяркуючы па рэштках, сюжэт кампазіцыі мог мець працяг на страчанай частцы вырабу. На двух супрацьлеглых баках вырабу тонкім разцом (крамянёвым?) выразаны тры выявы, дзве з якіх антрапаморфныя. Цэнтральная фігура кампазіцыі — параўнальна вялікая выява чалавека, які скача з узнятымі рукамі.

Азярное 2Б. Трохфігурная кампазіцыя на рэштках апрацаванай косткі лася. Позні неаліт.

У трохпальцавую левую далонь упіраецца дзяржанне сякеры (ці прыстасаванне накшталт сякеры?). Галава — без рысаў твару. Тулава чалавечай (відавочна, мужчынскай) постаці аздоблена малюнкам (арнамент ці элементы вопраткі?). Пад правай нагой згаданай фігуры — другая выява, абрысы якой губляюцца на месцы злому. Яна ўяўляе сабою ромб з адыходзячымі ад яго рыскамі. На адваротным баку вырабу нанесена яшчэ адна антрапаморфная



Азярное 2Б. Зааморфная выява на птушынай костцы. Позні мезаліт.

выява — бязрукі чалавек з рамбічнаю галавою. Ногі сагнутыя ў каленях і разведзены.

Выявы людзей, якія скачуць, — адзін з характэрных мастацкіх сюжэтаў каменнага веку *[Лозе И., 1987; Исаенко В., 1971; Гурина Н., 1980; Смирнов, 1984, с. 85—86; Саватеев Ю., 1980, рис. 4: 11; Монгайт А., 1973, с. 226; Butrimas A., 2000; Larsson L., 2000, p. 50—52]*. Малюнкі постацяў людзей наносіліся на касцяныя і каменныя вырабы, на паверхню камянёў, а таксама на керамічны посуд. У Цыркумбалтыйскім рэгіёне, Скандынавіі й Зеландыі самыя старажытныя антрапаморфныя выявы вядомы ўжо з мезалітычнага перыяду *[Butrimas A., 2000, p. 8—11; Larsson L., 2000, p. 50—52]*. Стыль і спосаб выканання некаторых з іх — гравіроўка па костцы, заштрыхаванасць пракрэсленага тулава, рамбападобнасць галавы, расстаўленыя ног і ўзнятыя рукі — нагадвае антрапаморфныя малюнкі Азярнога 2Б *[гл., напрыклад, Larsson L., 2000, fig. 30]*. На аналогіі азярнянскім выявам сярод мезалітычных малюнкаў Скандынавіі і Зеландыі *(Vesko, Langeland, Holmegard)* спасылаўся Адомас Бутрымас *[Butrimas A., 2000, p. 9]*.



Азярное 2Б. Касцяны кінжал, аздоблены арнаментам. Позні мезаліт.

Аднак сюжэт азярнянскага твору ў пэўнай ступені адпавядае таксама тым кампазіцыям, якія выконваліся на керамічным посудзе позняга неаліту — ранняга перыяду бронзавага веку. Найперш маецца на ўвазе малюнак з «паляўнічым і качачкай» на неалітычнай пасудзіне паселішча Юравічы 3 (Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці) *[Исаенко И., 1971; гл. таксама: Кривальцевич М., 1988]*. Фігурка чалавека з узнятымі рукамі адціснута шнурам на позненеалітычным гаршку паселішча Ніда (Літва) *[Rimantienė R., 1989, XXIV]*. Малюнак чалавека з разведзенымі ў бакі рукамі і рамбападобнай галавой нанесены на гаршку паўночнабеларускай культуры (позні неаліт — ранні перыяд бронзавага веку) з паселішча Асавец *[Чарняўскі М., 1987, мал. 8]*.

Антрапаморфныя выявы, якія выконваліся на керамічным посудзе, напэўна ў большай ступені адпавядаюць сэнсавай і выяўленчай ідэі малюнку з Азярнога 2Б. У сувязі з гэтым апрацаваная кост-



Юравічы 3. Фрагмент верхняй часткі пасудзіны з выявамі «паляўнічага і качачкі». Позні неаліт.



Ніда (Літва). Шнуравая кераміка з антрапаморфнымі выямі.



Асавец. Антрапаморфная выява на пасудзіне паўночнабеларускай культуры.

ка лася з выявамі людзей хутчэй за ўсё мае дачыненне да неалітычнага комплексу знаходак. З улікам адпаведнага археалагічнага кантэксту помніку яна можа датавацца ў межах III тыс. да н. э. *[Крывальцэвіч М., 1993б, с. 71]*.

У кампазіцыі знайшлі адлюстраванне нейкія папулярныя міфалагічныя сюжэты позняга неаліту — пачатку эпохі бронзы. Падзеі ўвасабляюцца з дапамогаю традыцыйнай для таго часу сістэмы сімвалаў. Напэўна, адгадка семантыкі згаданых вобразаў тоіцца ў падкрэсленай дынамічнасці, гераізаванасці асноўнай выявы — чалавека, які скача. Калі трохкутнік і лінія, што цягнецца ад яго трохпальцавай рукі, азначае стылізаваны малюнак сякеры, то ў такім разе варта дапусціць наступнае: перад намі разгортваюцца падзеі нейкага старажытнага міфу, у якасці аднаго з асноўных герояў якога выступае ўзброены сякерай мужчына — адмысловы Бог-абаронца ў чалавечым аблічы *[Крывальцэвіч М., 1993б, с. 71]*.

Другі малюнак, на якім варта спыніць увагу, — *зааморфная выява на птушынай костцы*.

Малюнак выкананы на фрагменце буйной птушынай косткі, эпіфіз якой абрэзаны. Супрацьлеглы канец косткі абламаўся, і частка малюнку страчана. Ён выконваўся суцэльнымі лініямі і кароткімі рыскамі, якія праводзіліся надзвычай тонкім разцом (крамянёвым?). Кампазіцыйны цэнтр — зааморфная выява нейкай істоты (найбольш верагодна лася) у імклівым бегу. Цела жывёлы заштрыхавана здвоенымі папярочнымі пункцірнымі радамі, галава і шыя — суцэльнымі лініямі. Ногі (пярэднія сагнутыя ў каленях) пераходзяць у лукаткападобны дол, лінія якога працягваецца ў зігзаг да задніх ног жывёлы. Ад вяршыняў лукаткі адыходзяць уніз просталінейныя пункціры.

Кампазіцыя не мае аналогіяў сярод старажытнасцяў прылеглых тэрыторыяў, але асобнымі стылявымі рысамі нагадвае некаторыя прыбалтыйскія і паўночнаеўрапейскія малюнкі на касцяных, рагавых вырабах і камянях. Жывёліна намалявана ў бакавой праекцыі, з доўгаю шыяй, масіўнаю мордай, хвосцікам, што тырчыць уверх. Такая стылізацыя характэрная пры маляванні лася ў Цыркумбалтыйскім рэгіёне і паўночнай Еўропе людзьмі эпохі каменю *[гл., напрыклад, Гурина Н., 1980, с. 123; Саватеев Ю., 1980, с. 144; Larsson L., 2000, fig. 16, 35, 36, 38]*. На мезалітычных кампазіцыях, якія наносіліся на касцяныя вырабы, заўважаюцца таксама іншыя арнаментальныя аздабленні, якія прысутнічаюць у азярнянскім сюжэце. Напрыклад, ломаныя зігзагі, у тым ліку й тыя, ад якіх адыходзяць пункцірныя прамыя лініі, сустракаюцца сярод арнаментальнага аздаблення многіх мезалітычных малюнкаў *[параўн., напрыклад, Larsson L., 2000, fig. 2, 11, 13]*. У мезаліце вельмі часта фігуры людзей і жывёлаў заштрыхоўваліся папярочнымі рыскамі *[гл., напрыклад, Larsson L., 2000, fig. 2: VII; 30]*.



Антрапаморфныя выявы мезалітычнага перыяду (паводле Г. Кларка і А. Фішара).

З улікам згаданых аналогіяў малюнак на птушынай костцы быў выкананы ў мезалітычны перыяд. Мяркуючы па храналогіі мезалітычнага комплексу Азярнога 2Б,



Арнаментаваны касцяны кінжал (паўночная Швецыя).

выраб датуецца ў межах VII—VI/V тыс. да н. э. *[гл. таксама: Крывальцэвіч М., 1993б, с. 70]*.

Прыблізна ў гэты перыяд быў зроблены *касцяны кінжал, адна з лёзавых паверхняў якога аздаблялася арнаментам*. Даўжыня вырабу крыху большая за 19 см. Лязо мае пашыранае вастрыё. На баках кінжала прарэзаны шырокія пазы (для крамянёвых пласціністых уставак?). Пляскатая паверхня ляза, г. зн. той часткі, якая не хавалася ў дзяржанне, была аздоблена наразным арнаментам. Аздабленне складалася з выгравіраванага зігзагу і дзвюх паралельных лініяў, ад якіх адыходзілі кароткія рыскі.

Касцяныя кінжалы, лязо якіх узмацнялася крамянёвымі мікралітамі, — адзін з найбольш характэрных вырабаў менавіта мезалітычнага перыяду *[гл., напрыклад, Крывальцэвіч М., 1996, с. 155; Larsson L., 2000, fig. 8]*. Кінжал аздоблены традыцыйным для мезаліту арнаментам. Аналагічнае ўпрыгожванне такога тыпу сустракаецца на мезалітычных касцяных вырабах Прыбалтыкі, Паўночнай Еўропы *[параўн., напрыклад, Лозе И., 1968, с. 33, табл. 6; Larsson L., 2000, fig. 2: I, 7, 8]*. Паводле свайго стылю аздабленне азярнянскага кінжала нагадвае гравіраваны арнамент на кінжале з паўночнай Швецыі *[Larsson L., 2000, fig. 8]*.

Варта звярнуць увагу на тую абставіну, што арнаментальнае аздабленне і малюнкі на касцяных вырабах Азярнога 2Б атаясамліваюцца найперш са стылем і сюжэтнымі кампазіцыямі, якія найчасцей сустракаюцца на помніках каменнага веку Цыркумбалтыйскага і паўночнаеўрапейскага рэгіёнаў. Згаданая акалічнасць можа мець істотнае значэнне пры вызначэнні агульных тэндэнцыяў у развіцці старажытнай мастацкай творчасці на абшарах Беларусі.

КРЫНІЦЫ

Гурина Н., 1980. Наскальные рисунки Кольского полуострова (общие и специфические черты) // Первобытное искусство: Звери в камне. Новосибирск.

Исаенко В., 1971. Неолитический сосуд с рисунком из Белоруссии // Советская археология. № 2. С. 211—213.

Кривальцевич Н., Симакова Г., 2004. Микрорегион озера Вечера (Предполесье Беларуси): основные этапы освоения и использования (по археологическим и пыльцевым данным) // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 19.

Кривальцевич Н., 1988. «Уточка» в верованиях неолитических племен Белоруссии // Древности Литвы и Белоруссии. Вильнюс. С. 18—22.

Крывальцэвіч М., 1993а. Азярное // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мінск. С. 29—32.

Крывальцэвіч М., 1993б. Самае найстаражытнае. Мастацкае аздабленьне на касьцяных вырабах эпохі каменя // Мастацтва. № 5. С. 68—71.

Крывальцэвіч М., 1996. Касцяныя і рагавыя вырабы каменнага веку з возера Вячэра // З глыбі вякоў. Наш край. № 1. Мінск. С. 147—168.

Крывальцэвіч М., 1999. Азярное 1 — паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся. Мінск.

Лозе И., 1987. Изображение человека в искусстве каменного века Восточной Прибалтики // Первобытное искусство: Антропоморфные изображения. Новосибирск. С. 45—47.

Монгайт А., 1973. Археология Западной Европы: Каменный век. Москва.

Саватеев Ю., 1980. Онежские петроглифы и тема зверя в них // Первобытное искусство: Звери в камне. Новосибирск.

Чарняўскі М., 1987. Мастацтва першабытнаабшчыннага ладу. Бронзавы век // Гісторыя беларускага мастацтва: У 6-ці тамах. Т. 1: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст. Мінск. С. 25—28.

Butrimas A., 2000. Human Figurines in Eastern-Baltic Prehistoric Art // Prehistoric Art in the Baltic Region. Vilnius. P. 7—29.

Larsson L., 2000. Expressions of Art in the Mesolithic Society of Scandinavia // Prehistoric Art in the Baltic Region. Vilnius. P. 31—61.

Rimantienė R., 1989. Nida. Senųjų baltų gyvenvietė. Vilnius.

Мікола КРЫВАЛЬЦЭВІЧ,
Аксана ВАРАТНІКОВА.

Ці існавала старажытнаруская народнасць,

альбо Пра «калыску» беларускага народу

Пры вывучэнні перыяду гісторыі Беларусі, які называюць «старажытнарускі», «полацка-новагародскі» ці «далітоўскі», сучасны даследнік сутыкаецца з дзвюма сур'ёзнымі праблемамі — адна аб'ектыўнага характару, другая суб'ектыўнага.

Першая — гэта малалікасць існуючай крыніцазнаўчай базы. Для кожнага, хто вырашыў прысвяціць сябе вывучэнню гісторыі Беларусі сярэднявечнага перыяду, галоўнай крыніцай з'яўляюцца летапісы. Так склалася, што актавы матэрыял, царкоўныя архівы, мемуарная літаратура і эпісталярныя творы ранняга сярэднявечча з тэрыторыі Усходняй Еўропы амаль не захаваліся. Яшчэ горшая сітуацыя склалася адносна беларускіх земляў. Айчынны даследнік мусіць памятаць, што на сённяшні дзень, на жаль, не вядомыя (не захаваліся) уласна беларускія гістарычныя крыніцы ранняга сярэднявечча. Першым «беларускім» дакументам лічыцца ***Гандлёвая дамова 1229 г.*** паміж Смаленскам, Полацкам і Віцебскам з аднаго боку, і Рыгай і Готландам — з другога. Інфармацыя аб гісторыі Беларусі да пачатку XIV ст. пераважна захавалася ў нарацыйных крыніцах суседніх тэрытарыяльна-палітычных і культурных цэнтраў: Кіева, Ноўгарада і Пскова, Уладзіміра і Суздаля, Галіча і Валыні, Польшчы і Нямецкіх рыцарскіх ордэнаў. Натуральна, што паведамленні іх фрагментарныя, тэндэнцыйныя, а часам свядома фальшывыя. Напрыклад, згодна звесткам новагародскага і кіеўскага летапісання, полацка-новагародскія альбо полацка-кіеўскія дачыненні ўяўляюцца пераважна як варожыя і ваяўнічыя. Гэта зусім не адпавядае сапраўднасці. Аналізуючы новагародскае летапісанне (***Новагародскі I летапіс старэйшага і малодшага ізводаў***), звяртаем увагу, што аўтараў летапісаў гісторыя Полацку цікавіла пераважна ў момант канфліктных сітуацыяў альбо калі падзеі мелі агульнарускі характар. У ***Новагародскім I летапісе малодшага ізводу*** (звод сярэдзіны XV ст. даведзены да 1446 г.) звестак пра Полацк да канца XIII ст. знаходзім толькі 30: 5 з часоў Уладзіміра і Рагнеды, 1 пра Брачыслава, 7 з часоў Усяслава Брачыслававіча, 9 з XII ст. і 8 з XIII ст. Прычым пераважная бальшыня з іх мае вайсковы характар. Натуральна, наяўная крыніцазнаўчая база не дазваляе ў поўным аб'ёме сканструяваць новагародска-полацкія дачыненні ў раннім сярэднявеччы. Апроч таго, па-за ўвагай новагародскага летапісца засталіся гаспадарчыя і культурныя стасункі, высокі ўзровень якіх пацвярджаецца археалагічнымі, лінгвістычнымі і мастацтвазнаўчымі крыніцамі.

Першая старонка «Аповесці мінулых гадоў».

Аднак вывучаць мінуўшчыну мы абавязаны. Дзеля больш трывалай і абгрунтаванай канструкцыі сваёй сярэднявечнай гісторыі беларускаму даследніку наканавана часцей і глыбей выкарыстоўваць новыя тэксталагічныя прыёмы нутранога і знешняга аналізу летапісных крыніцаў, карэляваць іх паміж сабою і шырока выкарыстоўваць метады і крыніцы іншых навук (археалогіі, этналогіі, сацыялогіі, лінгвістыкі, гістарычнай геаграфіі).

Другая праблема — суб'ектыўная — больш важкая, і звязана яна з метадалагічнымі пазіцыямі і падыходамі, асабліва ў пытаннях этнічнай ідэнтыфікацыі насельніцтва Усходняй Еўропы ў IX—XIII стст. Вырашэнне гэтай праблемы на дадзены момант мае першапачатнае значэнне. Ад гэтага залежыць трываласць, абгрунта-

Бойка Воўчага Хваста, ваяводы кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча, з радзімічамі на рацэ Пішчане ў 984 г. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

ванасць і праўдзівасць гістарычнай канструкцыі сярэднявечнага мінулага Беларусі.

Прызнаючы ў прынцыпе немагчымасць адэкватнага пазнання гістарычнай мінуўшчыны, савецкая, а таксама сучасная расейская і беларуская гістарыяграфія ў той жа час лічаць абсалютна вырашанай праблему гэтак званай «старажытнарускай народнасці» — адзінай этнічнай супольнасці, якую ўтварылі ўсходнія славяне ў IX—XIII стст. Бясспрэчнай ісцінай у апошняй інстанцыі, узведзенай у ранг дзяржаўнай дактрыны, стаў пастулат савецкай этналогіі, мовазнаўства і гісторыі пра паходжанне сучасных усходнеславянскіх народаў і моваў ад агульнага кораню — старажытнарускай народнасці і, адпаведна, старажытнарускай мовы. Яшчэ зусім нядаўна існавала афіцыйна ўстаноўленая дата ўзнікнення беларусаў і ўкраінцаў, адзіная і непарушная, — XIV ст. (пра рускую мову дазвалялася гаварыць практычна з X ст.). Але нават павярхоўны, але непрадузяты аналіз тэзаў пра Старажытную (Кіеўскую) Русь як агульную калыску брацкіх усходнеславянскіх народаў, пра старажытнарускую народнасць як этнічную аснову рускіх, украінцаў і беларусаў і пра старажытнарускую мову як агульную крыніцу кожнай з усходнеславянскіх моваў паказвае міфічнасць усіх гэтых афіцыйных догмаў, створаных не на навуковым, а на ідэалагічным падмурку.

Праблематычнасць вызначэння старажытнарускай народнасці ўзнікае ўжо з таго, што мы дагэтуль фактычна не маем навуковых дэфініцыяў народнасці і нацыі, якія адлюстроўвалі б глыбінную сутнасць гэтых грамадскіх з'яваў. Адносна разумення народнасці, у прыватнасці, старажытнарускай, савецкія і постсавецкія вучоныя ўвесь час паслядоўна кіраваліся тэзай пра тое, што народнасці ўласцівыя тыя самыя рысы, што і нацыі, але ў пачатковым, неразвітым выглядзе. А наконт нацыі мы, як ні дзіўна, да гэтага часу карыстаемся, па сутнасці, сталінскім вызначэннем, змешчаным у «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)», згодна з якім нацыя — гэта гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца агульнасцю тэрыторыі, мовы, эканамічных сувязяў, асаблівасцямі псіхічнага складу, што выяўляецца ў спецыфічных рысах культуры. І зусім нічога не сказана пра ментальнасць, народныя звычаі і г. д. Але калі нават кіравацца гэтым састарэлым азначэннем народнасці і нацыі, давесці, што старажытнаруская народнасць мела ўсе неабходныя для яе адзнакі — агульную тэрыторыю, мову і агульны псіхічны склад (гэта значыць — агульную культуру), практычна немагчыма.

Генеалагічны міф быў важны як для народаў, так і для паасобных сем'яў. Генеалагічнае дрэва – гларыфікацыя роду Пузынаў. 1699 г.

Каб пераканацца ў слушнасці выказанага меркавання, варта звярнуць увагу на гістарыяграфію праблемы. Расейская гістарычная навука XIX — пачатку XX ст. тэрміна «старажытнаруская народнасць» не ведала. Яшчэ ў 50-я гады пазамінулага стагоддзя М. Пагодзін і М. Максімовіч дыскутавалі паміж сабой, каго лічыць сапраўднымі «россами» — паўднёвае насельніцтва альбо паўночнае, каму сапраўды належыць кіеўскі перыяд рускай гісторыі, прыярытэт у стварэнні рускай дзяржавы і нацыі. Супрацьстаўленне насельніцтва поўдня і поўначы, Кіеўскай Русі і Уладзімірска-Суздальскай, а пазней Маскоўскай Русі, знаходзім у М. Кастамарава, С. Салаўёва, В. Ключэўскага, М. Грушэўскага. В. Ключэўскі, напрыклад, пісаў: «Везде русская земля, и нигде ни в одном памят-

Няшчасці вайны: войскі ўкраінскіх князёў рабуюць Менск і бяруць у палон ягоных жыхароў.
Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

нике не встретим выражения русский народ...» І яшчэ: «Русское государство (в IX—XI вв.) не было государством русского народа, потому что не существовало этого народа»[1]. Толькі на пачатку XX ст. А. Праснякоў выступіў супраць спробаў адарваць Маскоўскую Русь ад Кіеўскай, вялікарускую народнасць ад рускай. Праўда, для Праснякова паняцце адзінства рускай народнасці — гэта агульнасць вялікарускай і ўкраінскай галін рускага народу[2]. Увогуле вырашэнне праблемаў генезісу народаў, іх этнічнай прыналежнасці, стварэнне дзяржаваў на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў сярэднявеччы ў расейскай гістарычнай навуцы XIX — пачатку XX ст. зводзілася да дыскусіяў паміж «нарманістамі» і «антынарманістамі», што ў ідэалагічнай і палітычнай галінах праяўлялася ў супрацьстаянні «заходнікаў» са «славянафіламі».

У гістарыяграфіі XX ст. магчыма вылучыць толькі тры колькінебудзь закончаныя і ўплывовыя канцэпцыі, з якімі згаджаецца альбо ад якіх адштурхоўваецца бальшыня даследнікаў этнакультурнай гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы ў раннім сярэднявеччы (IX—XIII стст.). Гэтыя канцэпцыі належаць адпаведна ідэолагам, якія распрацавалі **марксісцка-сталінскую схему рускай гісторыі (нацыяналістычная);** гісторыкам, якія пабудавалі сваю тэорыю ў **рэчышчы ідэй еўразійцаў (імперыялістычная), і трэцяя — так званы «нарманізм» (еўрапейская).** Праўда, пры ўсіх адрозненнях ва ўмовах зараджэння і далейшага развіцця першыя дзве канцэпцыі надзіва падобныя і зыходзяцца ў асноўнай думцы — думцы аб імперскім размаху палітычных амбіцыяў славянскай Русі з першых момантаў існавання. Відаць, гэта тлумачыцца кампенсатарнай функцыяй адной і другой канцэпцыі, калі палітычныя ці эканамічныя няўдачы ў сучаснасці запаўняюцца гістарычнымі міфамі. У апошніх увага акцэнтуецца на прагрэсіўнасці, у катэгорыях гістарычнага матэрыялізму, імперскіх намераў старажытных славянаў (гэткая пазіцыя сталінскага нацыяналізму) альбо на самабытнасці гістарычнага шляху Заходняй Еўразіі, якая ўзнікла на скрыжаванні заходнееўрапейскіх, бізантыйскіх і азіяцкіх уплываў (гэткія ўяўленні еўразійцаў)[3].

Пра погляды еўразійцаў на старажытны перыяд гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы мяркуюць, у першую чаргу, па даследаваннях Георгія Вярнадскага і Льва Гумілёва[4]. Асаблівасці палітычнага й сацыяльнага развіцця Кіеўскай Русі, на іх думку, абумоўлены геаграфічным становішчам — прамежкавым паміж Еўропай і Азіяй, а таксама тым, што краіна знаходзілася ў чатырох шыротах: у тундры, лясной зоне, стэпе і пустыні, гэта «месторазвитие» паводле тэрміналогіі еўразійцаў. Аднак Русь, якая знаходзілася на скрыжаванні разнастайных уплываў, найбольш падпала пад уплывы Бізантыі й вандроўных народаў.

Вікінгі-варагі з ладдзёй. Гравюра.

Г. Вярнадскі ўсяляк падкрэсліваў перавагу цывілізацыі Бізантыйскай імперыі, у межах культурнай арбіты якой апынулася Кіеўская Русь, перад сучаснай ёй культурай лацінскага свету. Разам з тым, сярэдзіннае становішча Русі паміж Захадам і Усходам паставіла яе на першае месца ў транзітным гандлі з усходнімі краінамі. *«В определенном смысле,* — піша Г. Вярнадскі, — *Киевское княжество выросло на той же почве, что и все кочевые и полукочевые империи, которые контролировали по очереди территорию черноморских степей, начи-*

Полацкая зямля ў X–XII стст.

ная от скифского периода…». *«Первые киевские правители мечтали о создании широкой коммерческой империи, которая подхватит традиции гуннов и хазар и одновременно захватит накопленное Византией богатство»*[5]. Не адмаўляючы скандынаўскага паходжання рускай княскай дынастыі, а таксама перыядычнага наплыву новага скандынаўскага элементу на тэрыторыю Кіеўскай Русі, еўразійцы лічаць, што чужынцы хутка сталі непрыкметнымі ў славянскім асяродку. Для Г. Вярнадскага і Л. Гумілёва характэрна супрацьпастаўленне Кіеўскай Русі пры першых князях перыяду падзелу яе на асобныя самастойныя княствы, якую яны называюць эпохай аслаблення Заходняй Еўразіі. *«Удельный период — это перерыв в историческом евразийском самосознании русского народа»*[6]. Апошняе меркаванне — яшчэ адзін пункт, які аб'ядноўвае погляды еўразійцаў з прадстаўнікамі савецкай гістарычнай навукі.

Пытанне пра «старажытнарускую народнасць» заняло адно з цэнтральных месцаў у савецкай гістарыяграфіі. Праўда, доўгі час яе развіцця навуковае разуменне тэрміна «народнасць» адсутнічала. Нягледзячы на тое, што першыя гісторыкі-марксісты звярталіся да гэтага, але яны не ўкладалі ў яго таго навуковага сэнсу, які быў прыняты пазней і функцыянуе па сёння[7]. Больш таго, схема ўсходнееўрапейскай гісторыі перыяду сярэднявечча, якой першапачаткова яны прытрымліваліся, не вылучалася з агульнага рэчышча расейскай дарэвалюцыйнай гістарычнай навукі. Часцей за ўсё яны выкарыстоўвалі для вызначэння этнічных утварэнняў усходніх славянаў перыяду Кіеўскай Русі найменні «русский народ»,

«русские», «русские славяне», «славяне», «восточные славяне», «русское племя». А грамадства X ст. уяўлялася са старонак «Аповесці мінулых гадоў» некаторымі аўтарамі не як кансалідуючая ў этнічных адносінах супольнасць, а як дэзінтэграваная на шматлікія плямёны.

Радыкальныя змены надышлі ў 30-я гады XX ст., калі першапачатковыя ідэі сусветнай рэвалюцыі ўвайшлі ў супярэчнасць з рэальнай палітыкай Савецкай дзяржавы. Тады ўзнікла неабходнасць перагляду гістарычнай ролі дзяржавы, у тым ліку яе ролі ў вырашэнні нацыянальных праблемаў. Перагляд старажытнай гісторыі Русі адбываўся адпаведна з эвалюцыяй партыйнай дактрыны ад пераацэнкі грамадскага ладу да адкрытага нацыяналізму. Тады перад гісторыкамі была пастаўлена задача знайсці ў мінулым доказы таго, што *«союз нерушимый республик свободных сплотила навеки великая Русь»* (радкі савецкага гімну, які быў зацверджаны ў 1943 г.)[8].

Першым знакам змены генеральнага накірунку з'явіліся крытычныя заўвагі І. Сталіна, А. Жданава і С. Кірава на праект падручніка па гісторыі СССР у 1934 г. Дадзеныя заўвагі савецкімі гісторыкамі-навукоўцамі доўгі час вызначаліся як «значныя вехі ў развіцці марксісцкай гістарыяграфіі». Перанясенне партыйных дырэктываў у навуку азначала тое, што савецкім гісторыкам трэба было знайсці, а калі знайсці не магчыма, дык прыдумаць тыя рысы, якія дазволілі б падвесці сацыяльны лад Кіеўскай Русі пад паняцце феадальнай фармацыі. Ідэалагічная замова партыі была, зразумела, выканана: у выніку «дыскусіі» калегія гісторыкаў прыйшла да высновы, што кіеўскае грамадства было не «рабаўладальніцкім», а «феадальным». Замова партыі гэтым не абмежавалася, а нацыяналістычная тэндэнцыя выявіцца трохі пазней. Калі школа М. Пакроўскага асуджала каланіяльную палітыку Расейскай імперыі, лічыла яе «турмой народаў», дык ад сярэдзіны 30-х гадоў XX ст. каланізацыя разглядалася як адноснае дабро ў сувязі з цівілізатарскаю роллю Рускай (чытай Савецкай) дзяржавы. Карысць ад моцнай адзінай дзяржавы, на думку Б. Грэкава, была ўжо зразумелай народам і плямёнам, якія апынуліся пад уладай Кіева. У адпаведнасці з функцыямі дзяржавы, як іх вызначыў І. Сталін, гісторык сцвярджае, што гэтыя народы і плямёны быццам бы *«видели преимущества сильной государственной власти как для упрочения своей экономической и политической мощи, так и для отражения постоянной внешней опасности»*[9].

Вызначыўшы сацыяльны лад Кіеўскай Русі як феадальны, навука сталінскага часу аддзяліла Кіеў часоў Алега, Уладзіміра, Яраслава Мудрага ад больш позняга гістарычнага перыяду — перыяду феадальнай раздробленасці. Сімпатыі тагачасных лідэраў гістарычнай навукі, натуральна аддаваліся моцна ідэалізаванай эпосе вяршэнства Кіева: «Народные симпатии обращены к тому времени, когда Русская земля, собранная под властью первых киевских князей из восточнославянских племен и некоторых неславянских этнических элементов в одно политическое целое, действительно представляла силу, грозную для врагов и в то же время дававшую возможность развитию мирного народного труда, — залог дальнейшего будущего страны»[10]. *Цытата вельмі характэрная для разумення рэальнага зместу марксісцка-сталінскай схемы старажытнай гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы.*

Носьбітамі прагрэсіўнай тэндэнцыі выяўляюцца ўсходнеславянскія плямёны, прычым часта яны праз галаву ўсіх гістарычных перашкодаў проста называюцца рускімі. Менавіта рускі народ стаў стваральнікам адзінай Кіеўскай дзяржавы. Пры гэткай выснове цяжка застацца на пазіцыях па нарманскай праблематыцы, на якіх спынілася дарэвалюцыйная расейская гістарыяграфія, а тым больш прыгледзецца альбо прыслухацца да даследаванняў гісторыкаў з па-за межаў «сацыялістычнага лагеру». У выніку спрэчка з «нарманістамі» павярнулася ў тое прымітыўнае, ура-патрыятычнае рэчышча, у якім вёў яе ў сярэдзіне XVIII ст. М. Ламаносаў. У дыскусіях, калі іх можна так назваць, з заходнімі гісторыкамі выкарыстоўваўся традыцыйны набор цытататаў з класікаў марксізму-ленінізму, на падставе якога даказвалася, што з'яўленне дзяржавы ёсць вынік унутранага развіцця грамадства, а не прадукт знешніх уплываў, шырока выкарыстоўвалася метафорыка з вайсковае справы, аргументацыя ad personam і іншае[11]. Уся папярэдняя не вельмі магутная крытычная літаратура, у якой адлюстроўваліся сумневы наконт варажскай тэорыі, раптам робіцца генеральнай лініяй у савецкай гістарычнай навуцы. Гісторыкі пачынаюць актыўна адмаўляць ролю варагаў ва ўтварэнні дзяржавы Кіеўская Русь, пры гэтым сам факт іх пры-

знання і княжання, нават самога Рурыка і магчымасць скандынаўскага паходжання імя Русь. Жаданне прыменшыць скандынаўскія ўплывы было такое вялікае, што іншыя «даследнікі» засумняваліся нават у існаванні вядомага з летапісаў шляху «з варагаў у грэкі»[12].

Такім чынам, ваяўнічы антынарманізм надоўга стаў галоўным штандарам савецкай гістарычнай навукі, што дазваляла паспяхова задушыць нават слабыя спробы засумнявацца ў тых альбо іншых элементах новай тэорыі. А той, хто рызыкаваў і крытыкаваў які-небудзь элемент гэтай зграбнай схемы, аўтаматычна трапляў у шэраг памагатых сусветнага імперыялізму з усімі вынікаючымі наступствамі. На думку большасці сучасных расейскіх і ўкраінскіх гісторыкаў, апафеозам гэтага антынарманскага накірунку гістарычнай навукі было святкаванне 1500-годдзя Кіева. На жаль, канцэпцыя сярэднявечнай гісторыі Усходняй Еўропы, распрацаваная згодна дырэктывам партыі ў 1930—1940-я гады, сталася надзіва жыццястойкай. Яе не пахіснулі ні выкрыцці культу асобы, ні хваляванні часоў «перабудовы», яна праіснавала да нашых дзён і пануе надалей[13].

Калі паглядзець на сітуацыю ў беларускай гістарычнай навуцы, дык трэба канстатаваць, што да сённяшняга дня развіваецца і прапагандуецца пераважна адна канцэпцыя ў вывучэнні сярэднявечнай гісторыі — марксісцка-ленінская, створаная і замацаваная ў навуцы і адукацыі ў 30-я гады XX ст. Барысам Грэкавым і ягонымі прыхільнікамі. Спрошчаная сутнасць яе ў тым, што нібыта на тэрыторыі Усходняй Еўропы ўжо ў IX ст. склаўся феадальны

Цэнтральная частка трыпціха П.Корына «Аляксандр Неўскі» (1942–1943) – узор прапагандысцкага патрыятычнага мастацтва з рэмінісцэнцыямі да старажытнарускіх часоў, да якіх звярнуліся ў СССР падчас Другое сусветнае вайны.

спосаб вытворчасці, гэта прывяло да ранняга падзелу грамадства на два класы — эксплуататараў (князі, баяры, царква, багатае купецтва) і эксплуатаваных (пераважна прыгонныя сяляне і залежныя рамеснікі), да ўтварэння дзяржавы эксплуататараў Кіеўскай Русі (пазней яе назвалі «Старажытнай Руссю») з монаэтнічным «старажытнарускім народам», у якой назіраецца перманентная класавая барацьба прыгонных сялянаў у лучнасці з бяднейшай часткай гараджанаў супраць сваіх эксплуататараў. Замацаванне грэкаўскай канцэпцыі адбывалася не толькі шляхам акадэмічных дыскусіяў, але таксама палітычным і фізічным знішчэннем апанентаў. Яно было падмацаваннем гістарычнай навукай тагачаснай палітычнай і ідэалагічнай сітуацыі, створанай Іосіфам Сталіным з хаўрусамі[14].

У 30-я гады XX ст. канцэпцыя Барыса Грэкава была перанесена на сярэднявечную гісторыю беларусаў і ўкраінцаў як партыйныя і палітычныя рэкамендацыі па інтэрпрэтацыі мінуўшчыны. У Беларусі гэтыя рэкамендацыі паспяхова выконваліся да сярэдзіны 30-х гадоў. У 1934 г. пабачылі свет дзве кнігі акадэміка В. Шчарбакова: ***«Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. I.» і «Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі (гістарыяграфічныя нарысы)»;*** у 1938 г. калектыўны артыкул пад рэдакцыяй акад. Н. Нікольскага ***«Проблемы древней истории Белоруссии»,*** надрукаваны ў часопісе ***«Вестник древней истории», № 1;*** у 1941 г. падрыхтаваны ***«Нарысы па гісторыі Беларусі»*** пад кіраўніцтвам Ул. Пічэты. Названыя «творы» зафіксавалі ідэалагічную перамогу вульгарнага марксізму (бальшавізму) у гістарычнай навуцы савецкай Беларусі. Гэтая перамога была замацавана таксама фізічным знішчэннем апанентаў (самазабойства Ус. Ігнатоўскага, рэпрэсаваны В. Ластоўскі і інш.) і нават аднадумцаў (рэпрэсіі супраць Ул. Пічэты, А. Ляўданскага і інш.).

Аўтары названых вышэй «нарысаў» і «калектыўнага артыкула» сфармулявалі, так бы мовіць, «беларускую візію» гістарычнага працэсу на беларускіх землях у сярэднявечны перыяд. Квінтэсэнцыяй яе ёсць пастулаты: 1) аб вечным адзінстве беларускага народу з расейскім, якія разам з украінцамі стварылі «старажытнарускую народнасць» з агульным лёсам і

мэтамі барацьбы супраць эксплуататараў і іншаземных захопнікаў; 2) аб прыгнечанасці простага насельніцтва Беларусі, якое разам з рускім народам ужо ў сярэднявеччы свядома змагалася супраць эксплуататараў за «светлую будучыню», 3) а заваяванне беларусамі дзяржаўнасці з'яўляецца вынікам Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. І далей усё, як у Б. Грэкава. Пад чуйным кіраўніцтвам КПБ дадзеная гістарычная канцэпцыя была развітая ў працах Л. Абэцэдарскага, а сёння замацавана ў манаграфіях і вучэбнай літаратуры аўтарства Я. Новіка і Г. Марцуля, Э. Загарульскага, В. Бандарчыка, П. Лысенкі, І. Коўкеля і Э. Ярмусіка[15].

Першым пытанне пра старажытнарускую народнасць у этнічным, палітычным і дэфініцыйным сэнсе ў межах марксісцка-ленінска-сталінскай метадалогіі сярод савецкіх гісторыкаў паставіў В. Маўродзін у сваіх працах «Образование древнерусского государства» (*Л., 1945*), «Древняя Русь» (*Л., 1946*). Ён лічыў, што грамадскае развіццё, вынікам якога было стварэнне Старажытнарускай дзяржавы, мела вялікае значэнне ў фармаванні старажытнарускай народнасці. Кіеўская дзяржава палітычна аб'яднала ўсходнеславянскія, рускія плямёны, звязала іх агульнасцю палітычнага жыцця, культуры, рэлігіі, агульнай барацьбы са знешнімі ворагамі і агульнымі інтарэсамі на міжнароднай арэне, гістарычнымі традыцыямі, спрыяла з'яўленню і ўмацаванню паняцця адзінства Русі і рускіх. У аснове названага працэсу ляжала не толькі агульнасць паходжання ўсходніх славянаў і іхнага побыту, але і адзінства гістарычна складзеных формаў грамадска-палітычнага, дзяржаўнага жыцця, адзінства культуры і рэлігіі, агульнасць традыцыяў, дзяржаўных межаў і інтарэсаў, таму пра рускіх IX—XI стст. Маўродзін кажа як пра адзіную народнасць, этнічную агульнасць, наступную за плямёнамі і звязамі плямёнаў. У гэтых працах ён услед за Грэкавым і Дзяржавіным карыстаецца тэрмінам «рускі народ», пры гэтым паняцце «народ» ён выкарыстоўвае не ў сацыяльным сэнсе (працоўныя масы), а ў якасці этнічнай катэгорыі.

У 1950 г. у «Вопросах истории» № 4 В. Маўродзін надрукаваў артыкул «Основные этапы этнического развития русского народа», дзе ставіць пытанне пра навуковае разуменне тэрміна «рускі народ». Ён піша: *«Зачастую термин русский народ употребляется для обозначения и русских времен Олега, Игоря и русских наших дней. Это неверно»*. Каб пазбавіцца змешвання паняццяў «народнасць» у дачыненні да вялікароскай, украінскай і беларускай народнасцяў XIV—XVI стст. і народнасці рускай IX—XI стст. Маўродзін прапануе *«признать правомерным вслед за термином древнерусский язык, древнерусская литература, древнерусское искусство и термин древнерусская народность»*[16]. Ні больш ні менш, ні навуковых абгрунтаванняў, ні пацверджанняў крыніцаў, проста як на партыйным сходзе. Для савецкіх даследнікаў нават найбольш складаныя гістарычныя працэсы і з'явы вырашаліся вельмі простым чынам — прапанавана прызнаць, і прызналі. Да таго, у той час з'явілася праца «вялікага гісторыка, філолага і філосафа» Іосіфа Сталіна «Марксизм и вопросы языкознания», якая зрабіла вялікі ўплыў на пастаноўку праблемы і вывучэнне старажытнарускай народнасці сярод савецкіх даследнікаў. Адразу пасля яе з'яўлення былі надрукаваны артыкулы Б.Рыбакова, А. Насонава, М. Ціхамірава, А. Казачэнкі й іншых[17], у якіх толькі канкрэтызаваліся разнастайныя пытанні (храналогія ўзнікнення, лакалізацыя, лёсы) гісторыі ста-



Мапа скандынаўскіх знаходак у Беларусі паводле Ф. Гурэвіч.

ражытнарускй народнасці, акрэсленыя ў творах У. Маўродзіна. У 60—90-я гады XX ст. у савецкай гістарычнай навуцы не змяніліся метадалагічныя падыходы да праблемаў этнічнай гісторыі народаў Усходняй Еўропы ў сярэднявеччы, таму факт існавання «старажытнарускай народнасці» надалей агульнапрыняты[18] і надалей прызнаецца факт існавання адзінай стражытнарускай народнасці ў X—XII стст. і таму без сумневу выкарыстоўваецца тэрмін «старажытнаруская народнасць».

Дасягненнем савецкай гістарыяграфіі лічыцца дынамічны падыход да старажытнарускай народнасці як этнічнай супольнасці, якая перажывае працэс развіцця. Вызначана роля неславянскіх этнічных элементаў (балтаў, фіна-уграў, цюркскіх і іранскіх) у фармаванні гэтай народнасці. У навуковай літаратуры (савецкай, расейскай, беларускай, украінскай) склаўся погляд на старажытнарускую народнасць як этнічную супольнасць з агульнай мовай, якая захоўвае мясцовыя дыялекты. Для старажытнарускай народнасці характэрна агульнасць тэрыторыі, якая супадае з палітычнай агульнасцю ў форме Старажытнарускай дзяржавы, што аб'яднала ўсё ўсходняе славянства (праўда, у яе склад уваходзілі і іншыя этнічныя супольнасці. — **Г. С.**). Прызнаецца таксама эканамічная агульнасць, адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры, рэлігіі (праваслаўнай), своеасаблівай універсальнай усёабдымнай тагачаснай ідэалогіі, аднолькавыя традыцыі, звычаі, норавы, звычайнае права, закон і суд, вайсковая арганізацыя спрыялі кансалідацыі усходніх славянаў у адзіную народнасць. Агульнасць інтарэсаў у барацьбе за незалежнасць Русі мела вялікае значэнне ў гэтым працэсе. Усе савецкія даследнікі ўдзяляюць значную ўвагу нацыянальнай свядомасці адзінства Русі, самапазнанню і пачуццю патрыятызму. Нарэшце, на іхную думку, бясспрэчны факт, што старажытнаруская народнасць ёсць агульным продкам трох пазнейшых славянскіх народнасцяў — рускіх, украінцаў і беларусаў.

Было б махлярствам гаварыць, што сярод савецкіх навукоўцаў панавала сталае адзінства па праблемах старажытнарускай народнасці. Па-за генеральнай канцэпцыяй этнічнай гісторыі Усходняй Еўропы ў раннім сярэднявеччы, створанай Грэкавым, Рыбаковым, Маўродзіным і іх вучнямі, аспрэчваць якую не дазваляецца як з палітычных, гэтак і навуковых пазіцыяў, існуюць даволі сур'ёзныя разыходжанні сярод даследнікаў па шэрагу пытанняў: а) пачатак фармавання старажытнарускай народнасці; б) адпаведна, канец яе існавання і прычыны знікнення такой вялікай этнічнай супольнасці; в) роля і месца варагаў у фармаванні Кіеўскай Русі і старажытнарускай народнасці; г) роля і месца балтаў, фіна-уграў, цюркскіх і іранскіх народаў у этнічных працэсах на тэрыторыі Усходняй Еўропы; д) узаемасувязь працэсаў класаўтварэння і фармаванне старажытнарускай народнасці; е) паходжанне самой назвы «Русь» і яе значэнне. Больш таго, дапускаецца дылема: з аднаго боку, «старажытнаруская народнасць» не ўяўляла сабою ўстойлівай этнічнай супольнасці і яе развал вызначыўся дзяржаўным распадам Кіеўскай Русі; з іншага боку, «старажытнаруская народнасць» была ўстойлівай этнічнай агульнасцю і значна перажыла Кіеўскую Русь.

Ёсць яшчэ трэці погляд на праблему старажытнарускай народнасці ў межах савецкай марксісцкай гістарыяграфіі — яна ўвогуле не існавала. Гэтая з'ява паводле трапнага вызначэння беларускага даследніка праф. Г. Штыхава «прыдуманая вучонымі...». Адным з першых з падобных пазіцыяў сярод савецкіх навукоўцаў выступіў сучасны ўкраінскі гісторык М. Брайчэўскі ў працы «Паходжанне Русі» (*Кіеў, 1968*). На ягоную думку, Русь уяўляла этнічную агульнасць не абсалютную, а адносную. Без уліку гэтых абставінаў цяжка зразумець сам факт падзелу ўсходніх славянаў на тры народы, таму формула «старажытнаруская народнасць — агульны продак рускага, украінскага і беларускага народаў» няўдалая і непрымальная. У працэсе фармавання так званай старажытнарускай народнасці моўныя і этнаграфічныя асаблівасці ўсходнеславянскіх плямёнаў не зніклі, таму Русь — гэта этап этнічнай гісторыі ўсходняга славянства, калі пляменнае дзяленне ў асноўным было пераадолена, а новая структура, у якой узнікалі тры народы, яшчэ не набыла закончанага характару. Менавіта трэці пункт гледжання набывае ўсё больш аргументаў (і папулярнасці) сярод украінскіх і беларускіх даследнікаў[19]. У 1996 г. на VI Міжнародным кангрэсе славянскай археалогіі, які праходзіў у Вялікім Ноўгарадзе, у сваім дакладзе прафесар Штыхаў зрабіў выснову: *«Версія пра тое, што старажытнаруская народнасць не сфармавалася канчаткова ў сувязі з распадам старажытнарускай дзяржавы, больш рэальная і праў-*

дападобная, чым альтэрнатыва, заснаваная на міфічным уяўленні існавання адзінай народнасці, паколькі ўмоваў для гэтага відавочна не хапала. Працэс узнікнення роднасных усходнеславянскіх народаў — беларускага, украінскага і рускага (вялікарускага) — можна разглядаць без выкарыстання гэтага спрэчнага паняцця»[20].

Аднак найбольш паслядоўна і аўтарытэтна ў мінулым стагоддзі супраць палітызаванага погляду на гісторыю насельніцтва Усходняй Еўропы ў раннім сярэднявеччы, супраць «нацыяналістычнага» разумення «дзяржавы Русь» як дзяржавы ўсходніх славянаў, якія стварылі этнічную супольнасць «старажытнарускую народнасць», выступаў польскі медыявіст Генрых Пашкевіч. Менавіта ў ягонай фундаментальнай трылогіі: The Origin of Russia (*London, 1954*), The Making of the Russian Nation (*London,1963*) і The Rise of Moscow's Power (*New York, 1983*), найбольш выразна сфармулявана «нарманісцкая» канцэпцыя ўсходнееўрапейскай гісторыі ў IX—XIII стст. Утварэнне дзяржавы «Русь» на тэрыторыі Усходняй Еўропы, на думку Г. Пашкевіча, з'явілася вынікам заваявання аўтахтоннага славянскага, часткова фіна-угорскага і балцкага народаў нарманамі, насуперак жаданням і супраціву мясцовых народаў. Пры гэтым аўтар падкрэслівае, што крыніцы не паведамляюць нам пра культурную і гаспадарчую перавагу нарманаў над славянскімі народамі. Праўда, ён адмаўляе (і слушна) хуткую славянізацыю захопнікаў, лічачы, што яшчэ ў XI ст. нарманы, найперш Рурыкавічы, адрознівалі сябе ад славянаў у этнічным сэнсе. Гэта была адна з прычынаў слабых сувязяў прадстаўнікоў княжацкай дынастыі з захопленымі тэрыторыямі і з падпарадкаваным аўтахтонным насельніцтвам. Больш таго, Г. Пашкевіч лічыць, што ў час з'яўлення нарманаў на вялізных прасторах Усходняй Еўропы не існавала «рускай» (у сэнсе ўсходнеславянскай нацыі), таму што не існавала ні тэрытарыяльных, ні гаспадарчых, ні палітычных, ні моўных, ні культурных сувязяў паміж славянскімі плямёнамі, якія б абумовілі складванне дадзенага этнасу. Адсюль даследнік робіць абгрунтаваную выснову — тэрытарыяльна-палітычнае ўтварэнне «Русь», створанае на тэрыторыі Усходняй Еўропы нарманамі, уяўляла сабой штучны і нетрывалы кангламерат плямёнаў і народаў.

Другі важны тэзіс, які вылучаў Г. Пашкевіча сярод іншых заходнееўрапейскіх гісторыкаў, гэта адмаўленне ім пошукаў кораня слова «Русь» сярод скандынаўскіх моваў. Ён лічыў, што этымалагічныя высновы, якія датычацца тэрміна «Русь», не прыводзяць да канчатковага вытлумачэння, хто першым назваў скандынаваў рускім імем — фіны, славяне ці грэкі. Даследнікі ў гэтым пытанні могуць толькі круціцца ў сферы гіпотэз. «Сучасная навука ўсё больш схіляецца да высновы, што русы — гэта не этнонім, а паняцце геаграфічнае і культурна-рэлігійны тэрмін (*Г. Пашкевіч, Я. Ярцо, О. Прытцак*)[21]. Дарэчы, тэза пра рэлігійнае значэнне назваў «Русь, рускі» і ролі працэсу хрысціянізацыі ў пашырэнні гэтых назваў з Кіева на ўсю ўсходнеславянскую прастору ўпершыню была пастаўлена Вацлавам Ластоўскім[22], на што звярнуў увагу ў другой сваёй кніжцы *«The Making of the Russian Nation»* Генрых Пашкевіч. Іншыя замест этнічнага бачаць у «русах» сацыяльны тэрмін, якім абазначалі альбо актыўных і бессаромных гандляроў, паляўнічых за ўсходнім срэбрам (*С. Франклін і Дж. Шэпард*)[23], альбо княжацкую дружыну (*І. Данілеўскі, Ул. Пятрухін*)[24]. Адсутнасць у слове канкрэтнага этнічнага сэнсу спрыяла пазнейшаму пераўтварэнню яго з геаграфічнага, рэлігійнага і сацыяльнага паняцця ў этнапалітычны тэрмін, калі Руссю пачалі называць Рускую дзяржаву.

У свеце ўсходнеславянскіх, лацінскіх, грэцкіх і арабскіх крыніцаў Г. Пашкевіч вызначыў этнічна скандынаўскае, палітычна кіеўскае і рэлігійна бізантыйскае значэнне паняцця «Русь». Галоўнай тэзай канцэпцыі было атаясамліванне паняцця «Русь» з бізантыйскай царкоўнай правінцыяй славянскага абраду. Яго арыгінальны пункт гледжання на Русь як на шматэтнічную супольнасць, якая з'явілася ў выніку першапачатковай дамінацыі нарманаў і хрысціянізацыі ўсходнееўрапейскіх народаў у бізантыйска-славянскім абрадзе, аказаўся плённым, і, нарэшце, пасля доўгіх гадоў замоўчвання займае сваё месца ў сучаснай еўрапейскай гістарыяграфіі праблемаў сярэднявечнай Русі[25]. Нават сучасная расейская гістарыяграфія ў апошнія дзесяцігоддзі, пазбавіўшыся «апякунства і кантролю» з боку разнастайных навуковых і ідэалагічных аддзелаў, ачысцілася ад «антынарманізму». Апошні ніколі не з'яўляўся навуковым накірункам альбо канцэпцыяй, а быў заўсёды ідэалагічна-палітычнай рэальнасцю, неабходнай для ідэйнай барацьбы з Захадам — і ў часы М. Ламаносава, і ў часы І. Сталіна і Л. Брэжнева, і

часам у сённяшні дзень. Таму працы вядомых расейскіх археолагаў і гісторыкаў, прысвечаныя раннесярэднявечнаму перыяду гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы і пазбаўленыя па-за навуковага смецця — Н. Носава, І. Данілеўскага, Ул. Пятрухіна, Ф. Успенскага, Т. Джаксан, С. Бялецкага і іншых, займаюць вядучае месца ў медыявістыцы і шмат у чым вызначаюць будучыя накірункі навуковых даследаванняў па этнакультурных пытаннях.

Падсумоўваючы, можна дазволіць невялікую выснову. Ведаючы гісторыю з'яўлення і збольшага змест кожнай з трох канцэпцыяў сярэднявечнай гісторыі Усходняй Еўропы, аўтар лічыць, што найбольш магчымасцяў у канструяванні этнакультурнай мінуўшчыны беларусаў, украінцаў і расейцаў дае «нарманская» канцэпцыя ў адрозненне ад нацыяналістычнай марксісцкай і імперыялістычнай еўразійскай. Напрыканцы ёсць жаданне схематычна падаць уласны погляд на праблемы этнічнай гісторыі беларускага народу ў сярэднявеччы (VI—XIV стст.).

ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У IX—XIII СТСТ.

Як сцвярджае ўкраінскі даследнік Рыгор Піўтарак, паўстанне асобных усходнеславянскіх народаў адбывалася не ў выніку падзелу г. зв. «старажытнарускай народнасці» на тры часткі, а спосабам кансалідацыі некалькіх суседніх блізкаэтнічных славянскіх груповак у кампактныя культурна-этнаграфічныя масы, якія ў выніку цеснай інтэграцыі ўтварылі ўкраінскі, беларускі й расейскі народы. Гэты працэс быў аб'ектыўны і не паўстаў у выніку феадальнай раздробленасці ў XI—XIII стст., як лічыць бальшыня навукоўцаў, а толькі стымуляваны ёю. Паўстанне беларускага народу непасрэдна звязана з славянскай каланізацыяй сённяшняй тэрыторыі Беларусі, якая пачалася, паводле археалагічных звестак, не раней чым у VI—VII стст., таму сцвярджэнне, што Кіеўская Русь была калыскай трох усходнеславянскіх народаў не мае пад сабой рэальных навуковых падставаў[26].



Баявы скандынаўскі шлем.

Важнае значэнне для этнагенэзу ўсходнеславянскіх народаў увогуле і для фармавання беларускага народу і ягонай мовы ў прыватнасці меў той факт, што славяне рассяліліся на абшарах Усходняй Еўропы сярод мясцовага насельніцтва. Картаграфія старажытных археалагічных помнікаў сведчыць, што геаграфічны арэал балцкіх паселішчаў ва Ўсходняй Еўропе папярэднічаў славянам на тэрыторыі сучаснай Беларусі (уся сучасная паўночная і цэнтральная Расея на той час была заселена фіна-угорскімі плямёнамі). Менавіта гэта садзейнічала таму, што балцкі субстрат стаўся стрыжнем у будучым стварэнні тутэйшых этнічных папуляцыяў, што выразна адлюстравалася ў тапаніміцы і антрапалагічным вобліку насельніцтва. Асіміляцыя славянаў і балтаў была двухбаковай, але пераважала славянства. У розных мясцовасцях цяжка было адрозніць славянаў ад балтаў. З паўстаннем у IX—X стст. сталых умацаваных паселішчаў з адміністрацыйнымі функцыямі (Полацк, Віцебск, Менск, Тураў) славянізацыя тутэйшых людзей у большасці раёнаў Беларусі ўзмацнілася. У выніку славяна-балцкай інтэграцыі ў сучаснай Беларусі, у басейне Дняпра, Заходняй Дзвіны, Прыпяці, сфармаваліся новыя этнічныя супольнасці, якія ў гістарычных крыніцах называюцца дрыгавічамі, радзімічамі, полацкімі і смаленскімі крывічамі. У культуры і мове гэтых народаў змяшаліся славянскія і балцкія элементы. Гэта былі ўжо этнічныя групы новай якасці, у якіх пераважалі славянскія рысы[27].

Паўстанне сучасных усходнеславянскіх моваў было шчыльна злучана з гісторыяй адпаведных хаўрусаў плямёнаў. Яны ў раннім сярэднявеччы характарызуюцца пэўнымі этнічнымі, культурнымі і дыялектычнымі асаблівасцямі, якіх яны не згубілі, калі знаходзіліся ў складзе Кіеўскай Русі, таму што поўнага аб'яднання плямёнаў у г. зв. «старажытнарускую народнасць» не адбылося. З гэтага гледзішча на тэрыторыі Беларусі ў IX—X стст. вылучыліся аднолькавыя па паходжанні дзве вялікія этнапляменныя групы. Адна — паўднёва-заходняя — цягнулася да Палесся і была звязана з нашчадкамі дрыгавічоў, радзімічаў, драўлянаў і валынянаў, другая — паўночна-ўсходняя — ахоплівала крывіцкі звяз плямёнаў[28].

Важна вызначыць, чым было племя ў перыяд паўстання першых дзяржаваў на тэрыторыі Усходняй Еўропы (і нават Цэнтральнай і Заходняй). Рэйнард Вэнскус і Бэнэдыкт Зентара пераканаўча абгрунтавалі думку, што плямёны былі палітычнымі арганізмамі, якія складаліся з разнародных і зменлівых элементаў, згрупаваных вакол роду, які захоўваў свядомасць і пляменную традыцыю. Гэтая свядомасць складалася з веры ў супольнае паходжанне, культу гераічнага мінулага, пляменнай рэлігіі, звычаёвага права, часам убрання і звычаяў[29]. Яшчэ далей пайшоў Пётр Борань: *«...пляменная рэчаіснасць не трактуецца як лад, але як грамадства. Племя разумеецца як свайго роду ідэнтыфікацыйная супольнасць, характэрная для грамадства, у якім сувязі не маюць інстытуцыянальнага паходжання, а ствараюцца на працягу існавання супольнасці і маюць перад усім характар свядомасны. Аналіз дадзеных крыніцаў схіляе да прызнання з'явы акрэсленай назвай «племя» за грамадскую катэгорыю (з непарыўнымі традыцыйнымі сувязямі, якія злучаюць групу людзей), а не за лад, супрацьпастаўленне дзяржаве. Такое паняцце «племя» больш блізкае да паняцця народу ці народнасці, таксама як структураў, кшталтаваных свядомаснымі чыннікамі. Племя, як і народ, існуе незалежна ад улады, якая для дзяржавы ёсць элементам канстытуцыйнным»*[30].

Усходнеславянскія летапісы ўзгадваюць 14—15 этнічных групаў з тэрыторыі Усходняй Еўропы: паляне, драўляне, севяране, дрыгавічы, радзімічы, вяцічы, улічы, ціверцы, харваты, валыняне, бужане, дулебы, крывічы, палачане. Драўляне апошні раз узгадваюцца ў 1136 г., крывічы існуюць да 1162 г., дрыгавічы — да 1149 г., радзімічы — да 1169 г., вяцічы — да 1197 г. Нават назва паляне, якая, на думку бальшыні даследнікаў, знікае пасля 944 г., пры глыбейшым прачытанні летапісаў ужывалася да часоў Нестара, магчымага аўтара «Аповесці мінулых гадоў». Пішучы пра Кія, заснавальніка Кіева і ягоных братах, Нестар адзначае *«бяху мужи мудри и смыслени, нарицахуся поляне, от них же есть поляне в Киеве и до сего дня»*. Такі зварот *«и ныне»* сустракаем у Нестара ў выпадку апісання розных звычаяў у розных усходнеславянскіх плямёнаў[31]. Генрых Пашкевіч лічыў, што пляменная тэрміналогія функцыянавала на тэрыторыі Кіеўскай Русі яшчэ доўга пасля Нестара і ёсць сведчаннем пэўнай этнічнай і культурнай незалежнасці. Інфармацыю аб плямёнах ва ўступе да «Аповесці...» можна аднесці да XI — пачатку XII ст., калі Нестар пісаў свой твор[32]. Апошняе меркаванне пацвярджаюць шматлікія археалагічныя звесткі[33].

Лінгвісты лічаць, што перад заснаваннем Кіева і ў часы Кіеўскай Русі на ейнай тэрыторыі існавалі галоўныя дыялекты, якія па сутнасці былі асобнымі мовамі — галіцкай, карпацкай, палескай, крывіцкай, славенскай і дыялектны кангламерат верхняга басейна Волгі і сярэдняга Акі. Больш таго, ніводная з дзвюх літаратурных моваў у Кіеўскай Русі не кансалідавала жыхароў, паколькі абедзве (як царкоўнаславянская, так і старажытнаруская) мелі мала агульнага з народна-размоўнай мовай ва ўсіх дыялектных арэалах. Варта зацеміць, што гэтымі літаратурнымі мовамі простыя людзі не гаварылі. Гэта была прэрагатыва нешматлікіх адукаваных людзей, якія да ўсіх жыхароў складалі малы працэнт. Прычына таго — факт, што ў сярэднявеччы мовай адукацыі ў Кіеўскай Русі была царкоўнаславянская, а хрысціянства ў XI—XIII стст. не было яшчэ агульнай рэлігіяй сельскага насельніцтва, якое дамінавала. Хрысціянства доўгі час не было галоўным чыннікам кансалідацыі, паколькі яшчэ не ўкаранілася на вёсцы ў дамангольскі перыяд[34].

Найлепшым аргументам супраць існавання адзінай старажытнарускай мовы з'яўляецца мова берасцяных граматаў. Выдатны мовазнаўца, спецыяліст па берасцяных граматах прафесар А. Залізняк пасля дакладнага і грунтоўнага аналізу мовы берасцяных граматаў прыходзіць да высновы: старажытнанаўгародскі дыялект ёсць асобным славянскім дыялектам, паўстанне яго асаблівасцяў адбылося ў праславянскую эпоху. Больш таго, А. Залізняк адзначае: *«Калі б існавала незалежная старажытнанаўгародская дзяржава надалей, гэты працэс моўнай кансалідацыі заходніх (старажытнапскоўскі — паўночнакрывіцкі) і ўсходніх (ільменьска-славенскіх) дыялектаў мусіў прывесці да фармавання асобнай усходнеславянскай мовы, падобнай да беларускай і ўкраінскай. Такім чынам, з гістарычна-лінгвістычнага пункту гледжання ў XI—XV стст. сукупнасць мясцовых ідэомаў Наўгародскай зямлі стварала некалькі дыялектаў, развіццё якіх у асобную мову было перарванае пасля страты незалежнасці Ноўгарада Вялікага і далучэння Наўгародскай зямлі да Маскоўскай дзяржавы»*[35].

Услед за С. Токаравым і С. Арцюнавым варта адзначыць адну

з уласцівасцяў феадальных сярэднявечных народнасцяў. У адрозненне ад класічных антычных нявольніцкіх «дэмасаў», дзе рабы былі чужаземцамі, феадальная народнасць стваралася з аўтахтоннага сельскага жыхарства. Уласна яна несла ў сабе галоўныя этнічныя рысы, этнічную свядомасць, этнічную спецыфіку. Этнічная культура раннефеадальных народнасцяў — гэта перадусім народная культура. Вышэйшы феадальны слой у значнай меры быў дээтнізаваны і касмапалітычны, таму мовай вярхушкі доўгі час былі не народныя дыялекты, але незразумелыя насельніцтву мёртвыя мовы: у Заходняй Еўропе лаціна, ва Усходняй Еўропе і на Балканах царкоўнаславянская, у Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі санскрыт[36].

У перыяд феадальнай раздробленасці на тэрыторыі Усходняй Еўропы (сярэдзіна XII — сярэдзіна XIII ст.) новыя незалежныя княствы аб'ядноўваліся ў асобныя групы, у якіх складваліся эканамічныя, палітычныя, вайсковыя і культурныя дачыненні. Такія групы стваралі: 1) Наўгародская і Пскоўская землі; 2) Уладзіміра-Суздальскае, Разанскае, Мурамскае княствы; 3) Кіеўскае, Чарнігаўскае, Северскае, Пераяслаўскае княствы; 4) Галіцкае і Валынскае; 5) Полацкае, Смаленскае, Тураўскае княствы і дробныя Наднёманскія княствы[37]. У гэтых групах можна заўважыць не толькі контуры папярэдніх незалежных этнічна-моўных рэгіёнаў, але і будучых усходнеславянскіх народаў. Для этнагенэзу беларусаў мае значэнне пятая група княстваў. Кансалідацыйныя працэсы сярод гэтай групы княстваў адлюстроўваюць палітычныя і гандлёвыя сувязі пачатку XIII ст. паміж Полацкам, Смаленскам і Віцебскам, з аднаго боку, Рыгай, Ганзай і Готландам — з іншага. Мовазнаўцы ў тэкстах так званай Смаленскай граматы 1229 г. і шэрагу полацкіх граматаў другой паловы XIII ст. заўважаюць, што побач з агульнымі ўсходнеславянскімі (і царкоўнаславянскімі) моўнымі асаблівасцямі адзначаюцца з'явы, якія сведчаць аб фармаванні беларускай мовы — «аканне» і «яканне», «дзеканне» і «цэканне», зацвярдзенне «ш», «шч» і «р», фрыкатыўны гук «г», змена «л» на «ў» у пэўных пазіцыях, прыстаўныя зычныя й іншыя рысы[38].

Наступным значным крокам, які прыспешыў этнічную і культурную кансалідацыю жыхароў розных рэгіёнаў сучаснай Беларусі, было стварэнне ў сярэдзіне XIII ст. на тэрыторыі беларускага Панямоння поліэтнічнай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага. У гэтую дзяржаву на працягу першых ста гадоў існавання ўвайшлі ўсе этнічна беларускія ў сучасным сэнсе землі. Але этнічная гісторыя жыхароў ВКЛ — гэта ўжо асобная тэма.

ЗАЎВАГІ

[1] Ключевский В. Сочинения. Т. 1. Курс русской истории. Ч. 1. — М., 1956. — С. 163, 205.

[2] Пресняков А. Лекции по русской истории: В 2-х томах. Т. 1. Киевская Русь. — М., 1938. — С. 10; перавыданне — М., 1993 г.

[3] Буланин Д. Начало Руси и начальная история Русов (заметки к русскому переводу) // Саймон Франклин, Джонатан Шепард. Начало Руси 750—1200. — СПб., 2000. — С. 603—610.

[4] Вернадский Г. Начертание русской истории. Прага, 1927; ён жа. Древняя Русь. Тверь, М., 1996; ён жа. Киевская Русь. Тверь, М., 1996; Гумилёв Л. Древняя Русь и Великая Степь. М., 1992; ён жа. От Руси к России. Очерки этнической истории. М., 1992.

[5] Вернадский Г. Киевская Русь. С. 27—56, 187.

[6] Вернадский Г. Начертание русской истории. С. 19—20.

[7] Рожков Н. Русская история в сравнительно-историческом освещении, Т. 1, Пг., 1919; Шахматов А. Древнейшие судьбы русского племени, Пг., 1919; Пархоменко В. У истоков русской государственности, Л., 1925; Покровский М. Очерк истории русской культуры. Ч. 1. М.-Л., 1925; Греков Б. Киевская Русь, М., Л., 1939.

[8] Буланин Д. Начало Руси и начальная история Русов (заметки к русскому переводу). С. 604. Аб павароце да нацыяналізму ў савецкай навуцы гл.: Верт Н. История Советского государства: 1900—1991. — М., 1995. — С. 261—264.

[9] Греков Б. Киевская Русь. — М., 1953. — С. 456. (Ср. Сталин И. Вопросы ленинизма. — М., 1953. — С. 644).

[10] Греков Б. Киевская Русь. С. 9.

[11] Мавродин В. Борьба с норманизмом в русской исторической науке. Л., 1949; Шаскольский И. Норманская теория в современной буржуазной науке. М., Л., 1965; Шушарин В. Современная буржуазная историография Древней Руси. М., 1964. (Аб адзінстве сцвярджэнняў у дыскусіі з «нарманістамі» ад М. Ламаносава да сучасных расійскіх гісторыкаў гл.: Петрухин В., Раевский Д. Очерки истории народов России в древности и раннем средневековье. — М., 1998. — С. 255—258; Носов Е. Современные археологические данные по варяжской проблеме на фоне традиций русской историографии // Раннесредневековые древности Северной Руси и ее соседей. СПб., 1999. С. 151—163.)

[12] Бернштейн-Коган С. Путь из варяг в греки // Вопросы географии. Сб. 20: Историческая география СССР. 1950. С. 239—270.

[13] Загарульскі Э. Заходняя Русь IX—XIII стст. Мн., 1996; Седов В. Древнерусская народность. М., 1999.

[14] Фраянаў И. Киевская Русь. Очерки отечественной историографии. — Л., 1990. — С. 231—246; 254—271.

[15] Абэцэдарскі Л. У святле неабвержных фактаў. Мн., 1969; Ковкель И., Ярмусик Э. История Беларуси с древнейших времён до XX в. Мн., 1998; Загарульскі Э. Заходняя Русь IX—XIII стст. Мн., 1998; Гісторыя Беларусі. У 2-х частках. / пад рэд. Праф. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Мн., 1999. Частка 1. — Ад старажытных часоў — палюты 1917 г.; Бандарчык В. Гісторыя этналагічнага вывучэння // Беларусы: У 8-мі т. Мн., 1999. Т. 3.; Лысенко П. Туровская земля IX—XIII вв. Мн., 1999.

[16] Мавродин В. Основные этапы этнического развития русского народа // Вопросы истории. 1950. № 4. С. 62.

[17] Рыбаков Б. К вопросу об образовании древнерусской народности // Тезисы докладов и выступлений сотрудников ИИМК АН СССР... М., 1951.; id. Проблемы образования древнерусской народности в свете трудов И. В. Сталина // Вопросы истории. 1952. № 9; id. Древние русы: (К вопросу об образовании ядра древнерусской народности в свете трудов И. В. Сталина) // Сов. археология. 1953. № 17; Насонов А. «Русская земля» и образование древнерусского государства. М. 1951; Довженко В. К вопросу сложения древнерусской народности // Доклады VI научной конференции Ин-та археологии АН СССР. Киев, 1953; Тихомиров М. Значение Древней Руси в развитии русского, украинского и белорусского народов // Вопросы истории. 1954. № 6.; Казаченко А. Древнерусская народность — общая этническая база русского, украинского и белорусского народов // Сов. этнография. 1954. № 2. і inne.

[18] Черепнин Л. Исторические условия формирования русской народности до конца XV в. // Вопросы формирования русской народности и нации. М., Л., 1958.; Третьяков П. У истоков древнерусской народности. Л., 1970; Мавродин В. Образование древнерусского государства и формирование древнерусской народности. М., 1971; Происхождение русского народа. Л., 1978; Толочко П. Киев и Киевская земля в эпоху феодальной раздробленности XII—XIII веков. Киев, 1980; id. Древняя Русь: Очерки социально-политической истории. Киев, 1987; Седов В. Восточные славяне VI—XIII вв. М., 1982; id. Ранние славяне в средневековье. М., 1995; id. Древнерусская народность. М., 1999; Фроянов И. Киевская Русь. Очерки отечественной историографии. Л., 1990.

[19] Штыхаў Г. Насельніцтва зямель Беларусі ў IX—XIII стст. (вытокі беларускай народнасці) // З глыбі вякоў. Наш край. Гісторыка-культуралагічны зборнік. — Мн., 1992. — С. 15—40; id. Ранняе сярэднявечча. Пачатак пераходу да класавага грамадства. Узнікненне беларускай дзяржаўнасці (VI — першая палова XIII ст.) // Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х частках. Ч. 1. Мн., 1994; Тарасаў С. Узнікненне дзяржавы і царквы на Беларусі ў X—XIII стст. // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы. У 2-х частках. Мн., 1994. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. С. 34—38; Семянчук Г. Полацкая зямля ў сістэме палітычных адносін Усходняй Еўропы IX—XI стст. // Беларусіка-6. Беларусь паміж Усходам і Захадам. Ч. 2. Мн., 1997. С. 10—15; Марзалюк І. Да пытання аб этнічнай і палітычнай свядомасці ўсходнеславянскага насельніцтва ў 10—13 стст. // Гістарычны альманах. Гродна. 1998. № 1. С. 4—12; Брайчевський М. Походження Русі. Київ, 1968; Піўтарак Р. Вытокі беларускай мовы: новая канцэпцыя. Да праблемы «Беларусь паміж Украінай і Расіяй» // Беларусіка-Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. У 2-х частках. Ч. 2. — Мн., 1997. — С. 329—334.

[20] Штыхов Г. Древнерусская народность: реалии и миф // Труды VI Международного конгресса славянской археологии. Т. 3. Этногенез и этнокультурные контакты славян. — М., 1997. — С. 376—385.

[21] Pritsak O. Tne Origin of Ruś. Vol. Cambridge, 1981; Kłoczowski J. Ruś Kijowska X—XII wieku, (w) Teologia i kultura duchowa Starej Rusi. — Lublin, 1993. — S. 13—40; Jarco J. Ruś — «inię chrzcielne» narodów wschodnioeuropejskich, (w) Teologia i kultura duchowa Starej Rusi. — Lublin, 1993. — S. 77—87.

[22] Максімовіч Р. Гістарычная канцэпцыя Вацлава Ластоўскага ў працах сучасных гісторыкаў // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Т. 13. — New York, 1975. — С. 47—56. Сёння, дзякуючы фундаментальнай трылогіі польскага медыявіста Генрыка Пашкевіча, «Русь» сярэднявечных крыніцаў як канфесіёнім трывала замацавалася ў сучаснай еўрапейскай гістарычнай навуцы: «The Origin of Russia» (London, 1954), «The Making of the Russian Nation» (London,1963) і The Rise of Moscow's Power (New York, 1983).

[23] Franklin S. and Shepard J. The emergence of Rus 750—1200. London, New York: Longman, 1996.

[24] Данилевский И. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX—XII вв.): Курс лекций. — М., 1999. — С. 53—61; Петрухин В., Раевский Д. Очерки истории народов России в древности и раннем средневековье. — М., 1998. — С. 267—272; Петрухин В. Начало этнокультурной истории Руси IX—XI вв. Смоленск, М., 1995.

[25] Pritsak O. Tne Origin of Ruś. Vol. 1; Kłoczowski J. Ruś Kijowska X—XII wieku, (w) Teologia i kultura duchowa Starej Rusi. S. 13—40; Jarco J. Ruś — «inię chrzcielne» narodów wschodnioeuropejskich, (w) Teologia i kultura duchowa Starej Rusi. S. 77—87; Franklin S. and Shepard J. The emergence of Rus 750—1200. Lubke Ch. Fremde im ostlichen Europa. Von Gesellschaften ohne Staat zu verstaatlichen Gesellschaften (9—11. Jahrhundert). Koln—Weimar—Wien, 2001; Duczko W. Viking Rus. Studies on the Presence of Scandinavians in Easter Europe. Leiden—Boston—Koln, 2004.

[26] Піўтарак Р. Вытокі беларускай мовы: новая канцэпцыя. Да праблемы «Беларусь паміж Украінай і Расіяй» Ч. 2. С. 330—331.

[27] Седов В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. — М., 1970. — С. 178—186; Штыхов Г. Исследование памятников VI—XI веков в Беларуси: этнический аспект // Slavia Antiqua. T. XXXVIII, 1997. S. 11—23; Мядзведзеў А. Да пытання аб паходжанні беларусаў (па дадзеных археалогіі і мовазнаўства) // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мн., 1998. — С. 10—15; Дучыц Л. Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тысячагоддзя // Беларускі гістарычны агляд. Т. 2. Сш. 1 (жнівень 1995). С. 15—30; Bednarczuk L. Wokół etnogenezy Białorusinów // Leszek Bednarczuk. Stosunki językowe na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego. — Kraków, 1999. — S. 189—204.

[28] Пилипенко М. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. Мн., 1991.

[29] Wenskus R. Stammesbildung und Verfassung. Das Werden der fruhmittelalterlichen Gentes. Koln-Graz, 1961 (Koln—Vien, 1977); Zientara B. Swiadomość narodowa w Europie Zachodniej w średniowieczu. Powstanie i miechanizmy zjawiska, w: Państwo, naród, stany w świadomości wieków średnich. — Warszawa, 1990. — S. 14.

[30] Boroń P. Słowiańskie wiece plemienne. — Katowice, 1999. — S. 47—69.

[31] Повесть временных лет. Ч. 1. — М., Л., 1950. — С. 13, 14—15.

[32] Paszkiewicz Í. Początki Rusi. — Kraków, 1996. — S. 36—38.

[33] Седов В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982; Лысенко П. Дреговичи. Мн., 1991; Штыхаў Г. Крывічы. Мн., 1992; Рыбакоў Б. Радзімічы // Працы секцыі археалогіі Беларускай акадэміі навук. — Мн., 1932. Т. 3. С. 81—151.

[34] Піўтарак Р. Вытокі беларускай мовы: новая канцэпцыя. С. 332—334; Николаев С. Следы особенностей восточнославянских племенных диалектов в современных великорусских говорах. 1. Кривичи. // Балто-славянские исследования. 1986. М., 1988; 1987. М., 1989.

[35] Зализняк А. Древненовгородский диалект. М., 1995.

[36] Арутюнов С. Народы и культуры: развитие и взаимодействие. — М., 1989. — С. 86—87.

[37] Гісторыя Беларусі: У 6-ці т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сяр. XIII ст. — Мн., 2000. — С. 328—329.

[38] Карский Е. Белорусы. Т. 1. Введение в изучение языка и народной словесности. Варшава, 1903; Воўк-Левановіч О. Лекцыі па гісторыі беларускай мовы. Мн., 1994.

Генадзь СЕМЯНЧУК (Горадня).

Сымболіка й геральдыка Полацкае дзяржавы ў X—XV стст.



Праблема сымболікі й геральдыкі Полацкага княства — першай беларускай дзяржавы, як ні дзіўна, пакуль сур'ёзна не закраналася ў айчыннай гістарыяграфіі. Пасля аднаўлення незалежнасці Беларусі асноўныя дыскусіі разгарэліся вакол герба Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага *Пагоня*, які 19 верасня 1991 г. быў зацверджаны ў якасці Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь *[1]*. Аўтары закону аб Дзяржаўнай сымболіцы Беларусі зыходзілі ў сваіх меркаваннях з геральдычных традыцыяў ВКЛ і Беларускай Народнай Рэспублікі (што ў пэўным сэнсе апраўдана), таму ў іх нават думкі не ўзнікала аб магчымасці пошуку іншых беларускіх дзяржаўных сымбаляў. Разам з тым, сымболіка й геральдыка Полацкае дзяржавы патрабуе сур'ёзнага навуковага даследавання хоць бы таму, што гісторыя Беларусі значна больш старажытная за гісторыю ВКЛ. Мэта артыкулу — не ў пераглядзе беларускай нацыянальнай і дзяржаўнай сымболікі, а ў спробе распачаць па гэтай праблеме навуковую дыскусію, тым больш што яна і пасля *рэферэндуму* 1995 г. не выглядае канчаткова вырашанай.

Каб пачаць разгляд канкрэтных выяваў, эмблемаў, сымбаляў і гербаў, адразу адзначу, што мы абмяжоўваемся храналагічнымі рамкамі X—XV стст., калі Полацкае княства захоўвала або поўную, або адносную самастойнасць, нават у складзе ВКЛ *[варта заўважыць, што праблема ўваходжання Полацкага княства ў ВКЛ у айчыннай гістарыяграфіі пакуль канчаткова не вырашана]*. За гэты час у сваім развіцці Полацкая дзяржава перажыла некалькі важных этапаў, якія паўплывалі на яе сымболіку:

1. княжацкі: X — пачатак XII ст.;
2. вечавы або рэспубліканскі: 20-я XII — 70-я гг. XIV стст.;
3. вялікакняжацкі: 80-я г. XIV ст.;
4. баярска-намесніцкі: канец XIV — канец XV ст.

На першым этапе (X — пачатак XII ст.) полацкія князі адыгрывалі ў знешняй і ўнутранай палітыцы дзяржавы, пры існаванні веча, вядучую ролю. Суверэнітэт Полацкае зямлі ўвасабляўся ў асобе князя, таму тагачасная дзяржаўная сымболіка адпавядала тым выявам і знакам, якімі карыстаўся той ці іншы полацкі князь. Захавалася пячатка полацкага князя Ізяслава Ўладзіміравіча (да 980—1001 г.), якую даследнікі датуюць канцом X ст. На захаваным яе баку змешчана выява княжацкага знаку-кляйна ў выглядзе *Трызуба* Рурыкавічаў і імя: *«ИЗЯС[лав]ОС» [2. С. 29—30]*. Звяртае на сябе ўвагу, што ў адрозненне ад *Трызуба* бацькі

Уладзіміра Святаслававіча знак Ізяслава займеў такі важны элемент, як крыж. Апошні сымбалізаваў тое, што ўладальнік кляйна — хрысціянін. Гэта цалкам супадае з той характарыстыкай, якую даў Ізяславу Полацкаму летапісец: *«Быў ён ціхі і лагодны, смірны і літасцівы, і слёзны, і ўмільны, і доўгацярплівы. Паважаў духоўны і манаскі сан, быў старанным у чытанні боскіх пісанняў» [3. С. 59]*. Увядзенне крыжоў у знакі-клейны было вынікам хрысціянізацыі Русі (ад 988 г.). Гэты працэс, які польскі даследнік Ф. Пекасіньскі называў *«асвяшчэннем» [4. S. 116—117]*, у Полацкім княстве распачаўся ў канцы X ст. са знаку князя.

Распаўсюджанне хрысціянства паспрыяла таксама пранікненню з Бізантыі ў Полацкае княства пэўных эмблемаў і сымбаляў. Найперш гэта датычыць выяваў святых усходняй (пазней — пра-

васлаўнай) царквы. На ўзор бізантыйскай сфрагістыкі з канца XI ст. з'яўляюцца княжацкія пячаткі з выявамі святых-заступнікаў іх (пячатак) уладальнікаў. Часта на абодвух баках пячаткі змяшчаліся два святыя, якія ўвасаблялі хрысціянскія імёны яе ўласніка і яго бацькі *[5. № 4. С. 48]*. На думку М. Белемука, унук Ізяслава полацкі князь Усяслаў Брачыслававіч насіў хрысціянскае імя Дзмітры і мог быць уладальнікам пячаткі, дзе на адным баку была чатырохпялёсткавая кветка накшталт грэцкага крыжа (сымбалічны вобраз Хрыста), а на другім — постаць князя са шчытом і дзідаю і з надпісам *«Дзімітрэос» [раней*



яна прыпісвалася кіеўскаму князю Ізяславу Дзмітрыю Яраслававічу (6. С. 69)]. Адным з аргументаў на карысць таго, што Святы Дзмітры быў патронам полацкага князя Усяслава, аўтар лічыць яго іконку на крыжы Еўфрасінні Полацкай *[6. С. 69—70]*. Аднак з такім жа поспехам можна сцвярджаць, што святым патронам Усяслава мог быць і Святы Стэфан, і Святы Панцеляймон. Іхныя выявы таксама змешчаны на адваротным баку крыжа. Думаем, што іх з'яўленне было выклікана закладваннем у крыж рэліквіяў: мошчаў і крыві, а не нейкай генеалагічнай праграмай, якая сапраўды прысутнічае, але на галоўным яго баку — Святая Еўфрасіння (патронка заказчыцы), Святы Георгі (патрон яе бацькі полацкага князя Святаслава Георгія Усяслававіча) і Святая Сафія (патронка маці князёўны Сафіі) *[8. С. 91—92]*. Акрамя гэтага, на пячатцы ўсё ж змешчана выява свецкага чалавека, а не святога. Усё гэта робіць сумнеўным атрыбутацыю М. Белемука. А калі ўлічыць, што сярод полацкіх князёў розных галінаў найчасцей з хрысціянскіх імёнаў сустракаецца імя Васіль ці Васілька *[14. С. 30]*, то патронам князя Усяслава мог быць і Святы Васіль.

З князем Усяславам Полацкім звязвае яшчэ пярсцёнак-сыгнет, які некалі захоўваўся ў віленскім Беларускім музеі імя Івана Луцкевіча *[9. С. 6]*. На ім змешчаны клейнавы знак накшталт літары *«Ш» (Трызуб)*, сярэдняя ляска якога вышэйшая за бакавыя і перакрыжавана касым крыжам, вакол знаку надпіс: *«К[ня]З[ь] В[се]СЛ[а]В П[о]Л[от]СК[ий]» [С. Тарасаў прачытаў надпіс так: «К[ня]З[ь] ВС[ес]Л[а]В П[о]Л[о]Ч[с]К[и]» (22)] [8. С. 49]*. У літаратуры ўжо выказваліся сумневы ў аўтэнтычнасці пярсцёнка *[2. С. 10]*. На маю думку, тое, што гэта падробка, створаная, хутчэй за ўсё, спецыяльна для экспазіцыі віленскага музею, сведчыць якраз характар клейнавай выявы. Яна больш падобная на вядомыя *Калюмны* Вітаўта, чым на *Трызуб* дзе-



да Усяслава. Відаць, аўтар такім чынам хацеў падкрэсліць сувязь і пераемнасць паміж полацкімі і літоўскімі князямі. Палеаграфічныя асаблівасці надпісу (напрыклад, напісанне літараў *«Л»* і *«С»*) ды і сам надпіс, як такі на сыгнеце, сведчаць пра больш позняе яго паходжанне. Тое ж адносіцца і да другога пярсцёнка-сыгнету полацкага князя Барыса Рагвалода Усяслававіча *[9. С. 6] [характэрныя наступныя словы Антона Луцкевіча:* ***«Вельмі даўных часоў сягае багатая сфрагістычная калекцыя, якая налічывае 103 пячаці. Найстарэйшыя — пячаці на сыгнэтах полацкіх князёў Усяслава (XI ст.) і Барыса (XII ст.). Пячаці гэтыя даюць вычэрпываючы адказ на пытаньне, якога гэрбу ўжывалі полацкія князі — патомкі Уладзімера Кіеўскага»*** *[9. С. 4, 6]. Мабыць, тут аўтар рабіў намёк на тое, што яны карысталіся гербам* ***Калюмны****]*.

Такім чынам, на сёння сымболіка князя Усяслава застаецца пакуль невядомай. Тое, што ён займаў полацкі сталец даволі працяглы час (1044—1101) дазваляе спадзявацца, што яна захавалася. Шукаць яе трэба сярод неатрыбутаваных пячатак і пломбаў XI—пачатку XII ст. з Полацка, Віцебска, Кіева і Ноўгарада. Аднак набор гэтых сымбаляў пэўна будзе падобны на сымбалі іншых князёў Русі: уласны знак-кляйно, выява тэзаіменнага святога, рэлігійная эмблема. У сувязі з гэтым, хочам звярнуць яшчэ ўвагу на іканаграфію самога Усяслава, якая дайшла да нас у мініятурах канца XV ст. Радзівілаўскага летапісу. На іх полацкі князь намаляваны ў адмысловай кароне, якую М. Белямук называе туфой — галаўны ўбор, які ў Бізантыі насілі сыны і браты імператара *[6. С. 70]*. Пяць *«пялёсткаў»* кароны завяршаліся пэрлінамі па тры на кожным (усяго 15). Такі тып кароны быў больш падобны на кароны заходнееўрапейскіх манархаў (герцагаў

ці вялікіх князёў), а не бізантыйскіх імператараў. Як можна меркаваць, такім чынам мастак адлюстраваў свае фантазіі на словы ў летапісе аб нараджэнні Ўсяслава з *«язвенам»*. Аднак нельга выключыць і тое, што мастак адлюстраваў у сваёй мініятуры або нейкі сапраўдны партрэт Усяслава (на карысць гэтага сведчаць даволі дакладна прамаляваныя партрэтныя рысы полацкага князя), або толькі яго карону, якую бачыў на ўласныя вочы. Апошняя ў XV ст. яшчэ магла захоўвацца ў тым жа Смаленску *[на думку некаторых даследнікаў, Радзівілаўскі летапіс мог быць створаны ў Смаленску (82. С. 65)]*, куды быў вывезены і крыж Еўфрасінні. У кожным выпадку на малюнках Радзівілаўскага летапісу адметная ад традыцыйных княжацкіх шапак іншых князёў Русі карона Усяслава сведчыла пра суверэнітэт Полацкага княства.

У дачыненні да сымболікі сына Усяслава — полацкага князя Барыса Рагвалода — трэба дадаць, што ён на сваіх вядомых камянях выбіваў два тыпы крыжоў: чатырох- і шасціканцовы на розных падставах *[11. С. 99—109]*. У сувязі з гэтым, дзве знойдзеныя ў Віцебску пячаткі XII ст. з выявай Святога Барыса з крыжам на грудзях і з *«працьвілым»* чатырохканцовым крыжам *[12. С. 20, № 5—6]* маглі належаць яму. Яны падобныя да знойдзенай у Менску пячаткі XII ст. з выявай Святога (?) Глеба і са знакам-кляйном: дуга канцамі ўверх, з якой выходзіць чатырохканцовы крыж і якую прыпісваюць роднаму брату Барыса Рагвалода менскаму князю Глебу Усяслававічу *[12. С. 20; 13. Табл. I, № 17]*.

Шасціканцовы крыж у Полацкім княстве вядомы з першай паловы XII ст. Ён быў выбіты на г. зв. трэцім камені полацкага князя Барыса Рагвалода і на камені ягонага сына Рагвалода Васіля (датаваны 7 мая 1171 г.) *[11. С. 108, 110]*. Да іх трэба дадаць і славуты крыж Еўфрасінні Полацкай, зроблены майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. Звычайна крыж такой формы называюць патрыяршым ці латарынгскім *[10. С. 272]*. Аднак Васіль Пуцко давёў, што крыж Еўфрасінні — гэта г. зв. Узвіжальны Крыж: *«...тыпалагічныя адзнакі крыжа прападобнае Еўфрасіньні роўна й ягоныя памеры поўнасьцю дазваляюць уважаць яго прызначэньне як узьвіжальнага крыжа» [17. С. 13]*. Сама Еўфрасіння называла яго Чэсным Крыжам: *«Въ лето 6669 (1161) покладаеть Офросинья честьный кресть...» [18. С. 40; 19. С. 210]*. Цікавае і сведчанне аўтара *«Аповесці мінулых гадоў»* пра Усяслава Полацкага пад 1068 г., калі той сядзеў у порубе ў Кіеве: *«В день бо Въздвиженья Всеслав, вздохнув, рече: "О кресте честный! Понеже к тобе веровах, избави мя от*



рва сего". Бог же показа силу крестную на показанье земле Русьстей, да не преступають честнаго креста, целовавше его...» [19. С. 153]. Такім чынам, Чэсны і Узвіжальны Крыж — гэта Святы Крыж. Звернем увагу на далейшыя словы летапісца аб яго ўласцівасцях: *«Понеже велика есть сила крестная: крестомь бо побежени бывають силы бесовьскыя, крест бо князем в бранех пособить, в бранех крестом согражаеми вернии людье побеждають супостаты противныя, крест бо вскоре избавляеть от напастий призывающим его с верою. Ничтоже ся боять беси, токмо креста...» [19. С. 153]*.

Такім чынам, Святы Крыж з'яўляўся сымбалем перамогі над бесамі і ворагамі і меў спярша толькі рэлігійны сэнс. Аднак яго ўмоўна можна лічыць сымбалем Полацкага княства ў X — пачатку XII ст., бо ён часта выкарыстоўваўся князямі полацкае дынастыі. Адзначым, што шасціканцовы Святы Крыж быў добра вядомы ў гэты ж час і ў іншых манархіях Еўропы. Паўсюль ён меў бізантыйскі радавод і з цягам часу ператварыўся ў герб (з адметнымі дэталямі) у Венгрыі, Латарынгіі, Польшчы і ВКЛ. Для нас асабліва важна, што ў апошніх краінах заслуга яго геральдызацыі належыць Уладзіславу II Ягайлу, які быў добра знаёмы з праваслаўнай культурай *[ёсць усе падставы сцвярджаць, што асабісты герб польскага караля і вялікага князя літоўскага Уладзіслава II Ягайлы, які вядомы пад назвай* ***Бойча****: у блакітным полі залаты падвойны крыж, меў у аснове выяву менавіта Святога Крыжа (21. S. 264—265)]*.

На другім вечавым або рэспубліканскім (20-я XII — 70-я гг.

XIV стст.) этапе на першы план у Полацкай дзяржаве выходзіць сымболіка полацкага епіскапа. Звычайна ўзмацненне ролі веча звязваюць з тым, што ў 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч выслаў полацкіх князёў Давыда, Расціслава, Святаслава і сыноў Барыса Рагвалода Усяслававічаў з жонкамі і дзецьмі ў Бізантыю *[3. С. 84]*. Сапраўды, гэта паспрыяла палітычнай актывізацыі ў Полацку мясцовага баярства, мяшчанаў і епіскапа. Трэба ўлічваць, што ператварэнне Полацкага княства ў феадальную вечавую рэспубліку пачалося яшчэ ў часы кіравання князя Барыса Рагвалода Усяслававіча (1101—1128). У позняй *«Хроніцы Быхаўца»* пра гэта згадваецца так: *«І валадарачы ў Полацку, [князь Барыс] быў ласкавы да падданых сваіх, і даў ім вольнасці, і дазволіў веча мець, і ў звон званіць, а потым і самім кіраваць, як у Вялікім Ноўгарадзе і Пскове» [23. С. 76—77; 24. С. 180] [паводле Г. Штыхава:* ***«...Полацкую зямлю ў XII—XIII ст. можна лічыць княствам з абмежаванай княжацкай уладай, якое было на шляху да ператварэння ў сярэднявечную рэспубліку...»*** *(24. С. 221)]*. Ясна, што пры такім палітычным ладзе фактычным кіраўніком дзяржавы станавіўся полацкі епіскап. Гэты факт знайшоў адлюстраванне ў сфрагістыцы. Так, калі на пячатцы Міны, полацкага епіскапа ў 1105—1116 г. дамінавала выява тэзаіменнага Святога Міны, то на епіскапскай пячатцы Дыянісія († 1183 г.) была змешчана выява Багародзіцы тыпу *Знаменіе [2. С. 30, 32]*. Думаем, гэта было выклікана якраз падвышэннем палітычнага статусу епіскапа ў Полацку.

На замацаванне вядучай ролі епіскапа ў Полацкай дзяржаве паўплывалі і знешнепалітычныя падзеі — з'яўленне немцаў у Прыбалтыцы і разгром Рурыкавічаў мангола-татарамі ў 1238—1241 гг. Немцы, спачатку купцы і місіянеры, пазней — рыцарства і каланісты, з'яўляюцца на падуладных Полацку прыбалтыйскіх землях у канцы XII ст. Ужо ў пачатку XIII ст. на землях ліваў (Лівоніі) была створана нямецкая тэакратычная дзяржава, на чале якой стаяў рыжскі біскуп Альберт. Заснаванне Рыжскага біскупства (1201—1207) і Ордэну братоў Хрыстовых *(«Fratres Militiae Christi»)* (1202—

1210) пазнаёміла палачанаў не толькі з узорамі заходнееўрапейскіх палітычных сістэмаў, але з сымболікай і геральдыкай.

Больш таго, нельга ігнараваць узаемаўплываў у гэтых сферах.

Сымболіка Рыжскага біскупства насіла рэлігійны характар. Паводле хронікі Генрыха Латыша, на яго сцягу была выява Багародзіцы. Так, апісваючы падзеі 1207 г. па захопу замку селаў, ён адзначыў, што абат Тэадорых і настаяцель Эгельберт: *«...усталявалі ў крэпасці харугву Найсвяцейшай Марыі...»*, у 1208 г. *«...харугва Найсвяцейшай Панны была прынесена да ліваў, летаў і тэўтонаў ва Ўнганію, а потым і да ўсіх эстаў і бліжэйшых паганскіх народаў...»*, а ў 1212 г. лівы, якія здаліся ў замку Дабрэла, *«...паднялі харугву Найсвяцейшай Марыі...» [25. С. 101, 106, 145]*. Як насамрэч выглядала гэтая харугва дае ўяўленне праца Яна Длугаша *«Banderia Prutenorum»* з малюнкамі Станіслава Дзюрынка (1448 г.): на белым палотнішчы *«...imago sancte Marie virginis gloriose, ut hic apparet...» [26. S. 274—275]*. Паводле польскага храніста такая харугва *«magistri Livonie ordinis cruciferorum»* была захоплена ў бітве з крыжакамі пад Дубкамі ў 1431 г. *[26. S. 274]*. Калі адкінуць пазней дададзены тэўтонскі чорны крыж у срэбным полі, то атрымаем згаданую вышэй Генрыхам Латышом харугву Найсвяцейшай Панны Марыі. Што да сымболікі рыцарскага Ордэна братоў Хрыстовых, то ў яе аснове ляжалі чырвоныя крыж і меч у срэбным полі: *«...Тэадорых... заснаваў нейкае брацтва рыцараў Хрыстовых, якім спадар Папа Інакенці надаў статут храмаўнікоў і знак для нашэння на вопратцы — меч і крыж, загадаўшы быць у падпарадкаванні свайму біскупу...» [25. С. 70]*. З-за эмблемы за імі хутка замацавалася назва Ордэну мечаносцаў ці Ордэну братоў па мячы *(«Schwertbruderorden») [31. С. 8]*. Звяртае на сябе ўвагу перавага срэбнага і чырвонага колераў у нямецкай сымболіцы Лівоніі.

Сымболіка Полацкае дзяржавы не рознілася ад сымболікі сваіх новых суседзяў у Лівоніі, бо мела ў аснове тую ж выяву Багародзіцы. Багародзіца тыпу *Знаменіе* ў Полацку стала спадчыннай, бо прасочваецца пазней на пячатках полацкіх епіскапаў Якава (1309) і Грыгора (1338) *[2. С. 33]*. Пра тое, што менавіта яна можа прэтэндаваць на званне галоўнага сымбалю Полацкае дзяржавы ў 20-я г. XII — 70-я г. XIV ст. *[спакусліва звязаць полацкую Багародзіцу з той жа выявай, але ўжо на харугве ВКЛ. Паводле аўтараў XVI ст. сцяг ВКЛ быў чырвоны, на адным баку з* ***Пагоняй****, а на другім — з Багародзіцай (83. С. 16). Неяк звязаны быў з гэтым і стары беларускі рэлігійны гімн* ***Багародзіца****. На жаль, праблема пераемнасці полацкіх традыцыяў у ВКЛ пакуль не даследавана. Таксама як і гісторыя сцягоў Беларусі]*, сведчыць факт, на які ніхто з беларускіх даследнікаў не звярнуў належнай увагі — у грамаце 1338 г. пячатка епіскапа Грыгора прывешана на першым месцы (!), перад пячаткай полацкага князя Глеба. А ў ранейшай грамаце епіскапа Якава да рыжскага біскупа прывешана толькі яго пячатка, а князь Віцень згадваецца як бы між іншым: *«...с сыномъ [пры ўсіх тлумачэннях значэння слова* ***«сын»*** *у дачыненні да вялікага князя літоўскага Віценя, высокі палітычны статус полацкага епіскапа не выклікае сумненняў] моимъ с Витенемъ...» [29. № 3]*. Відавочна, што ў першай палове XIV ст. Полацкая дзяржава сапраўды з'яўлялася феадальна-тэакратычнай рэспублікай на чале з епіскапам *[27. С. 290] [паводле расійскага гісторыка А. Рукавішнікава, Полацк ужо ў першай палове XIII ст.:* ***«з'яўляўся самакіруючай рэспублікай з яскрава выражанымі рысамі арыстакратычнага кіравання»****. Цыт. паводле: (24. С. 220—221). На нашу думку, вызначэнне* ***«феадальна-тэакратычная рэспубліка»*** *найбольш адпавядае таму палітычнаму ладу, які склаўся ў Полацку ў вызначаны час (20-я XII — 70-я гг. XIV стст.)]*. Цікава, што ў ВКЛ яшчэ ў XVI ст. захоўвалася памяць *«о Полоцкой свободности, або Венеции» [24. С. 220]*.

Полацкі епіскап меў свой двор, канцылярыю, пячатку, рэзідэнцыю *(Святую Сафію)*. Пры гэтым, як можна меркаваць, па назве галоўнага храма Полацкая дзяржава неафіцыйна называлася *Домам Святой Сафіі*, на ўзор Ноўгарада Вялікага (таксама *Дом Святой Сафіі*), Пскова *(Дом Святой Тройцы) [28. С. 217]*, Ізборска *(Дом Святога Міколы)* і Рыжскага біскупства *(Дом Найсвяцейшай Панны Марыі [тэрмін* ***«дом»*** *адпавядаў адначасова паняццям:*

«царква» і «дзяржава». *Так, у 1209 г. князь Усевалад перадаў свой горад Герцыке з прылягаючымі землямі* ***«царкве Святой Маці Божай і Панны Марыі»*** *(25. С. 280)])*. У грамаце епіскапа Якава пра гэта згадваецца так: *«былъ есмь не дома... а ныне есмь на своемь месте оу святое Софье...» [29. № 3]*.

У святле адзначанага вышэй, полацкіх князёў вечавага ці рэспубліканскага этапу (20-я XII — 70-я гг. XIV стст.) трэба кваліфікаваць як служылых. У сувязі з гэтым іх паходжанне магло быць розным: мясцовым, смаленскім, літоўскім — усё вызначала ўнутраная палітычная сітуацыя і міжнароднае становішча. Варта адзначыць, што ў крыніцах гэтага часу полацкія князі фігуруюць у множным ліку: *«Въ то же лето (1191) ходи князь Ярослав на Лукы, позванъ полотьскою княжьею и полоцяны...» [54. С. 39—40]*. Іхная сымболіка была даволі разнастайная і наўрад ці можа прэтэндаваць на званне полацкай дзяржаўнай сымболікі ў гэты час. Аднак яна заслугоўвае ўвагі, бо з яе бярэ пачаткі сымболіка Полацкай дзяржавы наступнага этапу.

У першай палове XIII ст. у Полацку спаборнічаюць за ўладу з мясцовай дынастыяй смаленскія Рурыкавічы. Пасля смерці ў 1216 г. полацкага князя Уладзіміра *[Э. Загарульскі лічыць яго сынам полацкага князя Васількі Святаслававіча (14. С. 15—16), а В. Насевіч — сынам полацкага князя Усяслава Васількавіча (30. С. 15)]* на княжацкім пасадзе ў Полацку з'яўляюцца смаленскія князі. Паводле найноўшых беларускіх даследаванняў *«...у першай чвэрці XIII ст. Полацк і Віцебск прызналі вярхоўную ўладу смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча...» [24. С. 229]*. У 1229 г. ад імя апошняга быў заключаны мір і падпісана гандлёвая *«Праўда»* з Рыгай і Гоцкім берагам. Пры гэтым немцам рэкамендавалася: *«Тая правда латинескомоу възяти оу Роускои земли оу вълъсти князя смольнеского и оу полотьского князя вълъсти и оу витьбеского князя вълъсти...» [20. С. 20—25]*. Полацкім князем, верагодна, быў у той час Святаслаў Мсціслававіч са смаленскіх Рурыкавічаў. Вядома, што ў 1232 г. менавіта ён разам з палачанамі захапіў Смаленск *[30. С. 15]*. Будучы ўжо смаленскім князем, недзе паміж 1233 і 1240 г., ён заключыў гандлёвае пагадненне з Рыгай *«...како то было при моемъ отци при Мьстиславе при Романовици а при моемь брате при Мьстиславе...» [20. С. 13, 17; 32. С. 37—38]*. На дамове захавалася ягоная пячатка, дзе былі змешчаны выявы яго тэзаіменных Святых Барыса і Давыда *[20. С. 16—17]*. Думаем, што яе ж выкарыстоўваў Святаслаў Мсціслававіч і тады, калі быў служылым князем у Полацку.

З княжацкае сфрагістыкі гэтага перыяду варта звярнуць увагу таксама на пломбу з Полацка, дзе на адным баку была змешчана выява князя ў профіль (?) па пас з каронай на галаве (карона заходняга тыпу трохпялёсткавая каралеўская!) і рэгаліямі ў руках, а на другім — трызуб, у якім у сярэдзіне быў чатырохканцовы крыж *[13. Табл. I, № 10]*. Свецкі характар пломбы дазваляе датаваць яе XIII ст. Як можна меркаваць з апісанняў, менавіта яе знайшлі ў пласце 1240-х гг. *[16. С. 514]*. Пад 1239 г. полацкім князем згадваецца Брачыслаў *[паводле меркавання Э. Загарульскага, бацькам яго быў Васілька з полацкіх Святаслававічаў (14. С. 17)]*, дачка якога выйшла замуж за князя Аляксандра Неўскага: *«Оженися князь Олександръ, сын Ярославль в Новегороде, поя в Полотьске у Брячьслава дчерь...» [14. С. 17; 54. С. 77]*. Магчыма, гэта ягоная пячатка. Выглядае на тое, што яна была адной з першых свецкіх княжацкіх пячатак у Полацкай дзяржаве. Цікава, што і князь Аляксандр Неўскі таксама ўжываў пячатку свецкага тыпу, толькі конную *[15. С. 69]*.

Пасля разгрому Рурыкавічаў мангола-татарамі ў 1238—1241 г. на полацкім княжацкім пасадзе з'яўляюцца служылыя літоўскія князі. Прычыну гэтага можна ўбачыць у імкненні палачанаў (літоўскай партыі) пазбыцца татарскай залежнасці, бо па словах летапісца: *«Былі тады ўсе князі [рускія] у волі татарскай» [23. С. 45]*. Ужо ў 1248 г. полацкім князем становіцца Таўцівіл, выгнаны Міндоўгам з Літвы. Ягоная пячатка невядомая, затое захавалася пячатка іншага літоўскага ўцекача — пскоўскага князя Даўмонта Цімафея. На адным яе баку была выява тэзаіменнага Святога Цімафея, на другім — шасціканцовы Святы Крыж *[33. С. 118; 34. № 4. С. 22]*. Як бачым, літоўскія служылыя князі на Русі пераймалі мясцовыя сфрагістычныя традыцыі.

У канцы XIII ст. у Полацку і Віцебску зноў узмацняецца ўплыў смаленскіх князёў. У першым сядзеў Канстанцін Бязрукі *[да смаленскіх Рурыкавічаў — як сына Расціслава Мсціслававіча — яго адносіць В. Насевіч (30. С. 54, 150). Гэта выглядае праўдападобна, бо, па-першае, ён адназнач-*

на не быў сынам Таўцівіла (таго звалі Георгіем [84. S. 73, заўвага 86]), а, па-другое, не мог быць ён і зяцем Аляксандра Неўскага, калі б паходзіў з полацкае дынастыі. Магчыма, гэта яго пячатку знайшлі ў Віцебску і Ноўгарадзе і памылкова аднеслі да XII ст. Паводле І. Цішкіна, на адным яе баку была пагрудная выява Святога Канстанціна ў кароне, а на другім — ***«...двузубец з перакладзінай, якая злучае зубцы ва ўнутранай яго частцы...»*** *(12. С. 20)]*, а ў другім — спачатку намеснік смаленскага князя Фёдара Чорнага *[гэтым намеснікам Г. Ластоўскі лічыць апошняга віцебскага князя Яраслава Васільевіча, які ў 1318 г. выдаў сваю дачку за Альгерда Гедымінавіча (70. С. 33). Аднак, па-першае, наўрад ці намеснік мог так свабодна распараджацца княствам, па-другое, асоба Яраслава згадваецца толькі ў познім фальсіфікаце і выклікае сумнеў (84. S. 302; 85. С. 53—54)]*, а потым князь Міхаіл Канстанцінавіч *[паводле В. Насевіча ён быў сынам полацкага князя Канстанціна Бязрука (30. С. 68)] [35. С. 64—65]*. Цікава, што да вядомай дамовы 1229 г., заключанай ад імя Смаленска, Полацка і Віцебска, былі прывешаны пячаткі менавіта Фёдара Расціслававіча (Чорнага) (1280—1299) і смаленскага ўладыкі Перфірыя *[20. С. 53] [пячатка Мсціслава Давыдавіча, смаленскага князя ў 1229 г., мела на сваіх баках тэзаіменных Святога Фёдара і Святых Барыса і Глеба (60. С. 21—22)]*. Аналагічныя пячаткі смаленскага князя былі прывешаны да актаў з 1284 г. *[20. С. 53—54, 63, 66]*, што сведчыць аб пацвярджэнні ім дамовы з Рыгай і Гоцкім берагам у канцы XIII ст. *[20. С. 54]*. Для нас важна, што Полацк і Віцебск зноў выступалі тут разам са Смаленскам, бо словы пра воласці полацкага і віцебскага князёў былі захаваны ў старой грамаце.

У сувязі з гэтым, важнае значэнне набывае сымболіка смаленскіх князёў у канцы XIII ст. А ў ёй адбыліся даволі істотныя змены. Так, на галоўным баку пячаткі князя Фёдара Расціслававіча была змешчана выява лява (леапарда), які ідзе *[33. С. 39]*, а на адвароце — надпіс: *«ВЕЛ[и]КОГО КНЯЗ[я] ФЕОДО[ра] ПЕЧ[ать]»*

[20. С. 53, 63, 66]. Гэта быў ужо новы тып княжацкай пячаткі, дзе выразна бачацца ўплывы заходняй геральдыкі. Паводле А. Лакіера: *«Форма льва с расправленными когтями, положение его хвоста, пригнутого к спине, заставляет подозревать иностранное происхождение этой эмблемы» [33. С. 71]*. Цікава, што князь Аляксандр Глебавіч, які ў 1297 г. *«взя лестью княжение смоленское»*, карыстаўся пячаткай старога тыпу з выявамі тэзаіменных Святых Аляксандра (коннага) і Глеба (пешага) *[20. С. 56, 69]*. Ён прыходзіўся пляменнікам згаданаму Фёдару Чорнаму, а ягоны бацька — Глеб Расціслававіч княжыў у Смаленску ў 1270—1277 гг. і карыстаўся пячаткай таксама з тэзаіменнымі Святымі Глебам і Барысам (пешымі) *[20. С. 59]*. Такім чынам, можна меркаваць, што менавіта князь Фёдар Расціслававіч быў ініцыятарам увядзення новай эмблемы і стварэння для сябе пячаткі такога тыпу. Мабыць, гэта было звязана з афармленнем тытулу вялікага князя смаленскага, які быў ужыты на адваротным яе баку. Пастава лява на ягонай пячатцы сапраўды сведчыць пра заходнія (дацкія ці нямецкія) геральдычныя ўплывы, але адсутнасць тарчы не дазваляе яшчэ гаварыць пра згаданую выяву як пра герб. Гэта была яшчэ дагербавая выява, патэнцыйна гатовая для ператварэння ў герб.

Звернем увагу таксама і на тое, што змяніўся тып пячаткі смаленскіх епіскапаў. Калі ў папярэднікаў уладыкі Перфірыя на пячатках была змешчана выява Багародзіцы *Знаменіе [60. С. 21, мал. 2]*, то ў яго мы бачым толькі вербальныя формулы: *«ВЛ[а]Д[ы]КЪ [С]МОЛЕН[ь]СКО[го]»*, а на адвароце: *«П[е]ЧАТ[ь] ПЕРЬФ[ирия]» [20. С. 53]*. Думаем, што гэта было не выпадкова. Змена тыпу пячаткі, а таксама яе месца на дакуменце за княжацкай пячаткай добра сведчыць пра высокі, але другасны статус епіскапа ў Вялікім Княстве Смаленскім (ВКС).

На працягу першай паловы XIV ст. літоўскія князі Гедымінавічы канчаткова замяняюць смаленскіх Рурыкавічаў у Полацку і Віцебску. Адбывалася гэта не на падставе канфліктаў, а праз збліжэнне дзвюх дынастыяў. Мы нават дапускаем думку, што ў Полацкай дзяржаве быў перыяд (сярэдзіна XIII — 20-я гг. XIV ст.), калі існавала паралельная літоўска-смаленская служылая княжацкая сістэма *[87. С. 124]*. Аднак недзе ў канцы 30-х гг. XIV ст. пры вялікім князі літоўскім і рускім Гедыміне яна была разбурана. Так, у 1338 г. у Полацку слу-

жылым князем быў ягоны сын Нарымонт Глеб. На ўжо згаданай вышэй грамаце з 1338 г. захавалася ягоная пячатка, дзе на адным баку была змешчана выява вершніка з мечам, а на другім — надпіс: *«ПЕЧАТЬ КНЯЖА ГЛЕБОВА» [2. С. 33]*. Важна тое, што згаданы вершнік не нёс ніякай полацкай агульнадзяржаўнай ідэі — гэта была ўласная дагербавая эмблема князя *[нягледзячы на вялікі ўплыў Гедыміна ў Полацку, апошні захоўваў свой суверэнітэт. Пра гэта сведчыць тое, як ён падзяліў ВКЛ паміж сваімі сынамі. Паводле беларуска-літоўскіх летапісаў, Гедымін вылучыў са сваіх земляў Віленскі, Троцкі, Кернаўскі, Слонімскі, Пінскі, Крэўскі, Наваградскі ўдзелы, пры гэтым асобна падаюцца Жамойцкая, Віцебская і Валынская землі (23. С. 93), а пра Полацк няма і згадкі. У такой сітуацыі выява вершніка на пячатцы полацкага князя Глеба магла быць толькі яго ўласнай эмблемай. Цікава, што розныя даследнікі трактуюць яе або як выяву яго тэзаіменнага Святога Глеба, або як Святога Юр'я, або як прататып гербу* ***Пагоня*** *(15. С. 85; 88. С. 15). На нашу думку, наколькі дазваляе меркаваць якасць ілюстрацыйнага матэрыялу, была гэта свецкая конная выява самога князя Нарымонта Глеба, г. зв. партрэтная пячатка, пра што сведчыць надпіс на адвароце. Блізкі да яе тып выкарыстоўваў унук Гедыміна Карыбут Дзмітры Альгердавіч (1386) (56. С. 237, мал. 1)]*. У Віцебску ж, у тым жа годзе, князем быў другі сын Гедыміна Альгерд. Ягонае ўладкаванне там адбывалася на іншых падставах. Як сведчыць *«Хроніка Быхаўца», «...князь віцебскі сыноў не меў, толькі дачку, і ён аддаў яе за Альгерда і прыняў яго ў зямлю Віцебскую» [23. С. 93]*. Як выглядала ягоная пячатка ў святле найноўшых даследаванняў літоўскага даследніка Э. Рымшы — невядома *[69. S. 215]*.

Адзначым таксама, што ў тым жа 1338 г. вялікі князь смаленскі Іван Аляксандравіч, унук Глебаў, пацвердзіў дагавор з Рыгай *«по деда своего докончанью и по старым грамотам докончал есмь по тому докончанью како то брат мой старейший Кедименъ докончалъ и его дети Глебъ и Алкердъ...» [20. С. 69—70]*. Гэты запіс, па-першае, тлумачыць, чаму знікаюць смаленскія князі ў Полацку (перавага ВКЛ над ВКС тут відавочная), па-другое, красамоўна сведчыць аб палітычным хаўрусе ВКЛ і ВКС, які склаўся раней — недзе ў 20-я г. XIV ст., бо ўжо ў 1326 г. сярод паслоў Гедыміна ў Ноўгарад Вялікі згадваецца князь Фёдар Святаслававіч — сын князя мажайскага Святаслава Глебавіча, унук смаленскага князя Глеба Расціслававіча. Паводле расейскага даследніка В. Яніна, хаўрус гэты адкрываў Гедымінавічам шлях на княжацкія кармленні ў Наўгародскай зямлі, якія раней належалі смаленскім князям. Першым жа літоўскім князем у Ноўгарадзе Вялікім быў усё той жа Нарымонт Глеб Гедымінавіч *[52. С. 56—57]*!

З усяе сымболікі князёў тым ці іншым чынам звязаных са Смаленскам, Полацкам і Віцебскам звяртае на сябе ўвагу геральдызаваная выява лява, бо менавіта ў ёй была закладзена новая (заходняя) ідэя сымбалічнай прэзентацыі дзяржавы. Сама выява была вядома ў розных рускіх землях здаўна і карысталася вялікай папулярнасцю. Пра гэта сведчаць шматлікія помнікі матэрыяльнай культуры XII—XIII стст. Упершыню ж выява лява на шчыце фіксуецца ва Уладзіміра-Суздальскім княстве

ў 1234 г. на фасадзе царквы Святога Георгія ў Юр'еве Польскім. Расейскі даследнік А. Сілаеў лічыць нават, што гэты леў *«являет собой именно герб Владимирской державы» [36. С. 56—58]*, аднак гаварыць пра гербы на Русі ў першай палове XIII ст. заўчасна. Выява на шчыце была змешчана таксама на мініятуры з *«Фёдараўскага Евангелія»* (1321—1327), якое прыпісваецца яраслаўскаму князю Васілю Давыдавічу Грозныя Вочы, унуку ўжо вядомага нам смаленскага князя Фёдара Расціслававіча *[36. С. 72—73]*, што можа сведчыць пра спадчыннасць сымбалю.

Паводле ўкраінскага геральдыста Андрэя Грэчылы, выява лява пасля 1253 г. была ўведзена каралём Данілам Раманавічам і ў Галіцка-Валынскай дзяржаве *[37. S. 125]*. Праўда, на вядомых пячатках галіцка-валынскіх князёў леў фіксуецца пазней. Так, на пячатцы ананімнага князя, прывешанай да граматы з 1316 г., на яе галоўным баку стаіць рыцар з дзідай у левай руцэ, які правай рукой абапіраецца на тарчу, а на адваротным — выява *«...лява, скіраванага ўправа ад гледача» [38. Nr 6. S. 101—103]*. На другой пячатцы Юр'я, караля Русі і князя Уладзімірскага, прывешанай да актаў з 1316, 1325, 1327, 1334 і 1335 гг., на галоўным баку была выява караля на стальцы з каронай на галаве і з ляскай у правай руцэ, надпіс у атоку: *«+ S'[igillum] · DOMINI · GEORGI · REGIS · RUSIE»*, а на адваротным — рыцар збройны на кані са сцяжком у правай руцэ, левай рукой трымае *«...трохкутную тарчу з выявай лява»*, надпіс у атоку: *«+ S' · DOMINI · GEORGI · DUCIS · LADIMERIE» [38. Nr 7. S. 127—128]*. Даследнікі лічаць, што г. зв. ананімная пячатка магла належаць Ляву Юр'евічу, а другая — ягонаму бацьку Юрыю Львовічу *[38. Nr 6. S. 103; Nr 7. S. 129]*. Аднак, калі ўлічыць, што і першая, і другая пячаткі прывешаны разам да дакументу з 1316 г., а сам ён быў выдадзены ад імя Андрэя і Лява Юр'евічаў з-за іх малога ўзросту *[40. S. 250, заўвага 1025]*, то атрыбутацыя пячатак будзе іншая. Першая «*ананімная*» належала дзеду братоў князю Ляву Данілавічу († 1299/1300 г.) *[вядомы таксама згадкі пра яго пячатку з* ***«Зубам»*** *— княжацкім знакам-кляйном (62. С. 32)]*, а другая — іхнаму бацьку князю Юр'ю Львовічу († 1308 г.) *[38. Nr 6. S. 103]*. Пасля смерці апошніх Раманавічаў другая пячатка ад Андрэя перайшла ў спадчыну і выкарыстоўвалася галіцка-валынскім князем Баляславам Юр'ем Трайдзенавічам з мазавецкіх Пястаў *[38. Nr 6. S. 104]*. Пасля смерці апошняга без нашчадкаў Галіцка-Валынскае княства было падзелена паміж Польшчай, Венгрыяй і ВКЛ, пры гэтым выява лява выкарыстоўвалася на «*рускіх манетах*», бітых у Львове ў 50—70-я гг. XIV ст. польскімі і венгерскімі каралямі Казімерам Вялікім і Людвікам Андэгавенам, а таксама з 1372 г. — Уладзіславам Апольскім *[21. S. 204; 37. S. 124; 90. S. 230—231]*. Герб з выявай узнятага лява быў змешчаны і на маестатавай (тронай) пячатцы апошняга з тытулам князя Апольскага, Вялюньскага і Рускага (1372—1378) *[89]*.

З прыведзеных прыкладаў вынікае, што ў разгляданы час (канец XIII — другая палова XIV ст.) выява набывае такую рысу, як спадчыннасць. Ёй карыстаюцца прадстаўнікі ўладзіміра-суздальскіх, смаленска-полацкіх ці галіцка-валынскіх Рурыкавічаў, а пасля іх (у Галіцка-Валынскім княстве) — прадстаўнікі мазавецкіх і польскіх Пястаў ці венгерскіх Андэгавенаў. Спадчыннасць — адная з галоўных рысаў працэсу геральдызацыі або ператварэння пэўнай выявы ці эмблемы ў герб. Пакладзены на тарчу леў паступова ператвараецца ў сапраўдны (дынастычны, зямельны, дзяржаўны) герб Русі.

Характэрна тое, што ў другой палове — канцы XIV ст. выяву лява пачынаюць ужываць і тыя Гедымінавічы, якія асядаюць на Русі. Першым гэта зрабіў луцкі князь Любарт Дзмітры Гедымінавіч (каля 1366 г.) *[49. S. 255, fig. 305]*. Як можна меркаваць, выява лява, які ідзе, на ягонай пячатцы сымбалічна падкрэслівала пераемнасць улады з галіцка-валынскімі Рурыкавічамі і замацоўвала правы на луцка-ўладзімірскую частку Галіцка-Валынскага княства. Гэта сведчыць пра тое, што леў дакладна ўспрымаўся

ў той час як дынастычна-зямельны і дзяржаўны сымбаль.

З пачатку 80-х гг. XIV ст. выява вядома як дзяржаўны сымбаль Полацка. Звязана гэта было са спробай абвяшчэння Вялікага Княства Рускага з цэнтрам у Полацку ці, дакладней, Вялікага Княства Полацкага (ВКП). Ідэя стварэння апошняга належала князю Андрэю Альгердавічу *[не маюць рацыі тыя беларускія даследнікі, якія гавораць аб прэтэнзіях князя Андрэя Альгердавіча на сталец ВКЛ (30. С. 126; 35. С. 77). Больш блізкім да ісціны быў М. Ермаловіч (72. С. 72). На наш погляд, як рэалізацыю ідэі ВКП трэба разглядаць існаванне ў 1432—1435 гг. Вялікага Княства Рускага з цэнтрам у Полацку (35. С. 96—99)]*. Першы раз ён згадваецца ў 1342 г., калі бацька па просьбе пскавічоў пасадзіў яго служылым князем у Пскове *[39. S. 67]*. З 1349 па 1387 г. ён быў князем полацкім. Дзейнасць яго на полацкім пасадзе можна падзяліць на два этапы — да смерці бацькі ў 1377 г. і пасля яе. На першым этапе ў 1349—1377 г., як служылы полацкі князь, Андрэй дзейнічаў у рамках палітыкі бацькі — вялікага князя літоўскага Альгерда. Пасля яго смерці і прыходу да ўлады ў ВКЛ зводнага брата Ягайлы Якава, князь Андрэй Альгердавіч не падпарадкаваўся яму, а зрабіў спробу ператварыць Полацк у самастойнае Вялікае княства. Пра гэта сведчыць выкарыстанне ім і ягонай жонкай у 80-я г. XIV ст. тытулу вялікага князя *[**«Се аз княз велики Андрей Олгердович полоцко...»** (1381) (29. С. 43, № 6), **«ПЕЧ[а]ТЬ КНЯГИНИ ВЕЛИКО[й] АНЬДРЕЕВЪ ОЛ...»** (1387—1389) (55. С. 133, № 2). На полацкім Евангеллі XII ст. з троіцкага манастыра: **«А се яз великий князь Андреи Полацкии...»** (75. С. 97). А ў ленній грамаце лівонскаму магістру ад 9 кастрычніка 1385 г. гаворыцца аб Полацкім каралеўстве (29. С. 45, № 8)]*, незалежная замежная палітыка, біццё ўласнай манеты.

Манеты вялікага князя Андрэя Альгердавіча Полацкага мелі на аверсе княжацкае кляйно накшталт літары *«Ю»*, а на рэверсе — лява, які ідзе, з ліліяй над ім *[42. P. 25, Nr 21:21; 21. S. 139, 145] [доўгі час гэтыя манеты былі або не атрыбутаваны (47. С. 20), або прыпісваліся смаленскаму князю Юрыю Святаслававічу (43. P. 29; 44. S. 160—161, заўвага 80). Апошняе рабілася на падставе таго, што клейнавы знак разумелі як кірылічную літару **«Ю» — «Юры»**, а адсюль выводзілі імя Юрыя Святаслававіча. У спалучэнні з пададзеным вышэй фактам выкарыстання Фёдарам Расціслававічам на сваёй пячатцы выявы лява падобная інтэрпрэтацыя рабіла згаданыя манеты смаленскімі. Праўда, польскі даследнік Р. Керсноўскі, які ў цэлым падтрымаў такое меркаванне, тым не менш, адзначыў: **«Pogląd ten wódaje się trafny, chociaż i on nie wzjaśnia, dlaczego książę smoleński bił monetę różniącą się tak bardzo od typowych w tym czasie monet ruskich, i to zarówno pod względem ich stempli, jak też techniki menniczej oraz wagi»** (44. S. 161). Думаецца, Юры Святаслававіч не мог біць сваю манету ў Смаленску ўвогуле. Бо першы раз ён стаў смаленскім князем пасля разгрому смаленцаў на рацэ Вехры і смерці бацькі ў 1386 г., дзякуючы вялікаму князю Скіргайлу, які **«пасадзіў яго на вялікім княжанні смаленскім, бо дачка старэйшай сястры Скіргайлавай была замужам за князем Юрыем»** (23. С. 108). У тым жа годзе 20 траўня Юры Святаслававіч склаў прысягу на вернасць каралю польскаму Ўладзіславу Ягайлу і вялікаму князю літоўскаму Скіргайлу, а 16 верасня падпісаў з імі саюз (45. S. 460). І хоць ён захаваў тытул **«Мы Юрьи Святьславичь кнзь великий Смоленьский...»** (20. С. 72), першыя ж спробы праводзіць нейкую самастойную палітыку прывялі да зняцця яго ў 1394 г. са смаленскага пасаду і пераводу ў Рослаўль. У 1401 г. Юры пры дапамозе цесця Алега Іванавіча Разанскага захапіў Смаленск і другі раз стаў там князем, але пратрымаўся, пад сталым ціскам Вітаўта, толькі тры гады. У 1404 г. Вялікае Княства Смаленскае было зноў далучана да ВКЛ (45. S. 460). Увесь час Юры дзейнічае не як самастойны гаспадар, а як князь, залежны або ад князя Скіргайлы Івана, або ад вялікага князя разанскага Алега, таму ён не мог біць манету ні ў 1386—1394, ні ў 1401—1404 г. У сваю чаргу характэрна, што менавіта Скіргайла біў сваю манету з лявом (гл. ніжэй), у той час як Алег Разанскі карыстаўся джучыдскімі дырхемамі, якія ён толькі пазначаў сваім княжацкім знакам (59. С. 99, табл. IV, 16:16)]*. Кляйно *«Ю»* з'яўлялася ўласным княжацкім знакам Андрэя Альгердавіча *[смаленскія Рурыкавічы карысталіся зусім іншымі клейнамі. Так, на пячатцы брата Юрыя Святаслававіча князя Івана, дзяржаўцы порхаўскага ў 1412—1442 г. (45. S. 391—392), прывешанай да акту з 1422 г., была выява знаку*

накшталт літары ***«Ж»*** *(46. S. 78, Nr 87). У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці не належала пломба з Віцебска, дзе на адным баку быў падобны клейнавы знак накшталт літары* ***«Ж»****, а на другім — выява Святога Пятра (16. С. 514; 13. Табл. 1, № 14), іхнаму бацьку, вялікаму князю смаленскаму Святаславу Іванавічу (1359—1386)?]*. Даволі блізкую аналогію з ім мае асабістае кляйно князя Івана Андрэевіча на пячатцы з дакументу 1431 г.: два колы, злучаныя пасярэдзіне крыжам *[41. S. 697, tabl. II, Nr 12]*. Як *«унука Альгерда»* яго можна атаясаміць толькі з сынам Андрэя Полацкага Іванам, намеснікам пскоўскім у 1389—1399 гг. († пасля 1437 г.) *[39. S. 73; 45. S. 336] [зазначу, што род Андрэя Альгердавіча заслугоўвае сур'ёзнага генеалагічнага даследавання. Выснову Ю. Вольфа пра тое, што ён згас на сынах Міхайле († 1385 г.), Сямёне († 1387 г.), Іване († пасля 1437 г.) і ўнуку Аляксандру Іванавічу († 1442 г.) (45. S. 336), апошнім часам паставіў пад сумнеў Я. Тэнгоўскі (39. S. 73)]*. Цікава, што ў час намесніцтва ягонага сына Аляксандра (1439—1442), у Пскове б'юцца манеты з лявом на рэверсе. Пазней ён ператворыцца ў барса — дзяржаўную эмблему *«Гаспадарства Пскоўскага» [33. С. 101, табл. XIV, мал. 2]*.

Характэрным ёсць спалучэнне на рэверсе полацкае манеты лява з геральдычнай ліліяй. Апошняя не выпадковая выява, бо пазней паўтараецца на двух тыпах манет,

якія вялікі князь літоўскі Вітаўт біў для Полацка й Смаленска пасля іх далучэння да ВКЛ (гл. ніжэй). Я. Іванаўскас і Р. Дачыс звязваюць выяву ліліі ў полацкай эмблеме з сымбалем Святое Марыі *[42. P. 24—25]*. Паводле ж З. Пеха *«...jest to symbol na tyle wieloznaczny, że zaproponowana interpretacja budzi poważne wątpliwości, zwłaszcza, gdy uwzględnimy mięsce umieszczenia lilii» [21. S. 145]*. Сумневы знікаюць, калі бачыць у выяве з манеты князя Андрэя Альгердавіча спалучэнне зямельнае сымболікі Русі з выявай Багародзіцы, якая вышэй адзначана на пячатках полацкіх епіскапаў. Толькі апошняя падавалася ў выглядзе ліліі над лявом *[як гіпотэзу можам выказаць думку, што лілія магла быць запазычана яшчэ полацкімі князямі са сфрагістыкі заходнепаморскіх князёў. Адметна, што лілію ўжывалі на сваіх пячатках князі Казімер I († 1180 г.) і ягоны пляменнік Казімер II († 1219/1220 г.) (50. S. 154). Праз Святохну, дачку Казімера I (51. S. 219—220), і ейнага сына Уладзіміра лілія магла ўвайсці ў сымбалі полацкіх князёў. У сваю чаргу, леў тады цалкам мог быць запазычаны з геральдыкі дацкіх каралёў, з якімі ў Рагвалодавічаў менавіта ў другой палове XII — пачатку XIII ст. былі шчыльныя дынастычныя сувязі (71. С. 12). На гэта ўказваюць падобныя геральдычныя рысы, толькі ў адрозненне ад дацкіх манархаў, у гербе якіх былі тры лявы ці леапарды ў пас, Рагвалодавічы пакінулі аднаго]*. Магчыма і яшчэ адное тлумачэнне ліліі — геральдычнае. Яна была ўведзена, каб адрозніць полацкага лява ад смаленскага, бо ў геральдыцы не магло быць цалкам ідэнтычных выяваў. Пра гэта сведчаць пячаткі з лявом Ноўгарада Вялікага з граматаў 1426 і 1461 г. На першай з іх пад галавой лява змешчаны крыж *[А. Лакіер патлумачыў яго так: «между головой и шеей видна верёвка в виде узды» (33. С. 99). Наўрад ці з гэтым можна пагадзіцца. Хутчэй за ўсё, наўгародскі леў павінен быў трымаць крыж або меч у лапе]*, а на другой — над лявом — дзве васьмікутныя зорачкі *[33. С. 99, табл. XII, мал. 8—9]*. Дадатковыя элементы адрознівалі наўгародскага лява *(«лютого зверя»)* ад полацкага і смаленскага.

На думку літоўскага й амерыканскага даследнікаў Я. Іванаўскаса і Р. Дачыса, полацкую манету князь Андрэй Альгердавіч біў у 1398—1399 гг. *[42. P. 25]*. Аднак факты ягонай палітычнай біяграфіі прымушаюць усумніцца ў гэтым. У 1387 г. Андрэй трапляе ў палон да караля Ўладзіслава Ягайлы *[паводле Пскоўскага летапісу:* ***«...князя Андрея Олгердовича князь Скиригаило, брат его, поима перелестию в Полот-***

ске» *(53. С. 29)]*, у якога ён знаходзіўся ў зняволенні ў замку Хэнціны (Польшча) да 1394 г. У тым жа годзе ён быў вызвалены і згадваецца ў Ноўгарадзе Вялікім як пскоўскі князь *[пскоўскі летапісец запісаў:* ***«Того же месяца [липеня 1394 г.] князь велики Ондрей и Олгердович приехал из Литвы от братья, из нятвы, въ 18 день»*** *(53. С. 107)*. *А ў Наўгародскім летапісе адзначана:* ***«Прииха князь Андрей со пьсковьскыми послы...»*** *(54. С. 387)]*, а ў 1399 г. — гіне ў бітве на рацэ Ворскла *[39. S. 69—70]*. Ясна, што ў часы кіравання вялікага князя літоўскага Вітаўта (з 1394 па 1399 г.) ніякай манеты ў Полацку Андрэй Альгердавіч біць не мог, бо ўжо ў 1396 г. там сядзеў Вітаўтаў намеснік Манцігірд *[55. С. 136; 61. S. 78]*. Таму застаецца перыяд з 1377 па 1387 г., дакладней — з 1381 г., калі князь Андрэй Альгердавіч імкнуўся захаваць самастойнасць Полацку ў хаўрусе з Масквой, Смаленскам і Лівонскім ордэнам.

Варта адзначыць, што 23 красавіка 1387 г. Полацкае й Менскае княствы разам з Троцкім былі нададзены Уладзіславам Ягайлам брату Скіргайлу Івану *[29. С. 50—51, № 10]*. 18 чэрвеня таго ж году ў Лідзе Скіргайла Іван, князь літоўскі, пан троцкі й полацкі, выдаў свой дакумент, да якога прывесіў уласную пячатку з выявай збройнага рыцара на кані з дзідай у правай руцэ і тарчай — у левай. На тарчы ж быў змешчаны ўзняты леў *[48. S. 14, Nr 18; 56. С. 239, мал. 2]*. Ён жа біў сваю манету, дзе на аверсе быў ягоны ўласны клейнавы знак — крыж *[на найстарэйшай пячатцы Скіргайлы Івана, прывешанай да дакументу з 1380 г., быў змешчаны просты (геральдычны?) крыж, які М. Гумоўскі памылкова назваў крыжам Святога Андрэя (41. S. 713, tabl. III, 24)]*, а на рэверсе — леў улева з выгнутай назад галавой *[42. P. 30, Nr 20:20; 59. С. 100, табл. IV, мал. 17:17]*. Я. Іванаўскас і Р. Дачыс лічаць, што, будучы намеснікам караля Уладзіслава Ягайлы ў ВКЛ і князем у Троках і Полацку, Скіргайла не мог біць сваю манету, а таму згаданы экземпляр паходзіў з 1395—1397 гг., калі ён быў князем у Кіеве *[42. P. 25; 56. P. 36]*. Нельга з гэтым пагадзіцца, бо даказана, што, па-першае, статус Скіргайлы Івана ў ВКЛ быў даволі высокі і дазваляў яму мець такую прэрагатыву, як біццё манеты, па-другое, ён памёр у 1394 г. *[39. S. 103; 58. S. 126—127]*. У сувязі з гэтым, трэба прызнаць, што манета з лявом білася ім у прамежак з 1387 па 1394 г., менавіта тады, калі ён з'яўляўся і князем полацкім, бо згаданая выява магла адносіцца толькі да Полацка (Русі). Пра гэта сведчыць той факт, што, калі ў 1394 г. Полацк адышоў ад Скіргайлы Івана, была зменена і пячатка. Да дакументу ад 18 лютага 1394 г., дзе ён разам з братамі бярэ на парукі Андрэя Полацкага, была прывешана новая ягоная пячатка, на якой быў вершнік з дзідай-сцяжком і тарчай. На сцяжку быў змешчаны просты крыж — уласны знак князя, а на тарчы — замест лява — падвойны крыж Ягайлы *[41. S. 713—714; 56. С. 240—241, мал. 3; 4:3]*. Важна, што ўлада Скіргайлы Івана пасля 1387 г. распаўсюджвалася і на Менскае княства. У свой час (1349) з апошняга было вылучана для былога вялікага князя літоўскага Яўнута Івана Гедымінавіча Заслаўе *[30. С. 94]*. На пячатцы з дакументаў 1386 і 1398 г. ягонага сына князя Міхайлы Яўнутавіча Заслаўскага была выява: *«...lwa wspiętego z podniesionemi 2 łapami...» [41. S. 708]*. Такім чынам, леў фіксуецца на пячатках і манетах Гедымінавічаў, звязаных непасрэдна з Полацкай (Менскай, Заслаўскай) зямлёй.

Звернем увагу таксама на тое, што і польскі кароль Уладзіслаў II Ягайла карыстаўся гербам Русі (той яе часткі, якая ўваходзіла ў склад Польскага каралеўства), толькі ў адрозненне ад лява Скіргайлы, той леў уздымаўся на скалу. На яго ж *«рускай манеце»*, якая білася ў Львове ў 1388—1394, 1394—1400 і 1401—1414 гг., быў проста ўзняты леў *[21. S. 45, 122, 205—206; 90. S. 231]*. Адначасова, як найвышэйшы князь літоўскі і рускі, Ягайла біў манету для рускіх земляў ВКЛ з выявай лява *[42. P. 15, Nr 1:1, 2:2; 21. S. 137—138, 139—141]*. Я. Іванаўскас і Р. Дачыс датуюць яе 1386 г., аднак так званая *«пляцёнка»* над лявом сведчыць пра выраб такой манеты хутчэй пасля трагічнай бітвы з татарамі на рацэ Ворскла ў 1399 г.

У гэты ж самы час (1389—1425) выява лява *(«барса»)* з *«пляцёнкамі»* выкарыстоўваецца на манетах вялікага князя маскоўскага Васіля Дзмітравіча, што расейскі даследнік Г. Фёдараў-Давыдаў звязвае з яго *«общерусскими притязаниями» [63. С. 37—39, № 178—190; с. 134]*. Хутчэй за ўсё, лява трэба звязваць з яго агульнарускім характарам, бо *«пляцёнкі»* сведчаць як раз аб татарскіх прэтэнзіях на ўсю Русь — як Літоўскую, так і Маскоўскую. Сапраўды, выкарыстанне лява ў розных варыянтах у Галіцка-Валынскім княстве, Смаленску, Полацку, Ноўгарадзе Вялікім, Пскове, Маскве сведчыць, што ён з'яўляўся ў другой палове XIV — першай палове XV ст. агульнапрынятым сымбалем Русі.

Яшчэ больш яскрава гэта пацвярджаюць манеты, якія біў для Полацка і Смаленска вялікі князь літоўскі Вітаўт Аляксандр. Першая з іх захоўвала на рэверсе выяву лява з ліліяй, а на аверсе — замест знаку Андрэя Альгердавіча — Вітаўтавы *Калюмны*. Другая на аверсе мела тыя ж *Калюмны*, а на рэверсе — два лявы, якія тут геральдычна правільна падаюцца як леапарды, адзін над другім, пры гэтым над верхнім зноў была змешчана лілія *[42. P. 24, Nr 15:15, 16:16; 21. S. 144—145]*. Паводле Я. Іванаўскаса і Р. Дачыса яны біліся ў 1399—1401 і 1398—1399 гг. адпаведна. Аднак першая манета Вітаўта ўяўляла сабой перабітую яго знакам полацкую манету Андрэя Альгердавіча, пра што сведчаць іх ідэнтычныя рэверсы. У сувязі з гэтым, яна магла прадукавацца і раней — у 1394—1396 гг. У 1396 г. *«князь литовскои Витовътъ Кестоуитьевичь взя Смоленескъ перелестью, и наместники посади» [53. С. 108]*. У гэты час (1396—1399) была выпушчана другая манета з двума леапардамі, бо відавочна, што выява на ёй утварылася шляхам спалучэння полацкага і смаленскага лявоў. Пасля паразы на рацэ Ворскла Вітаўт, як і Ягайла, вымушаны быў біць манеты з *«пляцёнкай»* над лявом *[42. P. 23, Nr 12:12, 13:13]*. Пасля гэтага Вітаўт ужо не вяртаецца да лявоў ці леапардаў: на манетах бітых для Полацка з 1401 г. на аверсе захоўваюцца *Калюмны*, а на рэверсе змяшчаецца вершнік з ліліямі над і пад ім *[42. P. 23, Nr 14:14; 21. S. 144] [у сваім меркаванні пра тое, што гэтая манета білася для Полацка мы зыходзім з ідэнтычнага спосабу выканання* ***Калюмнаў*** *на ўсіх полацкіх і полацка-смаленскіх манетах (на гэта першы звярнуў увагу З. Пех [21. S. 145]), а таксама — з факту спалучэння ліліяў з вершнікам* ***(Пагоняй)****. У сувязі з гэтым, трэба адзначыць, што* ***Калюмны*** *як* ***Печать Полоцкая*** *на вялікай пячатцы Івана Грознага з 1577 г. з'явіліся менавіта дзякуючы выкарыстанню іх на старых полацкіх манетах, а не толькі на манетах апошніх Ягайлавічаў — Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста, як мяркуе польскі даследнік Г. Граля (81. S. 129—130)]*. З аднаго боку, гэта было звязана з цэнтралізатарскімі памкненнямі Вітаўта і уніфікацыяй выяваў на манетах у рамках яго грашовай рэформы ў ВКЛ. З іншага боку, страта Смаленска пасля 1399 г. прывяла да таго, што для яго быў створаны асобны новы герб з выявай мядзведзя, які ідзе. Упершыню такі герб Смаленска фіксуецца на гербавай пячатцы Вітаўта з 1401 г. *[21. S. 93—94]*. Спачатку гэта герб-прэтэнзія, бо Смаленск быў вернуты ў склад ВКЛ толькі ў 1404 г.: *«...переветнице предаша град Смолнескъ князю Витовту Литовъскому» [54. С. 398]*. Чаму менавіта выява мядзведзя абрана ў якасці смаленскага сымбалю — цяжка сказаць. Але, безумоўна, такі рэзкі адыход ад традыцыйнай *«рускай»* эмблемы лява быў выкліканы важкімі прычынамі. На нашу думку, тут пэўную ролю згуляў як татарскі фактар, так і тое, што лява выкарыстоўваў палітычны канкурэнт Вітаўта — ягоны зяць вялікі князь Васіль Дзмітравіч Маскоўскі. У такой сітуацыі выбар мясцовага *«цара лясоў»* у якасці новай *«рускай»* (у згаданым выпадку — смаленскай) выявы было для Вітаўтавых герольдаў справай тэхнічнай *[выкажам гіпотэзу, што выява мядзведзя была падказана герольдам Вітаўта падабенствам двух лацінскіх словаў:* ***«Russia»*** *і* ***«Ursus»*** *(мядзведзь) ці* ***«Ursa»*** *(мядзведзіца)]*. Аднак галоўнай прычынай адмовы ад лявоў была страта як Полацкам (ВКП), так і

Смаленскам (ВКС) сваёй самастойнасці і іх уваход у склад ВКЛ. У сувязі з гэтым, выснова польскага даследніка З. Пеха, што: *«Пасля згаданага адносна кароткага нумізматычнага эпізоду, леў знікае са складу патэнцыйных сымбаляў улады»* вялікіх князёў літоўскіх *[21. S. 145]*, не зусім дакладная. Леў ці леапард у ВКЛ для Вітаўта не з'яўляўся *«патэнцыйным»* сымбалем, а наадварот — ад яго ён імкнуўся пазбавіцца ці лепей — замяніць, што ў рэшце рэшт і было зроблена.

Пра гэта сведчыць полацкая пячатка, якую беспадстаўна лічаць найбольш старажытнай гарадской пячаткай. Упершыню яна фіксуецца на дакуменце 1396 г. (на першым месцы!), да якога была прыкладзена разам з пячаткай Вітаўтавага полацкага намесніка Манцігірда. Яна не мела ніякіх выяваў, а толькі вербальную формулу: *«ПЕЧАТЬ ПОЛОЦЬКАЯ И С[ве]ТОЕ СОФЬИ» [55. С. 136, 139—140,*

мал. 4, 11]. Праўдападобна, гэта была менавіта полацкая дзяржаўная пячатка, а не пячатка гораду *[гарадская пячатка была б з надпісам:* ***«Печать Полоцка»*** *або* ***«Печать города (места) Полоцкого»****. Ды і на сапраўднай гарадской пячатцы не было б сэнсу пазначаць:* ***«Святой Софии»****. Затое на дзяржаўнай пячатцы лагічна было змяшчэнне поўнай назвы Полацкай дзяржавы — Дому Святой Сафіі. Характэрнай ёсць і найбольш старажытная гарадская пячатка Віцебска. На ёй былі словы:* ***«+ ПЕЧАТЬ ВИТЕБЬСКАЯ ВСЕГО ГОРОДА»*** *(91. С. 264)]*. Спалучэнне словаў *«пячатка полацкая»* і *«Святой Сафіі»* адпавядала спалучэнню лява і ліліі на манетах. У такой форме яна пратрымалася ва ўжыванні даволі доўга — па канец XV ст., а ў 70-я гг. гэтага ж стагоддзя нават абнаўлялася *[55. С. 141]*. Няма сумневу, што ў такой форме палачане імкнуліся падкрэсліць сваю былую самастойнасць і аўтаномнасць у ВКЛ. Апошняя забяспечвалася спецыяльным земскім прывілеем, атрыманым ад Вітаўта *[92. S. 5—6]*.

Больш адметна гэта відаць на пячатках полацкіх епіскапаў, роля якіх у Полацку ў канцы XIV — пачатку XV ст. пры вялікакняжацкіх намесніках істотна знізілася *[55. С. 141]*. Нягледзячы на новы архіепіскапскі тытул (з 1392 г.) рэальны палітычны статус полацкіх епіскапаў упаў, што знайшло адлюстраванне ў іх сфрагістыцы. Так, на пячатцы Сямёна Старога з 40-х гг. XV ст. замест выявы Багародзіцы *Знаменіе* быў змешчаны надпіс: *«М[и]Л[ос]ТЬЮ Б[о]ЖІЕЮ СЕМИОНЪ ВЛАДЫКА ПОЛОЧЬКИІ» [55. С. 142, мал. 14]*. Толькі архіепіскап Каліст паспрабаваў аднавіць былы ўплыў. У 1459 г. ён, як піша А. Харашкевіч: *«выступил в качестве равноправной с полоцким наместником и "поспольством" силы. Вместе с ними ... снабдил полоцких послов в Ригу ... своей верительной грамотой» [55. С. 141]*. На ягоных пячатках з 1458—1459 гг. таксама не было Багародзіцы, але быў змешчаны надпіс, які паўтараў формулу з пячатак полацкіх епіскапаў часоў незалежнасці: *«М[и]Л[ос]ТЬЕЮ Б[о]ЖЬЕЮ КАЛИСТЬ ЕП[иско]ПЪ ПОЛОЧКИІ» [55. С. 142, мал. 15]*. Такая палітычная актыўнасць і амбіцыі Каліста былі заўважаны — ён быў заменены Сямёнам, які рэзка змяніў тып сваёй пячаткі. У цэнтры яе была змешчана манаграма яго імя *«СЕМІОН»* і надпіс у атоку: *«+ М[и]Л[ос]ТЬЮ Б[о]ЖЬЕЮ ВЛ[а]Д[ы]КА ПОЛ[о]ЧКІ» [55. С. 142, мал. 16; 66. С. 29—30, фота 11]*. Нельга пагадзіцца з А. Харашкевіч, што змена тыпу пячаткі была выклікана толькі жаданнем Сямёна адрозніць яе ад пячаткі Сямёна Старога *[55. С. 142]*. Насамрэч гэта быў вынік паразы палітычнай праграмы полацкага архіепіскапа-*«сепаратыста»* Каліста ў дачыненнях з цэнтральнымі ўладамі ВКЛ *[полацкім намеснікам у 1458—1459 г. быў Пётр Манцігірдавіч (55. С. 138; 63. S. 91). Магчыма, ён спрыяў полацкаму архіепіскапу Калісту, што прывяло да замены яго Алехнам Судзімонтавічам, які* ***«był bliski»*** *вялікаму князю літоўскаму Казімеру Ягайлавічу (63. S. 99). Пэўна тое, што Алехна ў Полацку замацаваў пазіцыі цэнтральнай улады]*.

Такім чынам, пачынаючы з канца XIV па канец XV ст. у новых палітычных умовах, калі ў Полацку з'яўляюцца намеснікі Вітаўта, выява лява і ліліі набывае вербальную форму, а пазней — у пачатку XVI ст. з утварэннем Полацкага ваяводства — саступае месца новым сымбалям *[гербам Полацкага ваяводства ВКЛ, якое было створана ў пачатку XVI ст., быў залаты алень, які ідзе ў чырвоным полі (64. С. 63). Колеры дадзены паводле: (76. S. 238)]*.

У сувязі з гэтым, лявы маглі выкарыстоўвацца толькі ў якасці сымбаляў *«апазіцыйных»* вялікаму князю Вітаўту.

Менавіта ў такім кантэксце трэба разглядаць іх з'яўленне ў *«Хроніцы Канстанцкага сабору 1414—1418 гг.»*, якая была напісана Ульрыхам Рыхенталем у 20-я гг. XV ст. Гэтая крыніца адлюстравала завяршэнне працэсу геральдызацыі лявоў або іх ператварэння ў герб: тарча падзелена на дзве часткі, у верхняй залатой — блакітны леў, у ніжняй блакітнай — залаты леў *[67. S. 137] [на жаль, як арыгінал* ***«Хронікі Канстанцкага сабору 1414—1418 гг.»****, так і яе факсімільнае выданне нам у Горадні засталося недаступнае, таму тут мы падаем расфарбаваны малюнак з працы Ф. Пекасіньскага]*. Надпіс: *«Von dem durchleuchti, fursten herczog R(F)odur von Schmolenczgei in rotten Reussen»* сведчыў, што з такім гербам прыбыў у Канстанц Фёдар Юр'евіч *«са Смаленска ў чырвонай Русі» [68. С. 52]*. Быў гэта сын ужо вядомага нам смаленскага князя Юр'я Святаслававіча *[60. С. 78; 68. С. 52]*. Ён прыехаў на сабор у Канстанц з Ноўгарада, дзе да 1412 г. быў служылым князем. Пры гэтым ягоны ад'езд на Захад быў выкліканы пагрозай Вітаўта распачаць вайну з Ноўгарадам, бо сярод прэтэнзій вялікага князя літоўскага да апошняга было тое, што: *«нашего ворога Юрьева Святославлича сына Федора приняле есте» [54. С. 404]*. У выніку, як піша наўгародскі летапісец: *«И князь Федоръ рече новгородцомъ: "о мне с Витовтом нелюбья не держите"; отъиха в Немце» [54. С. 404]*. Важна, што спачатку князь Фёдар Юр'евіч падаў як свой герб менавіта Вітаўтавых полацка-смаленскіх лявоў, што сведчыла пра яго прэтэнзіі на страчаную *«чырвоную Русь»*. Аднак прысутнасць у Канстанцы паслоў Вітаўта і найперш таямнічага князя Паўла *[паводле* ***«Хронікі»****:* ***«herczog Pauls von rechten Reussen ist vnde herczog Wittolten»*** *карыстаўся гербам: у блакітным полі палова срэбнага лява, якая выходзіць з чырвонага полымя (67. S. 136). Асоба не ідэнтыфікавана]* прымусіла яго адмовіцца ад згаданай вышэй сымболікі і тутулу. Герольдамі імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонта для Фёдара быў створаны адмысловы новы герб: тарча падзелена на чатыры часткі. У першай і чацвёртай у чырвоным полі — срэбны геральдычны крыж; у другой і трэцяй — у блакітным полі задняя палова залатога лява, на якой сядзіць срэбны арол, што дзяўбе яго крывавыя вантробы. Быў удакладнены і тытул: *«herczog Fedur von weisen Reussen vnnd herr czu Schmolenczgi» [67. S. 142; 74. S. 57]*. Як лічыць А. Белы, князь Фёдар быў у Канстанцы прадстаўніком ад *«белай Русі»* (Ноўгарада) і Смаленска *[68. С. 53]*. Аднак лепш яго назваць толькі прэтэндэнтам на гэтыя землі, пра што сведчыў ягоны новы герб. Геральдычны крыж (крыж Святога Юр'я) у 1-й і 4-й частках быў гербам Ноўгарада Вялікага *(«белай Русі»)*. Упершыню ў такой якасці ён фіксуецца на пячатцы Вітаўта з 1401 г. *[у брусэльскім гербоўніку* ***«Armorial Lyncenich»*** *з першай паловы XV ст. ён падпісаны:* ***«nowengrote»****, у той час як смаленскі мядзведзь —* ***«smollenghe»*** *(73. S. 115, tabl. XV, Nr 83, 85; 74. S. 56)]*. Палова лява з арлом у 2-й і 3-й частках даволі яскрава сымбалізуе трагічны лёс Фёдара як смаленскага князя: Смаленск адабраны драпежным арлом (Уладзіславам II Ягайлам і Вітаўтам). Пазней гэтая выява ператворыцца ў гармату з райскай птушкай. Апошнія замацуюцца ў якасці смаленскага герба ў Расіі *[60. С. 90]*.



Для нас асабліва важныя пададзеныя ў *«Хроніцы»* колеры полацка-смаленскага герба: блакітны леў у залатым полі (полацкі) *[адсутнасць ліліі, якая павінна быць таксама, як і леў, блакітнай, можна растлумачыць карэкцыяй гербавай выявы як самым князем Фёдарам Юр'евічам, так і мастаком-ілюмінатарам* ***«Хронікі»****]* і

залаты леў у блакітным полі (смаленскі). Золата і блакіт — гэта сапраўдныя геральдычныя колеры сярэднявечнай Русі. Яны фіксуюцца і іншымі заходнімі гербоўнікамі першай паловы XV ст. Так, у брусэльскім гербоўніку *«Armorial Lyncenich»* герб Львоўскай зямлі *(«lemborch»)* выглядаў так: у блакітным полі залаты леў, які ўздымаецца на гору *[73. S. 114, tabl. XV, Nr 78; 74. S. 55]*. Аналагічны герб, а таксама варыянт: залаты леў у блакітным полі (герб Русі), змешчаны ў стакгольмскім *«Codex bergshammar»* і парыжскім *«Armorial de la Toison d'Or» [74. S. 50—53, 55; 77. S. 80, ryc. 12, Nr 4]*. Былі гэта гербы тых частак Русі (Галіцка-Валынскага княства), якія апынуліся пад уладай польскіх каралёў. Як адзначалася вышэй, з канца XIV ст. леў, які ўздымаецца на гору, з'яўляецца на маестатавай пячатцы польскага караля Уладзіслава II Ягайлы. Пазней *«рускі»* залаты леў у кароне ў блакітным полі (з гарой ці без яе) замацаваўся сярод зямельных і ваяводскіх гербаў Польскага каралеўства і Рэчы Паспалітай *[21. S. 56, 67, 70, 78; 74. S. 109, 113]*. Полацка-смаленскі ж герб быў забыты, а для аднайменных ваяводстваў у ВКЛ былі створаны новыя гербы, без

якой-небудзь сувязі з лявамі *[64. С. 59—64]*. Апошнія захаваліся толькі ў шляхоцкіх гербах нашчадкаў Яўнута Гедымінавіча або полацкіх і смаленскіх князёў: Заслаўскіх, Мсціслаўскіх, Друцкіх, Жыжамскіх ды ў гербах гарадоў ВКЛ: Слоніма, Ліды, Крынак і інш. *[33. С. 125; 78. S. 10; 79. С. 33; 80. Т. 10. S. 201—202; 91. С. 145, 177, 185, 207, 222, 233]*.

Такім чынам, сымболіка і геральдыка Полацкае дзяржавы ў X—XV стст. даволі разнастайная і багатая: на першым княжацкім этапе (X — пачатак XII ст.) сымбалямі Полацкага княства былі княжацкія трызубы і Святы Крыж (шасціканцовы); на другім — вечавым або рэспубліканскім (20-я XII — 70-я гг. XIV стст.) — сымбалем Полацкае рэспублікі была выява Багародзіцы; на трэцім — вялікакняжацкім (80-я гг. XIV ст.) — сымбалем Вялікага Княства Полацкага была выява лява з ліліяй над ім; нарэшце, на чацвёртым этапе — ужо баярска-намесніцкім (канец XIV — канец XV ст.) — сымбалем незалежнасці Полацка-Смаленскай зямлі быў герб з двума лявамі, зафіксаваны ў *«Хроніцы Канстанцкага сабору 1414—1418 гг.»*, заменены з уваходжаннем Полацку ў склад ВКЛ спачатку *Калюмнамі* і *Пагоняй*, а пасля ўтварэння Полацкага ваяводства — гербам з выявай аленя.

* * *

У сувязі з усім адзначаным вышэй, мяркую, што дзяржаўны герб сучаснай Беларускай Рэспублікі (дарэчы, чаму не Рэчы Паспалітай, бо так перакладаецца на беларускую мову *«res publica»*?) павінен выглядаць так: тарча падзелена на чатыры часткі, пры гэтым, 1-я і 4-я рассечаны яшчэ на дзве — у верхняй у залатым полі блакітны леў, у ніжняй — у блакітным полі — залаты леў, у 2-й і 3-й частках у чырвоным полі — срэбны вершнік з мечам і шчытом, на якім шасціканцовы крыж *(Пагоня)*. Над тарчай — карона Усяслава Вялікага. Адсутнасць белага колеру як адпаведніка Беларусі ў частках з лявамі не павінна засмучаць: тагачасная *«белая Русь»* карысталася зусім іншым гербам, ды і не прылічалася да нашае тэрыторыі. Няма ніякіх падставаў і для таго, каб змяніць колеры, як прапануе Алег Латышонак: *«...лявы маглі б быць сярэбраныя (белыя) у чырвоным полі. Пасавалі б да сцяга» [ліст да аўтара ад 01.07.2004 г.]*. Па-першае, гэта было б нязгодна з гістарычнай праўдай (і гэта — галоўнае). Па-другое, гэта будзе ўжо не геральдыка, бо можна заблытацца ў варыянтах. Сапраўды, а чаму б тады не пакласці двух чырвоных лявоў у срэбным полі? Па-трэцяе, у багатай на лявоў і леапардаў геральдыцы Заходняй Еўропы такія каляровыя варыянты напэўна выкарыстоўваліся, у той час як на нашых лявоў ніхто, здаецца, пакуль не прэтэндуе. Па-чацвёртае, белага колеру дастаткова ў нацыянальным сцягу, які з'явіўся якраз тады, калі назва Беларусь пашырылася на нашу этнічную тэрыторыю.

Думаю, варта абмеркаваць праблему ліліі: трэба яе далучаць у герб ці не? Калі зыходзіць з яе значэння і гістарычнага кантэксту, то згаданая геральдычная выява павінна быць вернута ў полацкі герб. Аднак магчымы і іншы падыход — пакінуць так, як ёсць. Іншай праблемай з'яўляюцца колеры поля шчыта і выявы шасціканцо-

вага крыжа ў *Пагоні*. Пакідаць срэбны шчыт з залатым крыжам нельга, бо гэта разбурае адно з галоўных правілаў геральдыкі, што забараняе накладваць метал на метал. У літоўцаў выкарыстоўваецца блакіт і золата. Аднак у часы Уладзіслава II Ягайлы фіксуюцца і залаты (або срэбны) падвойны крыж у чырвоным полі і чырвоны ў срэбным *[21. S. 246, 248—249]*. Важнымі з'яўляюцца таксама такія *«дробязі»*, як наяўнасць у каня вершніка *Пагоні* падковаў *[93. С. 14]*, рэканструкцыя тыпу кароны Усяслава ці колер языка, вачэй і капцюроў у лявоў. Апошняе стане магчымым пры вывучэнні арыгіналу *«Хронікі Канстанцкага сабору 1414—1418 гг.)»*.

ЗАЎВАГІ

1. Заканадаўчыя акты аб Дзяржаўнай сымболіцы Рэспублікі Беларусь. — Мн.: Беларусь, 1992. — 94 с.
2. Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі. — Мн.: Полымя, 1993. — 239 с.
3. Загарульскі Э. Заходняя Русь: IX—XIII стст. — Мн.: Універсітэцкае, 1998. — 240 с.
4. Piekosiński F. Rycerstwo Polskie wieków średnich. — Kraków, 1896. — T. 1. — 399 s.
5. Гломозда К., Яневський Д. Історичні гербові, відзнаки та прапорові барви України // Український історичний журнал. 1990. № 4. С. 43—55; № 5. С. 45—64.
6. Белямук М. Пячатка Усяслава Чарадзея // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 69—70.
7. Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. — Мн.: Навука і тэхніка, 1992. — 215 с.
8. Арлоў У. Таямніцы полацкай гісторыі. — Мн.: Беларусь, 1994. — 463 с.
9. Луцкевіч А. Беларускі Музей імя Івана Луцкевіча. Вільня, 1933: Перавыд. — Мн.: Беларускае КБТ «Адраджэнне», 1992. — 16 с.
10. Зайкоўскі Э. Крыж // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 1997. — Т. 4. — С. 272—273.
11. Ляўкоў Э. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны.
12. Цішкін І. Віслыя пячаткі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1986. № 4. С. 20.
13. Штыхаў Г. Сфрагістыка // БелСЭ. — Мн.: БелСЭ, 1974. — Т. 10. — С. 142—143, табл. 1—2.
14. Загорульский Э. Генеалогия полоцких князей Изяславичей. — Мн.: Изд-во «ВУЗ—ЮНИТИ», 1994. — 30 с.
15. «Пагоня» ў сэрцы тваім і маім: Зб. арт. / Склад. А. Цітоў. — Мн.: БВТ «Хата», 1995. — 23 с.
16. Штыхаў Г., Сінчук І. Пломба // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 1999. — Т. 5. — С. 514.
17. Пуцко В. Крыж Еўфрасіньні Полацкай і ўзьвіжальныя крыжы XII—XIII стст. // Полацак. 1992. № 4 (14). С. 12—17.
18. Арлоў У. Асветніца з роду Усяслава: Ефрасіння Полацкая. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 53 с.
19. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя. — Мн.: Бел. навука, 2003. — 1015 с.
20. Смоленские грамоты XIII—XIV вв. / Подгот. Т. А.Сумникова, В. В. Лопатин. — М.: Изд-во АН СССР, 1963. — 138 с.
21. Piech Z. Monety, pieczęcie i herby w systemie symboli władzy Jagiellonów. — Warszawa, 2003. — 365 s.
22. Тарасаў С. Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі. — Мн.: Навука і тэхніка, 1991. — 67 с.
23. Беларускія летапісы і хронікі. — Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. — 432 с.
24. Гісторыя Беларусі: У 6-ці т. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. — Мн.: Экаперспектыва, 2000. — Т. 1. — 351 с.
25. Генрих Латвийский. Хроника Ливонии / Введение, перевод и комментарии С. А. Аннинского, предисловие В. А. Быстрянского. — М., Л.: Изд-во АН СССР, 1938. — 2-е изд. — 351 с.
26. Ekdahl S. Die *«Banderia Prutenorum»* des Jan Długosz — eine Quelle zur Schlacht bei Tannenberg 1410. — Göttingen, 1976. — 315 s.
27. Варонін В. Якаў // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 2003. — Т. 6. — Кн. II. — 612 с.
28. Варонін В. Полаччына і палачане ў нацыянальна-культурным і рэлігійным жыцці Вялікага княства Літоўскага першай паловы XVI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — Białystok, 2002. — S. 211—219.
29. Хорошкевич А. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI в.: В 5-ти т. — М., 1977. — Т. 1. — 227 с.
30. Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. — Мн.: Полымя, 1993. — 160 с.
31. Сагановіч Г. Полацк і нямецкая калонія на Дзвіне // Беларускі гістарычны агляд. Менск, 1998. Т. 5. Сш.1 (8). С. 3—25.
32. Левко О. Торговые связи Витебска в X—XVIII вв. — Мн.: Наука и техника, 1989. — 87 с.
33. Лакиер А. Русская геральдика. — М.: Книга, 1990. — 432 с.
34. Белямук М. Эмблема на шчыце герба «Пагоня» // Полацак. — Кліўленд, 1992. № 1 (11). С. 14—18; № 2 (12). С. 28—30; № 3 (13). С. 28—31; № 4 (14). С. 18—22; № 6 (16). С. 22—26.
35. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. — Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. — 412 с.
36. Силаев А. Истоки русской геральдики. — М.: ФАИР—ПРЕСС, 2002. — 240 с.
37. Grechylo A. Eagle and Lion in the heraldry of the Galician-Volhynian State (13th—14th centuries) // L'Ŕigie et le Lion. Dans le Blason médiéval et moderne. Actes du Ixe colloque international d'héraldique. Cracovie, 4—8 septembre 1995 édites par S.K.Kuczyński, A.I.H. — Warszawa, 1997. — S. 123—126.
38. Barwiński B. Pieczęcie książąt halicko-włodzimierskich z pierwszej połowy XIV wieku // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. — Nr 6. — S. 99—104; Nr 7. — S. 127—130.
39. Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. — Poznań — Wrocław, 1999. — 319 s.
40. Dąbrowski D. Rodowód Romanowiczów książąt halicko-wołyńskich. — Poznań — Wrocław, 2002. — 347 s.
41. Gumowski M. Pieczęcie książąt litewskich // Ateneum Wileńskie. — Wilno, 1930. — R. VII. — Zeszyt 3—4. — S. 684—725.
42. Ivanauskas E., Douchis R. Coins of Lithuania. 1385—1707. — Vilnius — Columbia, 1999. — 271 p.
43. Sajauskas S., Kaubrys D. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes numizmatika. Katalogas. — Vilnius, 1993. — 456 p.
44. Kiersnowski R. Najdawniejsze monety litewskie // Wiadomości numizmatyczne. — Warszawa, 1984. — R. XXVIII. — S. 129—174.
45. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. — Warszawa, 1895. — 698 s.
46. Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju Mełneńskiego z 1422 roku / Wyd. P. Nowak, P. Pokora. — Poznań, 2004. — 99 s.
47. Сінчук І. Пытанняў больш, чым адказаў // Спадчына. 1994. № 5. С. 19—21.
48. Akta Unji Polski z Litwą. 1385—1791 / Wyd. S. Kutrzeba, W. Semkowicz. — Kraków, 1932.— 570 s.
49. Piekosiński F. Studya, rozprawy i materyały z dziedziny historyi polskiey. Pieczęcie polskie wieków średnich, przy współdziale E. Diehla. — Kraków, 1899. — T. III. — 290 s.
50. Rusakiewicz A. Najdawniejsze godła książąt gdańskich: lilia i gryf // Biskupi, lennicy, żeglarze. / Pod red. B. Śliwińskiego. — Gdańsk, 2003. — Nr 9. — S. 147—188.
51. Rymar E. Rodowód książąt Pomorskich. — Szczecin, 1995. — T. 1. — 323 s.

52. Янин В. Новгород и Литва: пограничные ситуации XIII—XV веков. — М.: Изд-во Моск. ун-та, 1998. — 216 с.

53. Псковские летописи / Под ред. А. Н. Насонова. — М.: Изд-во АН СССР, 1955. — Вып. II. — 363 с.

54. Русские летописи. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. / Подг. А. И. Цепков. — Рязань, 2001. — Т. 10. — 639 с.

55. Хорошкевич А. Печати полоцких грамот XIV—XV вв. // Вспомогательные исторические дисциплины. — Л.: Наука, 1972. — Т. IV. — С. 128—146.

56. Бохан Ю. Узбраенне вершнікаў Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIV—пачатку XV ст. (па матэрыялах княскіх пячатак) // З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.-культуралаг. зб. — Мн.: Навука і тэхніка, 1996. — Вып. I. — С. 236—244.

57. Sajauskas S., Kaubrys D. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes numizmatika. Katalogas. — Vilnius, 1993. — 456 p.

58. Nikodem J. Rola Skirgiełły na Litwie do 1394 roku // Scripta minora. — Poznań, 1998. — T. II. — S. 83—129.

59. Котляр Н. Клад монет Владимира Ольгердовича // Нумизматика и эпиграфика. — М.: Наука, 1970. — Т. VIII. — С. 88—100.

60. Ражнев Г. Герб Смоленска. — Смоленск, 1993. — 239 с.

61. Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-slavica Posnaniensia. Studia Historica. — Poznań, 1989. — T. III. — S. 7—139.

62. Дашкевич Я. Родовий знак Рюриковичів у Галицькому князівстві XIII ст. // Третя наукова геральдична конференція: Зб. Тез повідомлень та доповідей (Львів, 4—5 листопада 1993 року). — Львів, 1993. — С. 32—33.

63. Фёдров-Давыдов Г. Монеты Московской Руси: Москва в борьбе за независимое и централизованное государство. — М.: Изд-во Моск. ун-та, 1981. — 224 с.

64. Шаланда А. Зямельныя гербы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIV—XVIII стст. // Герольд Litherland. — Горадня, 2001. — № 2. — С. 52—66.

65. Korczak L. Litewska Rada wielkoksiążęca w XV wieku. — Kraków, 1998. — 119 s.

66. Харашкевіч Г. Полацкія пячаткі XV стагоддзя // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1974. № 1. С. 26—30.

67. Piekosiński F. Goście polscy na soborze konstancyjskim // Rozprawy Akademii Umiejętności. Wydział Historyczno-Filozoficzny. — Kraków, 1899. — Serya II. — T. XII. — S. 130—158.

68. Белы А. Хроніка «Белай Русі». Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы. — Мн.: Энцыклапедыкс, 2000. — 238 с.

69. Rimša E. Pieczęcie Olgierda, wielkiego księcia litewskiego — dane historiograficzne a rzeczywistość // Heraldyka i okolice. — Warszawa, 2002. — S. 201—215.

70. Ластоўскі Г. Палітычнае разьвіцьцё Смаленшчыны ў першай палове XIV ст. // Спадчына. 1997. № 2. С. 31—45.

71. Катлярчук А. Соф'я Валадараўна, каралева Данії // Наша ніва. 13 траўня 2005. (18). С. 12.

72. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. — Мн.: ВЦ «Бацькаўшчына»: МП «Бесядзь», 1994. — 91 с.

73. Heymowski A. Herby polskie w brukselskim Armorial Gymnich, recte Lyncenich // Studia źródłoznawcze. — Warszawa, Poznań, 1985. — T. 29. — S. 95—124.

74. Kuczyński S. Polskie herby ziemskie. Geneza, treści, funkcje. — Warszawa, 1993. — 334 s.

75. Грыгаровіч І. Беларуская іерархія. — Мн.: БелЭн, 1992. — 102 с.

76. Stemmata Polonica. Rękopis nr 1114 Klejnotów Długosza w Bibliotece Arsenału w Paryżu. / Wyd. H. Polaczkówna // Prace Sekcji Historii Sztuki i Kultury Tow. Naukowego we Lwowie. — Lwów, 1929. — T. I. — S. 235—240.

77. Heymowski A. Herby polskie w Sztokholmskim Codex Bergshammer // Studia źródłoznawcze. — Warszawa, Poznań, 1967. — T. 12. — S. 73—111.

78. Heymowski A. Herbowa «szesnastka» królowej Katarzyny Jagiellonki na jej grobowcu w katedrze w Uppsali. // Biuletyn Polskiego Towarzystwa Heraldycznego. — Warszawa, 1993. — kwiecień. — Nr 9. — S. 8—12.

79. Заяц Ю. Заслаўская кафля. — Мн.: Навука і тэхніка, 1990. —62 с.

80. Niesiecki K. Herbarz Polski. / Wyd. J. N. Bobrowicz. — Lipsk, 1845. — T. 10. — 508 s.

81. Grala H. «Pieczat' połotckaja» Iwana IV Groźnego. Treści imperialne w moskiewskiej sfragistyce państwowej // Rocznik Polskiego Towarzystwa Heraldycznego. / Pod red. S. K. Kuczyńskiego. — Warszawa, 1997. — Nowej serii T. III (XIV). — S. 117—134.

82. Чамярыцкі В. Радзівілаўскі летапіс // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 2001. — Т. 6. — Ч. I. — С. 65—66.

83. Басаў А., Куркоў І. Флагі Беларусі ўчора і сёння. — Мн.: Полымя, 1994. — 34 с.

84. Кузмин А. Торопецкая знать в XIII веке. Из истории Смоленской земли // Russia Mediaevalis. — München, 2001. — T. X. — 1. — S. 55—75.

85. Варонін В. Яраслаў Васілевіч // ЭГБ. — Мн.: БелЭн, 2003. — Т. 6. — Ч. II. — С. 302.

86. Dąbrowski D. Radosłowle kniazey Wytebskich — analiza porównawcza treści // Genealogia. Studia i Materiały Historyczne. / Red. M. Górny. — Poznań, Wrocław, 2002. — T. 14. — S. 31—69.

87. Шаланда А. Рэцэнзія на: Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Gedyminowiczów. — Poznań, Wrocław, 1999 // Герольд Litherland. — Горадня, 2001. № 3—4. С. 121—125.

88. Цітоў А. Наш Сымбаль — Пагоня: Шлях праз стагоддзі. — Мн.: Полымя, 1992. — 40 с.

89. Печать Владислава, государя Опольской, Велюнской и Русской земель. XIV в. // http://www.gerb.bel.ru/pages/russia/img/r_vladislav_3.gif

90. Kuczyński S.K. Herby terytorialne na polskich monetach średniowiecznych // Nummus et historia. Pieniądz Europy średniowiecznej. — Warszawa, 1985. — S. 227—235.

91. Цітоў А. Геральдыка Беларускіх местаў. — Мн.: Полымя, 1998. — 287 с.

92. Vitoldiana. Codex privilegiorum Vitoldi Magni Ducis Lithuaniae 1386—1430 / Zebrał i wydał J.Ochmański. — Warszawa—Poznań, 1986. — 255 s.

93. Рассадзін С. «Віціс» літоўскі // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 1. С. 10—14.

Аляксей ШАЛАНДА.

Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX—XI стст.)

Працэс станаўлення дзяржаўнай улады ў розных рэгіёнах Усходняй Еўропы стаў вынікам складаных этнічных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Пачатковая гісторыя Полацкага княства не выключэнне. Вывучэнне дзяржаватворных працэсаў на абшарах Беларускага Падзвіння ў пераломны момант этнічнай гісторыі ўяўляе вялікую цікавасць для гісторыка.

Мэта артыкулу — рэканструкцыя шляхоў станаўлення сярэднявечнай дзяржавы — Полацкага княства на фоне этнакультурных працэсаў Усходняй Еўропы IX—XI стст.

За аснову дэтэрмінізацыі паняцця «дзяржава» намі прынята вызначэнне Язэпа Юхо[1]. Дзяржава — гэта тэрытарыяльны, суверэнны хаўрус грамадзянаў, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Яе дзейнасць рэгламентуецца прававымі нормамі і правіламі маральных паводзінаў, выкананне якіх забяспечваецца сістэмай кіравання і выхавання. У вызначэнні сутнасных характарыстык дзяржавы ў раннім сярэднявеччы мы прымаем за аснову тры галоўныя адзнакі: 1) размяшчэнне насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце, а не на аснове кроўнароднасных сувязяў; 2) наяўнасць дзяржаўнай улады, якая аддзелена ад асноўнай масы народу; 3) абкладанне падаткамі для ўтрымання яе прадстаўнікоў[2].

Для абазначэння дзяржавы на Русі выкарыстоўвалася некалькі тэрмінаў: «зямля», «воласць», «отчізна», «жізнь», «улада» і інш. Найбольш ёмістыя азначэнні дзяржавы — «зямля» і «воласць». Зямля — гэта вышэйшы сымбаль дзяржаўнай улады, распаўсюджаны на пэўную тэрыторыю і яе свабоднае насельніцтва. У адрозненне ад «зямлі», «воласць» магла



Полацк у XII–XIII стст. Рэканструкцыя В. Сташчанюка.

Рэканструкцыя першапачатковага выгляду св.Сафіі ў Полацку. Сярэдзіна XI ст.

пазначаць усякую вобласць як у значэнні цэлай дзяржавы, так і яе адміністрацыйных адзінак[3]. Упершыню воласць на чале з Полацкам згадваецца ў 862 г., калі ў ёй пачаў княжыць набліжаны (муж) князя Рурыка. Як слушна заўважае Георгій Штыхаў, паведамленне засведчыла існаванне Полацка як цэнтра пэўнай воласці, якая мела дзяржаўныя атрыбуты яшчэ да запрашэння варагаў на княжанне[4].

У працэсе станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях нельга не заўважыць наступнай акалічнасці. У раннім сярэднявеччы існавалі два асноўныя рэгіёны, якія маглі стаць самастойнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі. Першы — Беларускае Палессе, тэрыторыя рассялення дрыгавічоў. Варта ўзгадаць, што традыцыі развіцця славянскай культуры на правабярэжжы ад Прыпяці прасочваюцца з V ст., а ў святле археалагічных адкрыццяў апошніх гадоў — з IV ст.[5]. За пяцьсот гадоў да X ст. тут змяніліся тры археалагічныя культуры, якія належалі славянам: пражская, Лукі Райкавецкай і археалагічная культура дрыгавічоў. Другім рэгіёнам, які адыграў дамінантную ролю ў стварэнні дзяржаўнасці на беларускіх землях, стала Беларускае Падзвінне з адносна маладой славянскай культурай (IX ст.).

Полацк згадваецца на старонках летапісаў у 862 г., тады як палітычную гісторыю Тураўскай зямлі правамоцна разглядаць з 980 г.[6]. Да X ст. Полацк замацаваў за сабой ролю палітычнага лідэра не толькі ў Падзвінні, але і на абшарах Беларусі.

Узнікае пытанне: чаму менавіта славянская (крывіцкая) культура Беларускага Падзвіння стала асновай **першага** дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх землях? У адказе на гэта пытанне і карэніцца сутнасны феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў.

Этнакультурная сітуацыя на Беларускім Падзвінні на момант з'яўлення славянаў была няпростая. На VIII ст. прыходзіцца час згасання тушэмлінскай культуры Верхняга Падняпроўя (па ўдакладненай храналогіі Е.А. Шміта)[7]. Верхняя храналагічная мяжа распаўсюджвання старажытнасцяў банцараўскай культуры ў Беларускім Падзвінні прыпадае на канец VIII — пачатак IX стст.[8]. Менавіта ў гэты час у рэгіёне фарміруецца культура доўгіх курганоў Паўночнай Беларусі (г. зв. другая стадыя культуры доўгіх курганоў Падзвіння)[9], асноўнымі носьбітамі якой, на думку бальшыні даследнікаў[10], былі славяне. У суседнім Верхнім Падняпроўі гэты працэс суправаджаўся пагібеллю ў агні гарадзішчаў-сховішчаў тушэмлінскай культуры, пасля чаго жыццё на пасяленнях, як правіла, не аднаўлялася[11]. На Падзвінні, дзе агульная колькасць гарадзішчаў-сховішчаў банцараўскай культуры вылічваецца некалькімі дзесяткамі, да апошняй трэці I тыс. жыццё працягваецца на адзінкавых пасяленнях каля в. Свіла-I, Віцебска, Лукомлі і некаторых іншых.

Паходжанне дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе звязана з фактарам урбанізацыі. Полацк — адзіны летапісны горад, за якім у сучаснай гістарыяграфіі надзейна замацавалася вызначэнне «калыска беларускай дзяржаўнасці». Рэканструкцыя працэсаў станаўлення Полацка як палітычнага і адміністрацыйнага цэнтру полац-

Дзяўчына з заможнай сям'і. XII ст. Рэканструкцыя. Мастак Алесь Пушкін.

кіх крывічоў прапанаваная вядомымі беларускімі навукоўцамі Георгіем Штыхавым, Эдуардам Загарульскім, Сяргеем Тарасавым.

Так, паводле Г. Штыхава Полацк узнік як племянны цэнтр крывічоў-палачанаў, апорная цвердзь у працэсе славянізацыі краю. С. Тарасаў выказаў меркаванне, што Полацк мог быць заснаваны роданачальнікам Крывам, правадыром адной са славянскіх груповак[12]. На думку Э. Загарульскага, Полацк абавязаны ўзнікненнем свайму асаблівому палітычнаму і сацыяльна-эканамічнаму статусу, паколькі адна толькі функцыя ваенна-адміністрацыйнага падпарадкавання балтаў не тлумачыць прычыну паходжання гораду. У якасці прыкладу аўтар прыводзіць рэгіён Беларускага Пасожжа, дзе этнічная сітуацыя на момант рассялення славянаў была не менш складаная, чым на Падзвінні, аднак гарадоў там не ўзнікла[13].

Пазначаныя канцэпцыі не ўзаемавыключальныя. Агульнае ў іх — што Полацк з'яўляўся племянным цэнтрам крывічоў. Аднак нельга не пагадзіцца з Э. Загарульскім аб асаблівым сацыяльна-эканамічным, а галоўнае — палітычным статусе Полацка як асноўным чыннику яго ўзнікнення. Менавіта гэты статус забяспечваў стабільнае развіццё гораду на працягу доўгага перыяду яго станаўлення як дзяржаватворчага цэнтру.

З прыведзенага вынікае пастаноўка навуковай праблемы: якому асаблівому статусу Полацк абавязаны сваім паходжаннем?

Першыя дзяржаватворчыя цэнтры Русі на чале з Ноўгарадам знаходзіліся ў паўночным рэгіёне (чатырохкутнік азёраў Ладажскае, Анежскае, Белае, Ільмень, Чудскае). Пад 862 г. у Лаўрэнцьеўскім летапісе знаходзім паведамленне пра раздачу Рурыкам гарадоў сваім васалам: «овому Полотескъ, овому Ростовъ другому Белоозеро и по тем городам суть находници врязи, а первые насельници в ... Полотьски кривичи...»[14]. Імперыя Рурыка прасціралася ў паўночным рэгіёне ўсходнеславянскага свету з цэнтрам у Ноўгарадзе, сталіца была перанесена ў Кіеў толькі падчас праўлення Алега (882). Адначасова пачалося і пераразмеркаванне палітычных сувязяў, якія наклалі адбітак на далейшую гісторыю Полацкага княства. Варта ўзгадаць, што асноўная мэта паходу Уладзіміра на Полацк у 980 г. была нейтралізацыя Рагвалода як хаўрусніка кіеўскага князя Яраполка. «Абранне» Рагнедай[15] Яраполка адпавядала палітычным інтарэсам Полацка ў нейтралізацыі галоўнага канкурэнта ў балтыйскім гандлі — Ноўгарада. Гэтай жа прычынай тлумачыцца палітычная актыўнасць полацкіх князёў Брачыслава Ізяслававіча і Усяслава Брачыслававіча (паходы на Ноўгарад у 1021, 1066 і 1069 гг.).

Нельга пагадзіцца з думкай, што Полацк узнік выключна як гандлёвы цэнтр. Прыклад старажытнага Гняздова пераканаўча сведчыць, што адасабленне гандлёва-рамесных і дружынных групаў на падставе абслугоўвання патрабаванняў, галоўным чынам, знешняга гандлю хоць і суправаджаецца кароткачасовым росквітам, яшчэ не з'яўляецца дастатковым для перарастання такога цэнтру ў раннесярэднявечны горад[16]. Акрамя таго вядома, што знакаміты шлях «з варагаў у грэкі» ў IX ст. толькі пачынае функцыянаваць, актыўнае яго выкарыстанне прыпадае на X—XII стст.[17]. На тэрыторыі Беларусі знойдзены ўсяго чатыры скарбы другога перыяду абарачэння дырхема (830—900), большасць іх знаходак належыць да X—XII стст.[18].

Дзяржаўнасць і інстытуты ўлады існавалі на землях славянаў яшчэ да запрашэння варагаў на чале з Рурыкам. Гэты факт сведчыць пра наяўнасць першаснага ўласна славянскага этапу фармавання крывіцкае дзяржаўнасці. На момант рассялення на Падзвінні славяне знаходзіліся на стадыі ваеннай дэмакратыі, якую можна акрэсліць як пераддзяржаўнае ўтварэнне саюзаў плямёнаў з тэндэнцыяй да іх адзінаначальнага кіравання. Вынік развіцця Полацка на дадзеным этапе — гэта ягонае станаўленне як палітычнага і адміністрацыйнага цэнтру крывічоў-палачанаў, асяродак кшталтавання урбаністычнай славянскай культуры IX ст. Пачатковая функцыя княжацкай улады — гэта кіраўніцтва працэсамі славянскай каланізацыі Падзвіння, і менавіта ёй, на нашу думку, Полацк і абавязаны сваім узнікненнем.

У іншых публікацыях было адзначана, што на ўсіх пачатковых протагарадскіх пасяленнях на тэрыторыі Беларускага Падзвіння (Віцебск, Лукомль, Свіла-1) на момант прыходу славянаў жыло аўтахтоннае балцкае насельніцтва[19]. Полацк у гэтай сітуацыі — выключэнне. Асабліва важным падаецца, што на Першапачатковым полацкім гарадзішчы (таксама як і на паселішчы) не зафіксаваны пласт банцараўскай культуры VI—VIII стст., а гэта азначае, што гарадзішча пры вусці Палаты

Замах Рагнеды Рагвалодаўны на жыццё мужа, князя Уладзіміра. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

на працягу сама меней трох стагоддзяў не было заселена.

У гэтай сувязі хацелася б звярнуць увагу на адну прыкрую недакладнасць: на старонках найноўшых акадэмічных выданняў Першапачатковага гарадзішча ўнесена ў лік помнікаў банцараўскай (балцкай ці балта-славянскай) культуры[20]. Падставай для такога меркавання стала публікацыя Г. Штыхавым[21] і С. Тарасавым[22] фрагментаў ляпной керамікі з полацкага гарадзішча і паселішча. Сярод гэтых фрагментаў два венцы падобныя на банцараўскую кераміку, пры гэтым адно венца з'яўляецца пад'ёмным матэрыялам, г. зн. яго дачыненне да культурнага пласту вельмі верагоднае[23].

Мусім падкрэсліць, што без наяўнасці культурнага пласта знаходжанне адзінкавых фрагментаў банцараўскай керамікі сведчыць аб балта-славянскіх кантактах у памежнай зоне рассялення славянскага этнасу, у якой знаходзіўся Полацк на раннім этапе свайго існавання.

Паводле археалагічных матэрыялаў, Полацк быў заснаваны на мяжы VIII—IX стст.: знойдзены датуючыя матэрыялы па гэтаму перыяду з Полацкага паселішча (буйныя фрагменты ляпной керамікі пражскага тыпу, а таксама фрагменты керамікі, тыповай для доўгіх курганоў VIII—IX стст.[24]). Некаторыя фрагменты посуду, на думку Г. Штыхава, маюць роменскія аналагі. Несумненна адно — найбольш раннія ўзоры посуду з Полацкага паселішча з'яўляюцца славянскімі паходжаннем.

Пагорак, на якім адбылося будаўніцтва Полацкага замчышча[25], дагэтуль прыкладна на працягу трох стагоддзяў не быў заселены[26]. Найбольш раннія матэрыялы — сведчанні з'яўлення славянаў — былі знойдзены на Полацкім паселішчы, таму цалкам верагодна, што менавіта на ім першапачаткова было адноўлена жыццё. Паралельна з асваеннем паселішча (славяне ў першую чаргу былі земляробы) ідзе працэс умацавання гарадзішча — насыпаецца вал, будуецца замкавая сцяна, узводзіцца сістэма абарончых збудаванняў[27]. Магчыма, у гэты час у Полацку ўсталёўваецца свой пантэон язычніцкіх багоў[28]. Такія буйнамаштабныя мерапрыемствы былі магчымы пры наяўнасці дастаткова распрацаванай сістэмы кіруючага апарату. Яго функцыянаванне забяспечвала княжацкая ўлада, якая абапіралася ў сваіх дзеяннях на племянную знаць. Таму цалкам слушным падаецца меркаванне, што этнонім «крывічы» паходзіць ад імя роданачальніка Крыва, асноўны род якога выбраў месцам свайго сталага жыхарства Полацк[29].

На нашу думку, Полацк быў заснаваны ў выніку дагаворных дачыненняў паміж славянамі і балтамі на ўзроўні племяннога кіравання, таму ён адразу пачынае вылучацца палітычнай актыўнасцю. Ініцыятыва пры гэтым належала славянскім пасяленцам. Незаселенае гарадзішча давала крывічам выдатную стартавую магчымасць у пабудове ўласнай дзяржавы і паступова да славянаў пераходзіць кіраўніцтва ўсімі сферамі грамадска-палітычнага жыцця ў рэгіёне. Індыкатарам гэтага працэсу ёсць сведчанні летапісаў і скандынаўскіх сагаў.

У балцкага насельніцтва да прыходу славянаў, відаць, меліся свае племянныя цэнтры, якія аб'ядноўвалі асобныя субрэгіёны. Магчыма дапусціць, што імі з'яўляліся старажытныя Віцебск і Лукомль. Працяг іх існавання пасля прыходу славянаў натуральны, паколькі заключэнне дагаворных стасункаў павінна было вырашацца не ніжэй, чым на ўзроўні племяннога кіравання. Як вынік, у IX—X стст. у Віцебску і Лукомлі археалагічна фіксуюцца артэфакты славянскай культуры.

Такім чынам, першапачатковы сацыяльны статус Полацка — племянны цэнтр крывічоў-палачанаў, рэзідэнцыя мясцовай адміністрацыі, аднак палітычная роля Полацка ставіла яго ў больш прыдатнае становішча ў параўнанні з іншымі гарадамі Беларускага Падзвіння. Полацк, як носьбіт атрыбуту дзяржаўнай улады (рэзідэнцыя княжацкай адміністрацыі), адыгрываў ролю пасрэдніка і каардынатара міжэтнічных, хаўрусных балта-славянскіх дачыненняў, забяспечваючы роўныя правы абодвух бакоў у пабудове новага дзяржаўнага ўтварэння — Полацкага княства. Гэтая функцыя і забяспечвала гораду асаблівы сацыяльны

статус на першасным этапе яго існавання.

Паступова да XI ст. склаліся асноўныя інстытуты дзяржаўнай улады зямлі-княства (князь, дружына, веча, баяры і інш.)[30], тады ж Полацк стаў горадам у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміна[31].

Падчас праўлення Брачыслава Ізяслававіча палачане праводзяць самастойную палітыку ў дачыненні да сваіх заходніх балцкіх суседзяў. Менавіта ў выніку гэтай дзейнасці былі заснаваны гарады Браслаў, Маскавічы, Рацюнкі, Дрысвяты. У першай палове XI ст. фіксуюцца археалагічныя сведчанні ваенных сутыкненняў паміж крывічамі і заходнімі суседзямі-балтамі на Падзвінні[32]. На працягу XI ст. працэс славянізацыі балтаў яшчэ не быў завершаны (па курганных пахаваннях бачна, што сельская акруга заставалася пераважна балцкай[33]), таму ўзнікненне памежных дзяржаўных цвердзяў можна разглядаць як рэальнае праяўленне палітычнай волі палачанаў і іх князя. Полацкія крывічы XI ст. былі ўжо палітычна з'яднаны, з гэтай прычыны ўжыванне палітоніму «палачане» ў дачыненні да ўсіх жыхароў Полацкае зямлі падаецца слушным.

Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе пачатку II тыс. прадвызначыла распаўсюджванне хрысціянскай ідэалогіі з яе ідэямі монацэнтрызму. Славяне, носьбіты урбаністычнай традыцыі, сталі непасрэднымі праваднікамі новай хрысціянскай ідэалогіі. Самыя раннія сведчанні пра хрысціянаў з ліку мясцовай княжацкай дынастыі звязаны з імем Ізяслава Уладзіміравіча і ягонай маці Рагнеды[34]. Варажскае паходжанне полацкіх князёў Рагвалодавічаў у

Св.Канстанцін і Алена. Абразок XII ст. з археалагічных знаходак Г.Штыхава ў Полацку ў 1967 г.

гэтым выпадку не пярэчыць выказанаму меркаванню, паколькі яны дзейнічалі ў інтарэсах славянскага насельніцтва крывічоў-палачанаў. Напрыканцы X ст. у Полацку праводзілася місіянерская дзейнасць Торвальда, які заснаваў у горадзе манастыр і быў пахаваны ў крывіцкіх землях Падзвіння[35].

Хрысціянізацыя Полацкай зямлі была абумоўлена патрэбай княжацкай улады ва ўпарадкаваным кіраванні новымі тэрыторыямі. Хрысціянізацыя была гістарычна дэтэрмінавана наяўнасцю шматлікіх культурных сувязяў з Візантыяй, таму распаўсюджванне новай веры ў Полацкай зямлі звязана з дзейнасцю Рагвалодавічаў і пачаткова мела акрэслены палітычны характар. На тэрыторыі Полацкай зямлі новая рэлігія распаўсюджвалася мірным шляхам, у адрозненне, напрыклад, ад Тураўскай зямлі, дзе мелі месца крывавыя сутыкненні[36]. Палітыка асіміляцыі палачанамі балтаў і распаўсюджванне хрысціянства на Падзвінні мелі падабенства ў галоўным: новая рэлігія і новая культура (у першую чаргу урбаністычная), сталі асноўнымі атрыбутамі **дзяржаўнай** улады полацкіх крывічоў.

Археалагічныя раскопкі пацвердзілі, што на месцы Полацкай Сафіі, узведзенай паміж 1050—1055 гг., існавала драўляная пабудова, якая загінула ў моцным пажары[37]. Цалкам верагодна, што на месцы Сафіі раней знаходзілася царква св. Багародзіцы, якая згадана пад 1001 і 1007 гг. у сувязі з пераносам парэшткаў полацкіх князёў Ізяслава Уладзіміравіча і ягонага сына Усяслава[38].

Пачаткі манументальнага дойлідства, узвядзенне сабораў у Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку можна разглядаць як акт палітычны. Культурнае «спазненне» суседніх прыбалтыйскіх фінскіх і балцкіх плямёнаў, у прыватнасці, адсутнасць у іх традыцыяў уласнага горадабудаўніцтва, тлумачыцца ў тым ліку і аддаленасцю ад хрысціянскай цывілізацыі. Невыпадкова першыя манументальныя пабудовы на землях усходніх славянаў звязаны з хрысціянскімі цэрквамі, таму і наяўнасць мураванага дойлідства — адна з вызначальных прыкметаў для атаясамлівання раннегарадскога пасялення з сярэднявечным горадам[39].

Працэс славянізацыі балцкага насельніцтва полацкай акругі шмат у чым быў сінхронны распаўсюджванню хрысціянства, таму і ў XII ст. двухвер'е было звычайнай з'явай. У славянаў-крывічоў існавалі як цераспалосныя, так і змешаныя з балтамі пасяленні. Нават у непасрэднай акрузе Полацка (Рудня, Дзмітраўшчына) касцюм жыхароў сельскіх пасяленняў у XI—XII стст. заставаўся балцкім[40].

Фібулы часоў Полацкага княства.

Неаднолькавасць этнічнага складу насельнікаў Полацкай зямлі магла ўскосна садзейнічаць негвалтоўнаму распаўсюджванню хрысціянства. Паводле археалагічных крыніцаў, у X—XI стст. мела месца значнае перамяшчэнне балцкага (яцвяжскага) насельніцтва з Панямоння ў межы Полацкае зямлі[41]. Невыпадкова язычнікі-балты, якія беглі ад нападаў крыжакоў і ўціску Лівонскага ордэну, знайшлі прытулак у Полацкай зямлі, пры гэтым летапісныя крыніцы не фіксуюць якіх-небудзь зменаў у рэлігійнай ці ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Полацкай зямлі.

Так у XI ст. з культурнага асяродку створаных крывічамі гарадоў паступова пачалі распаўсюджвацца хрысціянскія культы. Гэты працэс закрануў як славянскае, так і балцкае насельніцтва Полацкай зямлі, і праходзіў вельмі марудна: пісьмовыя крыніцы сведчаць пра язычніцкае веравызнанне сярод часткі славянскага насельніцтва суседняй Аршаншчыны нават у XVII ст.[42].

Асіміляція славянамі балцкіх плямёнаў доўжылася на працягу некалькіх пакаленняў, таму ўяўляецца больш правільным гаварыць пра біэтнічную балта-славянскую дзяржаву полацкіх крывічоў, прынамсі, на перыяд IX—X стст. Полацк, як носьбіт дзяржаўнай улады (рэзідэнцыя княжацкай адміністрацыі), адыгрываў ролю пасрэдніка і каардынатара міжэтнічных балта-славянскіх дачыненняў і забяспечваў роўныя правы абодвух бакоў у пабудове Полацкага княства. Гэтая функцыя забяспечвала Полацку правы на палітычнае лідэрства ў рэгіёне.

Такім чынам, станаўленне самастойнага дзяржаўнага ўтварэння — Полацкага княства — у IX—XI стст. адбывалася ў два этапы. Першы этап пачынаецца з моманту заснавання на мяжы VIII—IX стст. крывічамі Полацка як моцнага племяннога і рэгіянальнага цэнтру, ядра будучага княства. Другі этап — ад уваходжання Полацка ў палітычны хаўрус славянскіх і варажскіх плямёнаў паўночнай Русі на чале з Ноўгарадам (862—882 гг.) і Кіевам (882—912 гг.)[43] да канца XI ст. (усталяванне ў Полацку самастойнай дынастыі князёў Рагвалодавічаў з апошняй трэці X ст.).

Залаты бранзалет з Полацка.

Увогуле, гэты даволі цьмяны ў плане палітычнай гісторыі перыяд IX—XI стст. не вылучаўся стабільнасцю. Першы, «ананімны», этап гісторыі Полацка вельмі важны для разумення сутнасці станаўлення дзяржаўнай улады славянаў-крывічоў на Падзвінні. На другім этапе выразна адзначаецца тэндэнцыя да палітычнага сепаратызму Полацкай зямлі адносна Ноўгарада і Кіева, што асабліва праявілася ў XI ст. У гэты час Полацкае княства пераўтварылася ў моцную самастойную раннефеадальную дзяржаву з усімі атрыбутамі дзяржаўнай улады.

ЗАЎВАГІ

[1] Юхо Я. Дзяржава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6-ці т. Т. 3. — Мн., 1996. — С. 237.

[2] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. — Мн., 2002. — С. 8.

[3] Пузанов В. Народ и власть в городах-государствах Древней Руси // История России: народ и власть. — СПб., 1997. — С. 57; Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 43—46.

[4] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 11.

[5] Вяргей В., Трымер В. Раннеславянскае паселішча Петрыкаў-2 на р. Прыпяць // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2003, № 18; Гавритухин И. Хронология пражской культуры Белорусского Полесья // Тамсама.

[6] Лысенко П. Туровская земля IX—XIII вв. — Мн.,1990. — С. 15—16.

[7] Шмидт Е. Проблемы хронологии тушемлинской культуры в Верховьях Днепра // Археалогія і старажытная гісторыя Магілёўшчыны і сумежных тэрыторый. — Магілёў, 1994. — С. 108—110.

[8] Митрофанов А. Археологические памятники восточных балтов на территории Белоруссии в эпоху железа (VIII в. до н. э. — IX в. н. э.) // Из древнейшей истории балтских народов. — Рига, 1980. — С. 108.

[9] Штыхаў Г. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. — Мн., 1992. — С. 49—50.

[10] Енуков В. Ранний этап формирования Смоленско-Полоцких кривичей (по археологическим материалам). — М., 1990. — С. 173; Седов В. Восточные славяне в VI—XIII вв. — М., 1982. — С. 53—58; Шмидт Е. Тушемлинская культура на Верхнем Днепре и формирование смоленско-полоцких кривичей // Северная Русь и её соседи в эпоху раннего средневековья. — Л., 1982. — С. 102; Штыхаў Г. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. С. 61.

[11] Третьяков П., Шмидт Е. Древнейшие городища Смоленщины. — М.—Л., 1963. — С. 41.

[12] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 18.

[13] Загорульский Э. Древняя история Белоруссии: автореф. дисс. ... доктора ист. наук. — М., 1983. — С. 27.

[14] ПСРЛ. Т. 1. — М., 1962. — Стб. 20.

[15] Насамрэч відавочна, што рашэнне прымаў Рагвалод, зыходзячы са знешнепалітычных рэаліяў таго часу.

[16] Булкин В., Дубов В., Лебедев Г. Археологические памятники Древней Руси IX—XIII вв. — Л., 1978. — С. 59.

[17] Брим В. Путь из варяг в греки // Известия АН СССР. Сер. 7. Отд-ние общ. наук. 1931, № 2. С. 213—218.

[18] Алексеев Л. Полоцкая земля в IX—XIII вв. (Очерки этнической истории Северной Белоруссии). — М., 1966. — С. 86.

[19] Дук Д. К вопросу о происхождении городов и государственности на территории Белорусского Подвинья // Славянскі свет: міжэтнічныя адносіны на мяжы трэцяга тысячагоддзя. — Брэст, 2002. — С. 27—31; Дук Д., Шайкоў В. Паходжанне і ранняя гісторыя Полацка (VIII—X стст.) // Беларускі гістарычны часопіс, 2001, № 6. С. 14—18.

[20] Археалогія Беларусі: У 4-х т. Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча. — Мн., 1999. — С. 392—393; Гісторыя Беларусі: У 6-ці т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. — Мн., 2000. — С. 127.

[21] Штыхов Г. Древний Полоцк (IX—XIII вв.). — Мн., 1975. — С. 24.

[22] Тарасаў С. Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. — Мн., 1998. — С. 142.

[23] Штыхов Г. Древний Полоцк (IX—XIII вв.). С. 25.

[24] Штыхаў Г. Новыя раскопкі ў Полацку // Помнікі старажытнабеларускай культуры: новыя адкрыцці. — Мн., 1984. — С. 156.

[25] Сучасная плошча Першапачатковага гарадзішча крыху меней за 1 га. На нашу думку, у старажытнасці плошча гарадзішча была не меней за 2 га: частка помніка была разабрана падчас пракладвання новага рэчышча Палаты ў 1563 г.

[26] У V ст. на гарадзішчы жыло балцкае насельніцтва днепра-дзвінскай культуры, культурны пласт банцараўскай культуры VI—VIII стст. на помніку адсутнічае.

[27] Штыхов Г. Древний Полоцк (IX—XIII вв.). С. 25.

[28] Тарасаў С. Полацк. Пачатак часу і прасторы // Полацк: карані нашага радавода. — Полацк, 1996. — С. 16.

[29] Тамсама. С. 18.

[30] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 37—50.

[31] Дук Д., Шайкоў В. Паходжанне і ранняя гісторыя Полацка (VIII—X стст.). С. 17.

[32] Гісторыя Беларусі: У 6-ці тамах. Т. 1. С. 154.

[33] Дучыц Л. Балты на тэрыторыі Полацкага княства і іх далейшы лёс // Полацк: карані нашага радавода. — Полацк, 1996. — С. 26—28.

[34] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 280—281.

[35] Древнерусские города в древнескандинавской письменности. Тексты, перевод, комментарии. Сост. Г. В. Глазырина, Т. Н. Джаксон. — М., 1987. — С. 101—105.

[36] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 282.

[37] Булкин В. Полоцкий Софийский собор в XI веке // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2000, № 15. С. 136.

[38] Селицкий А. Живопись Полоцкой земли XI—XII вв. — Мн., 1992. — С. 18.

[39] Загорульский Э. Древняя история Белоруссии. С. 27; Штыхов Г. Киев и древние города Белоруссии // Древнерусское государство и славяне. — Мн., 1983. — С. 55.

[40] Дучыц Л. Балты на тэрыторыі Полацкага княства і іх далейшы лёс. С. 26.

[41] Тамсама. С. 27.

[42] Тамсама. С. 28—29.

[43] У гэты час у Полацку кіравалі васалы варажскіх князёў Рурыка і Алега.

Дзяніс ДУК (Наваполацк).
denis_duk@tut.by

Крыжовы шлях Усяслава Полацкага

Усяслаў Чарадзей як фундатар з выявай храма св.Сафіі ў руках.
Мастак Яўген Кулік.

Спавітая містычным покрывам казачнасці, постаць чарадзея Усяслава Полацкага звычайна асэнсоўваецца ў навуковай літаратуры як увасабленне свайго роду авантурніка, або, гаворачы словамі Міхайла Грушэўскага, «*полацкага характару*». Гэтая няпэўная яго слава грунтуецца на крыніцы такога ж няпэўнага паходжання, «*Слове пра паход Ігаравы*», якая ёсць галоўнай крыніцай уяўленняў пра чарадзейства Усяслава. Гэта ён, паводле «*Слова пра паход Ігаравы*»,

…людзям суд судзіў,
Гарадамі князёў надзяляў,
А сам паночы, свету наздзіў,
Ваўкалакам ці воўкам гуляў.
Ён бо з Кіева да петухоў,
Горад Тмутаракань дасцігаў
І вялікаму Хорсу без слоў
Воўкам шлях борзда перабягаў.

Таму ў Полацку рана званы
Пазванілі ў Сафеі святой
Да завутра, — ён жа праз сны
Ужо ў Кіеве звон чуе той.

Хоць і вешчая, кажуць, душа
Ў дзёрзкім целе ягоным была,
Але часта бяды без нажа
Нацярпеўся, што доля дала[1].

Яшчэ адзін гістарычны твор пяра старакіеўскага кніжніка — «*Аповесць мінулых гадоў*» — лучыць нараджэнне князя з валхваваннем, у сувязі з тым, што, калі яго нарадзіла маці, на галаве немаўляці ўбачылі пляму: «бысть ему язвено на главе его». Валхвы парадзілі Усяслававай маці накласці на язву чароўную павязку: «рекоша бо волсви матери его: “Се язвено навяжи на нь, да носить е до живота своего”, еже носить Всеславъ и до сего дне на собе; сего ради немилостивъ есть на кровопролитье»[2].

Пасля смерці бацькі ў 1044 г. Усяслаў стаў паўнаўладным гаспадаром полацкага стальца. Найперш ён прыступіў да разбудовы свайго стольнага гораду. Ягонымі намаганнямі над Полацкам неўзабаве заззялі залатыя купалы велічнага Сафійскага сабору. Данатар полацкага сабору св. Сафіі не быў пасіўным паслядоўнікам пабудовы аднайменных кіеўскага і наўгародскага храмаў. Грандыёзным будаўніцтвам Сафіі Полацкай (1044—1066) ён кінуў смелы выклік моцным суседзям:

«Полоцкое “изгойное” княжество вообще заметно обособилось от Киева, тем более от Новгорода, и если князь Всеслав счел необходимым построить в своей столице большой кафедральный собор, то это вовсе не было актом ориентации на сильного соседа, а, скорее, наоборот, жестом открытого противостояния ему… Можно сказать, что как Ярослав противостоял со своей Софией Константинополю, так Всеслав противостоял со своей Софией Киеву и Новгороду»[3].

Дачыненні Усяслава з Ноўгарадам ды Кіевам і сапраўды былі варожыя. На старонках пазнейшых заходнерускіх летапісаў у гэтых дачыненнях ён паўстае ці не разбойнікам — анархістам. Але, чым жа былі абумоўлены ягоныя прэтэнзіі да дзвюх рускіх сталіцаў?

У 1065 г. Усяслаў распачаў вайну з кіеўскім князем Ізяславам Яраслававічам. Гэтая падзея не абяцала дабра Рускай зямлі. Напрыклад, *«Наўгародскі Першы летапіс»* сцвярджае: «Поча Вселавъ рать дрьжати: и на западе явися звезда велика». Аповед *«Аповесці мінулых гадоў»* пра пачатак Усяслававай «раці» таксама пачынаецца з апісання таго знамення: «В се же лето Всеслав рать почал. В си же времена бысть знаменье на западе, звезда превелика, луче имущи акы кровавы, всходящи с вечера по заходе солнечнем, и пребысть за 7 дний. Се же проявляше не на добро, посем бо быша усобице многы и нашествие поганых на Руськую землю, си бо звезда бе акы кровава, проявляющи крови пролитье»[4].

Усяслаў напаў на Пскоў, а наступнага году захапіў і разрабаваў Ноўгарад. Як паведамляе

«Наўгародскі Першы летапіс»: «В лето 6574. Приде Всеслав и взя Новгород, с женами и с детми; и колоколы съима у святыя Софие. О, велика бяше беда в час тыи; и понекадила съима»[5]. Наўгародская св. Сафія з яе святынямі, відавочна, і была галоўным аб'ектам Усяслававых памкненняў. Своеасабліваю рэмінісцэнцыяй выправы Усяслава Брачыслававіча на Ноўгарад у 1065 г. ёсць паведамленне *Іпатаўскага летапіснага зводу* пад 1180 г., дзе ў аповедзе пра полацкага князя Святаслава Усяслававіча сказана, што ягоны дзед браў удзел у паходзе на Ноўгарад, дзе ўзяў даразахавальніцу і службовае начынне ў саборы.

Неўзабаве Яраслававічы выступілі на полацкага князя: «Ярославичи же трие, — Изяслав, Святослав, Всеволод, — совокупивше вои, идоша на Всеслава»[6]. Халодным зімовым днём Яраслававічы завалодалі Менскам, а з надыходам вясны выйгралі вырашальную бітву з войскамі Усяслава на Нямізе. Гэтай бойцы летапіс прысвяціў такія лапідарныя словы: «И бысть сеча зла, и мнози падоша, и одолеша Изяслав, Святослав, Всеволод, Всеславъ же бежа»[7]. Гэтую падзею ў паэтычным убранні вобразна перадае «Слова пра паход Ігаравы» праз паралель жніва і бітвы:

На Нямізе снапы сцелюць
Галавамі,
А малоцяць жа стальнымі
Іх цапамі.

На таку жыццё кладзецца
Неспадзейна,
І душу ад цела веюць
Безнадзейна.

Берагі ў крыві Нямігі
Па калені;
Не дабро на іх пасеяў
Сейбіт жменяй,

А былі яны гусценька
Ў процьмах вузкіх
Там засеяны касцямі
Сыноў рускіх[8].

Яраслававічы, між тым, не паспяшаліся вярнуцца ў Кіеў. Спыніўшыся з войскам на беразе Дняпра пад Смаленскам, Ізяслаў з хаўруснікамі запрасіў пераможанага, але не скоранага Усяслава да сябе на перамовы: «целовавше крест честный к Всеславу, рекше ему: "Приди к нам, яко не створим ти зла". Он же, надеявся целованью креста, перееха в лодьи черес Днепр. Изяславу же в шатер предъидущю, и тако яша Всеслава на Рши у Смолиньска, преступивше крест. Изяслав же привед Всеслава Кыеву, всади и в поруб с двема сынома»[9].

Дзіўная рэч. Чаму, амаль паганец, палітычны авантурнік, Усяслаў паддаўся на такія «дробязі» й даў веры клятве на крыжы? Мяркую, што полацкі князь пасля «зрабавання» Сафіі Наўгародскай меркаваў, што ад таго моманту ён знаходзіцца пад асаблівай апекаю крыжа. Наўгародская св. Сафія была асвечаная ў дзень Узвіжання крыжа, — знаходжання ў Ерусаліме крыжа, на якім быў караны смерцю Хрыстос — 14 верасня. Як даводзіць М. Плюханава, у Сафійскім саборы Ноўгарада прадбачылася нейкая асаблівая містычная прысутнасць крыжа:

«Будучы вялікай Хрыстовай царквою, св. Сафія не рабілася з прычыны такой сувязі Крыжаўзвіжанскай, але яе асвячэнне ў вялікае свята не магло быць выпадковым і знаменавала спецыяльную адкрытасць наўгародцаў да ідэі крыжа, уяўнае сузіранне крыжа Хрыстовага ў св. Сафіі»[10].

У сярэднявеччы крыж быў найгалоўным сымбалем хрысціянскіх дабрачыннасцяў. У адпаведнасці з бізантыйскай традыцыяй, крыж і вобраз Божае Маці ўтваралі ідэальны комплекс у сымболіцы хрысціянскага царства. Ён мае сінтэзуючую моц, здатную аб'яднаць нябеснае і зямное, пры гэтым крыж увасабляе набытыя праз далучэнне да хрысціянства ахову і выратаванне[11]. Традыцыя шанавання крыжа, у прыватнасці, звычай яго цалавання пры складанні пагадненняў, паўстала ў рэчышчы сфармаваных

Храм св.Сафіі ў Полацку.
Рэканструкцыя Віктара Сташчанюка.

Бітва на Нямізе. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

хрысціянскім вучэннем уяўленняў пра законнасць і парадак.

Крыж быў сымбалем хрысціянскіх цнотаў: *«Крыж уратаваў род чадавечы, — хрысціяніна ратуюць дабрачыннасці, ім сімвалізаваныя, г. зн. сам крыж, які маем зразумець у ягонай сутнасці»*[12]. У палітычнай культуры ды ідэалогіі Кіеўскай Русі крыж выступае ўніверсальным чыннікам, здатным і ўратаваць, і асвяціць, і пакараць.

Цалаванне крыжа як сымбалю замацавання міжкняскіх пагадненняў узнікла ў выніку асаблівага статусу князя і, як трапна адзначае А. Талочка, *«спадчынаю перакананння сучаснікаў пра падсправаздачнасць князя толькі Богу і роўным яму паходжаннем, але не перад законам і людзьмі»*[13]. Адгэтуль, княскі род утвараў замкнёную кансэнсусную групу з уласцівымі ёй сацыяльна-рэлевантнымі каштоўнасцямі. Інстытут цалавання крыжа як форма дамоўных дачыненняў паміж князямі грунтаваўся на ідэі і практыцы дамовы паміж *роўнымі* людзьмі, што бралі на сябе *ўзаемныя*, хоць часам і *няроўныя* абавязкі.

Аднак браты, парушыўшы крыжовае цалаванне, адправілі Усяслава ў кіеўскую вязніцу. Таму ў Кіеве, калі надышоў час, ён апынуўся пад асаблівую апеку крыжа. У дзень Узвіжання чэснага і жыццядайнага крыжа Гасподняга (15 верасня), ён памаліўся крыжу, і Бог паказаў сілу крыжа — Усяслаў быў звольнены кіянамі з порубу, «и прославиша и среде двора княжа». Паведамляючы пра ўкняжэнне ў Кіеве Усяслава Брачыслававіча *«Аповесць*

Купяціцкі крыж, сучаснік Усяслава, які шанаваўся як цудатворны, – сведчанне веры нашых продкаў у моц хрысціянскіх сымбаляў. Гравюра ананімнага аўтара XVII ст.

мінулых гадоў» пад 1068 г. змяшчае разгорнутае ўхваленне крыжа:

«Всеслав же седе Кыеве. Се же Бог яви силу крестную, понеже Изяслав целовав крест, и я и; тем же наведе Бог поганыя, сего же яве избави крест честный. В день бо Въздвиженья Всеслав, вздохнув, рече: "О кресте честный! Понеже к тобе веровах, избави мя от рва сего". Бог же показа силу крестную на показанье земле Русьстей, да не преступают честнаго креста, целовавше его, аще ли преступит кто, то и зде приимет казнь и на придущемь веце казнь вечную. Понеже велика есть сила крестная: крестом бо побежени бывают силы бесовскыя, крест бо князем в бранех пособит, в бранех крестом сограждаеми вернии людье побежаюют супостаты противныя, крест бо вскоре избавляет от напастий призывающим его с верою. Ничего же ся боят беси, токмо креста»[14].

Затое *«Слова пра паход Ігаравы»* ўратаванне Усяслава і яго ўзыходжанне на кіеўскі сталец звязвае з чарадзействам і звадамі, на якія ўдаўся полацкі князь:

У сёмы Траянавы век
Уздумаў Ўсяслаў варажыць
Аб мілай дзяўчыне сабе,
Што з славай яго заручыць.

Пусціўшыся ў хітрыкі, ён
На борздага ўсеўся каня
І скончыў, памчаўся чым свет
Да Кіева-грода, да дня.

І кіеўскі дзідаю там
Пасад дакрануў залаты[15].

Большасць даследнікаў, намагаючыся «рэалістычна» патлумачыць паэтычныя радкі, звязвае іх з рэальнаю гістарычнаю сітуацыяй, якая склалася ў Кіеве ў 1068 г. Напрыклад, Д. Ліхачоў даводзіў,

Усяслаў Чарадзей на княскім пасадзе ў Кіеве. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

Кіева-Пячорскі манастыр.

што *«Усяслаў прыйшоў да кіеўскага княжання ў выніку паўстання кіянаў, якія патрабавалі ў кіеўскага князя Ізяслава коней і зброі. Гэтым патрабаваннем кіянамі коней і скарыстаўся Усяслаў... адпаведна, «абаперся» на тыя коні, якія даў кіянам»*[16].

Італьянскі славіст Рыкарда Пікіа нават заняўся пошукамі маладой дзяўчыны — «старажытнарускай Алены», з-за якой быццам і распачалася вайна (як і Траянская) паміж Яраслававічамі і полацкім князем[17]. Але ў эпічнай баладзе пра Усяслава *«Слова пра паход Ігаравы»* варта хутчэй убачыць не гістарычныя рэаліі, але асацыятыўна-мастацкую паралель з гамераўскаю топікаю матыву траянскага каня, а ў кіданні Усяславам жэрабя на дзяўчыну, кніжна-біблейскую канатацыю вобразу *гораду-дзяўчыны*, *гораду-нарачонай*[18]. Як вядома, у грамадска-палітычнай свядомасці сярэднявечнай Русі Кіеў быў *богазасцержоным* і *богаўратаваным* горадам. Невыпадкова яго называлі *«маці гарадоў Рускіх»*, што было індыкатарам сакральнага статусу Кіева — «Другога Іерусаліма».

Усяго сем месяцаў праседзеў на кіеўскім стальцы абранец і ўлюбёнец народу. Пра ягоную дзейнасць у Кіеве нічога не вядома. Можам толькі канстатаваць, што Усяслава падтрымаў ігумен Кіева-Пячорскага манастыра — Антоні. Улічваючы значны духоўны аўтарытэт свяціцеля, гэта мела вялікае значэнне. Калі вясною 1069 г. Ізяслаў Яраслававіч разам з цесцем — польскім каралём Баляславам Храбрым увайшоў у Кіеў, ён накіраваў свой гнеў на Антонія Пячорскага: «нача гневатися Изяслав на Антонья из Всеславa»[19]. Антоні быў змушаны пакінуць Кіеў і пайшоў у Чарнігаў, дзе з вялікаю радасцю быў прыняты Ізяслававым братам Святаславам Яраслававічам.

Баляслаў Храбры выкупляе мошчы св.Войцеха. Фрагмент рэльефаў дзвярэй сабора ў Гнезне, Польшча, другая палова XII т.

Усяслаў не выпрабоўваў лёс у бойцы з Ізяславам і ягоным польскім хаўруснікам. Спыніўшыся са сваім войскам каля кіеўскага прыгараду — Белгарада, ён неспадзявана ўначы ўцёк з лагеру інсургентаў. Паводле вобразнага выразу *«Слова пра паход Ігаравы»*:

Ад іх скочыў зверам лютым
З Белгорада ў поўнач; тады

Ахутаўся сіняю мглой[20].

Падобны вобраз уцёкаў Усяслава малюе і *«Аповесць мінулых гадоў»* у часе 1069 г.: «В лето 6577. Поиде Изяслав с Болеславом на Всеслава; Всеслав же поиде противу. И приде Белугороду Всеслав, и бывши нощи, утаився кыян бежа из Белагорода Полотску»[21]. У Сінадальным спісе *«Наўгародскага першага летапісу»* пасля паведамлення пра ўцёкі Усяслава ў Полацк дададзены наступныя звесткі: «В то же лето, осень, месяца октября в 23, на святого Якова брата господня, в пятничи, в час 6 дни, опять приде Все[*слав*] к Новугороду; новгородци же поставиша плк противу их, у Зверинця на Кземли; и пособи Бог Глебу князю с новгородци. О, велика

Паход Усяслава Чарадзея на Ноўгарад. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

бяше сеця Вожяном, и паде их бещисленное число; а самого князя отпустишя Бога деля». Пасля гэтай рэмаркі ў летапісе з'яўляецца загадкавае паведамленне: «А на заутрие обретеся крест честныи Володимир у святеи Софие Новегороде, при епископе Федоре»[22]. У *«Сафійскім першым летапісе»* гэтыя звесткі пададзены больш дэталёва: «А заутра обреетеся крест князя Володимера в святой Софеи, его же взял бе князь Всеслав ратию в святей Софеи»[23].

Дагэтуль на старонках летапісных тэкстаў не паведамлялася пра тое, што Усяслаў падчас «рабавання» наўгародскага сабору св. Софіі забраў з сабою крыж. Толькі некалькімі стагоддзямі пазней, кіеўскія і наўгародскія паведамленні, аб'яднаныя ў адзіную гісторыю ў *«Першым Сафійскім летапісе»* запэўняць, што Усяслаў, абрабаваўшы св. Сафію Наўгародскую, апынуўся на пэўны час пад апекаю таго самага крыжа. З дапамогаю апошняга яму пашанцавала захапіць уладу ў самым Кіеве. Аднак наступныя паразы і страты полацкага князя, яго выгнанне з Полацка і паняверка давялі да страты ім гэтае апекі, што была асэнсавана сярэднявечнымі кніжнікамі як вяртанне крыжа ў св. Сафію. Пасля Манамахавых спусташэнняў Полаччыны ў 80-я гг. XI ст., састарэлы ўжо Усяслаў утаймаваўся і ціха дажываў свае дні, аж пакуль у 1101 г. не адышоў у вечнасць.

На пагляд афіцыйнага Кіева і Ноўгарада Усяслаў быў злодзеем-авантурнікам. Але ў сваіх разбойных нападах ён, перакананы, імкнуўся улічыць і ўвасобіць у рэальнасць не толькі і не столькі прыземлена-матэрыяльныя інтарэсы. Як заўважае М. Плюханава, *«верагодна, што Усяслаў, выступаючы ў дачыненні да Кіева і Ноўгарада з пазіцыяў адпаведных летапісаў як разбойнік-анархіст, рэалізаваў у сваіх разбойных нападах нейкія спецыяльныя полацкія прэтэнзіі, не ўспрынятыя сучаснікамі і суцэльна забытыя ў летапісах»*[24].

Асноўны змест гэтых полацкіх прэтэнзіяў, мяркую, вызначаўся імкненнем Усяслава ўзвысіць статус Полацка да ўзроўню сталіцы, раўнапраўнай, раўназначнай Кіеву і Ноўгараду й легітымізаваць дзяржаўна-палітычную самастойнасць Полацкае зямлі.

ЗАЎВАГІ

[1] Цытуецца паводле: Слова пра паход Ігаравы / Песня аб паходзе Ігара. Пераклад Янкі Купалы. — Мн., 1986. — С. 121—122.

[2] Повесть временных лет / Под ред. и с предисл. В. П. Адриановой-Перетц. — М., Л., 1950. — Ч. 1. — С. 104.

[3] Вагнер Г. Искусство мыслить в камне (Опыт функциональной типологии памятников древнерусской архитектуры). — М., 1990. — С. 44.

[4] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 110.

[5] Новгородская Первая летопись старшего и младшего изводов / Под ред. и с предисл. А. Н. Насонова. — М., Л. — 1950. — С. 17.

[6] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 111—112.

[7] Тамсама. С. 112.

[8] Слова пра паход Ігаравы / Песня аб паходзе Ігара. Пераклад Янкі Купалы. С. 121.

[9] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 112.

[10] Плюханова М. О традициях Софийских и Успенских церквей в русских землях до XVI века // Лотмановский сборник. — М., 1997. — Вып. 2. — С. 496.

[11] Гл.: Плюханова М. Средневековая символика власти: крест Константинов в русской традиции // Уч. Зап. Тартусского гос. ун-та. Труды по русской и славянской филологии. — Тарту, 1987. № 781. — С. 188—162.

[12] Карсавин Л. Символизм мышления и идея миропорядка в средние века (XII—XIII века) // Карсавин Л. Монашество в средние века. — М., 1992. — С. 164.

[13] Толочко А. Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология. — К., 1992. — С. 78—79.

[14] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 115.

[15] Слова пра паход Ігаравы/ Песня аб паходзе Ігара. Пераклад Янкі Купалы. С. 121.

[16] Лихачев Д. Комментарий исторический и географический // «Слово о полку Игореве» / Под ред. В. П. Адриановой-Перетц. — М., Л., 1950 — С. 455—456; Параўн.: Рыбаков Б. Петр Бориславич: Поиск автора «Слова о полку Игореве». — М., 1991. — С. 44—45.

[17] Пиккио Р. Мотив Трои в «Слове о полку Игореве» // Проблемы изучения культурного наследия. — М., 1985. — С. 95.

[18] Гогешвили А. Три источника «Слова о полку Игореве». Исследование. — М., 1999. — С. 218—227.

[19] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 128.

[20] Слова пра паход Ігаравы / Песня аб паходзе Ігара. Пераклад Янкі Купалы. С. 121.

[21] Повесть временных лет. Ч. 1. С. 115.

[22] Новгородская Первая летопись старшего и младшего изводов. С. 17.

[23] Софийская летопись // Полное собрание русских летописей. Т. V. С. 143.

[24] Плюханова М. О традициях Софийских и Успенских церквей в русских землях до XVI века. С. 506.

Уладзімер РЫЧКА (Кіеў).

Паўсталы з вайны: першае ўзвышэнне Менска

Вайна — адна з найважнейшых глыбінных з'яваў гісторыі. Яна — бадай ці не найвялікшы чыннік раптоўных зменаў у жыцці людзей. Яна карэнным чынам перакручвае і перапісвае гісторыю паасобных сем'яў і родаў, а таксама цэлых народаў і дзяржаваў. Нездарма пры апісанні падзеяў мінулага XX ст. так часта ўжываюцца азначэнні «даваенны», «перадваенны», «міжваенны», «пасляваенны». Вайна стаецца вызначальным падзелам у жыццях цэлых пакаленняў, мяжуючы іх на незваротнае «да» і неабсяжнае «пасля». Масавае прызнанне надзвычайнага значэння з'явы вайны пацвярджаецца і на больш высокім навуковым узроўні асэнсавання рэчаіснасці. У працах гісторыкаў часам згадваюцца войны нагэтулькі часта і так разбіваюць плынь гісторыі на перыяды ад аднае вайны да другое, што ход гісторыі можа падацца складзеным з адных войнаў і звадаў.

Пытанне пра тое, чаму вайна мае такі вялізны ўплыў на гісторыю, адразу мае відавочны адказ. Выкліканыя вайной смерць, разбурэнні і няшчасці пакідаюць незнішчальны след у асабістай і паспалітай памяці. Але па-за такой відавочнай адмоўнасцю, вайна нашмат больш складаная з'ява, непазбежнае зло, своеасаблівы метад пераадолення сістэмных крызісаў і вырашэння наспелых праблемаў.

Вайна была і ёсць адным з найбольш пашыраных шляхоў барацьбы і вырашэння супярэчнасцяў паміж народамі і дзяржавамі. Вайна кідае найвялікшыя выпрабаванні і выклік сілам і духу як асобных людзей, так і цэлых паспольстваў. Такім чынам яна стварае спрыяльныя ўмовы для вылучэння герояў і правадыроў і працякання векапомных падзеяў, якія ў сапраўдным ці легендарным выглядзе адбіваюцца ў народнай памяці, закладаюць падмурак культурнай традыцыі і гэтым самым вызначаюць будучыню. Калі гаворка ідзе аб эканоміцы, вайна, побач з вытворчасцю і абменам, з'яўляецца асноўным спосабам здабыцця, назапашвання і забеспячэння матэрыяльнага дабрабыту. Нарэшце, вайна ёсць найгалоўнейшым чыннікам развіцця матэрыяльнае культуры. Нездарма шмат вызначальных і цяпер агульнапрынятых вынаходніцтваў былі зробленыя ў выніку імкнення аднаго боку атрымаць ваенную перавагу над іншым.



Кіева-Пячорскі манастыр. Духоўны прытулак і палітычны партнёр Глеба Усяслававіча.

Пры гэтым вайна не простае, залежнае наступства палітычных ці эканамічных чыннікаў гісторыі. Вельмі часта яна ператвараецца ў самадастатковую з'яву, якая пачынае адыграваць самастойную ролю ў гісторыі, жыве паводле ўласных законаў і з'яўляецца прычынай падзеяў не менш як наступствам.

І тады ўжо не падаецца дзіўным, што войны мелі такую ролю ў гісторыі сталіцы Беларусі Менска. «Датай нараджэння» гораду лічыцца 1067 г., у які Менск, тады паўднёвая памежная крэ-



Панарама менскай крэпасці. Рэканструкцыя Э. Загарульскага.

Адступленне кіеўскіх, чарнігаўскіх і смаленскіх войскаў ад Менска ў 1104 г. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

пасць Полацкага княства, быў спалены войскамі трох князёў Яраслававічаў падчас вайны супраць славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Але хоць гэты год і стаў годам першай згадкі пра Менск у летапісах, нашмат больш вартым увагі з'яўляецца пазнейшы час XII ст. Менавіта тады менскі князь Глеб Усяславіч і ягоныя сыны Расціслаў і Валадар паспрабавалі з дапамогай зброі і дыпламатыі зрабіць Менск магутным цэнтрам краю, які ў будучыні склаў аснову Беларусі. Больш за паўстагоддзя войнаў і ўпартай барацьбы прывялі толькі да часовага ўзвышэння Менска, але не далі гораду згубіцца ў цемры сярэднявечнай гісторыі, заклалі падмурак яго будучыні і пакінулі адметны след на старонках летапісаў.

У 1101 г., пасля смерці Усяслава, Менск стаў цэнтрам аднаго з княстваў, на якія была падзеленая Полаччына паміж Усяслававымі сынамі. Уладаром Менска і прылеглых земляў стаў трэці сын, Глеб. Падобна да іншых раннесярэднявечных дзяржаваў, Полацкае княства ператварылася ў канфедэрацыю самастойных даменаў. Яе намінальнае адзінства змацоўвалася традыцыйным старшынствам Полацка, як стольнага гораду зямлі, і крэўнай роднасцю паміж уладарамі розных даменаў, якія ўсе належалі да аднае дынастыі. Разам з тым палітычная і эканамічная адасобленасць даменаў няўмольна раздзірала дзяржаву на часткі. Нават голас крыві адыходзіў на другі план, калі князі дзеля абароны інтарэсаў сваіх і свайго ўдзелу не вагаліся ўздымаць меч на братоў і іншых сваякоў. Таксама паспрыялі дзяржаўнай дэцэнтралізацыі Полаччыны неразвітасць дзяржаўнай іерархіі і вельмі простая тытулатура. Полацкі князь быў толькі першым сярод роўных і не меў фармальнай перавагі над князямі Менска й іншых гарадоў. Калі ў краінах Заходняй Еўропы каралі маглі стрымліваць незалежніцкія памкненні сваіх васалаў, абапіраючыся прынамсі на аўтарытэт свайго тытулу і ягоную перавагу над іншымі, то роўнае ўжыванне ў дачыненні да ўладароў усіх даменаў Полаччыны тытулу «князь» значыла і замацаванне фармальнае роўнасці асобных княстваў.

Такая самастойнасць утрымлівала для Менска як перавагі, так і пэўную небяспеку. Менск, хоць і з'яўляўся трэцім па велічыні пасля Полацка і Віцебска горадам Полаччыны[1], меў значэнне найперш як крэпасць на яе паўднёвых рубяжах[2]. Адпаведна, важным рэсурсам яго існавання была эканамічная і людская падтрымка з боку Полацка. Менск быў рачэй ваенным пасяленнем, як палітычным і эканамічным цэнтрам. Невялікая палітычная вага і слабасць эканомікі, выкліканая маланаселенасцю тэрыторыі, аддаленасцю ад асноўных водных гандлёвых шляхоў і цяжкасцю земляробства на неўрадлівых глебах Меншчыны, рабілі перспектывы Менска на будучыню вельмі цьмянымі. У такіх неспрыяльных умовах наўрад ці ён стаў бы большым за дробны ўдзельны гарадок, калі б улада над ім не апынулася ў руках чалавека, які інтуітыўна ці свядома зразумеў інтарэсы свайго гораду, іх еднасць з уласнымі інтарэсамі і пачаў мэтанакіраванае і часам жорсткае іх ажыццяўленне.

Такім чалавекам вялікіх здольнасцяў і сілы, які паспрабаваў прынесці гораду шчаслівейшую фартуну, быў Глеб Усяслававіч. У спадчыну ад свайго бацькі ён атрымаў такія рысы, як ваяўнічасць і «няміласць на кровапраліццё». Глеб таксама вылучаўся рашучасцю і здольнасцю не трымцець перад пагрозамі мацнейшых. Як паказаў ягоны ўдзел у гандлі рабамі, ён не спыняўся і перад парушэннем нормаў маралі, што выклікала агіду нават у тых сучаснікаў, якія не вылучаліся мяккасцю і дабрынёй, кшталту Уладзіміра Манамаха. Тым не менш, гэтыя непрывабныя рысы спалучаліся ў Глебе з вельмі выразнай нават для таго часу рэлігійнасцю, пра што сведчаць ягоныя багатыя ахвяраванні Кіева-Пячорскаму манастыру[3]. Сувязі Глеба з манастыром былі настолькі блізкія, што ён

стаў адным з нешматлікіх князёў, якія атрымалі гонар быць пахаванымі там[4]. Зрэшты, гэта магло быць прыёмам дыпламатыі і сродкам непрамога ўплыву на сваіх супернікаў — кіеўскіх князёў. Спалучэнне гэтых рысаў характару, досыць тыповае для ваяра і дзяржаўнага дзеяча, дапамагло яму стацца адной з найбольш яркіх постацяў нашай гісторыі XII ст.

Найпершай мэтай Глеба было палітычнае ўзмацненне Менска адносна суседніх дзяржаваў, якія былі верагоднымі супернікамі. Гэта магло быць дасягнута шляхам тэрытарыяльнага пашырэння і захопу суседніх земляў, што непазбежна вяло да сутыкнення з моцнымі суседзямі, найперш Кіеўскай дзяржавай, смаленскія і турава-пінскія ўладанні якой шчыльна прылягалі да Меншчыны. Але гэтай мэты немагчыма было дамагчыся, не падтрымаўшы сваіх палітычных прэтэнзіяў эканамічнымі рэсурсамі. Таму яшчэ адным кірункам дзейнасці Глеба было больш шчыльнае засяленне Меншчыны і выхад да асноўных у той час водных гандлёвых шляхоў.

Надзейным сродкам для ажыццяўлення сваіх планаў у руках Глеба было менскае войска, якое мела даўні досвед удзелу у шматлікіх войнах Усяслава. Ягоная арганізацыя можа быць адноўленая па падабенству з полацкай. Асновай войска была княская дружына. Яна складалася з дзвюх частак — малодшай, падпарадкаванай непасрэдна князю, і старэйшай — княскіх баяраў, якія прыводзілі атрады сваіх ваяроў. У выпадках неабходнасці збіралася гарадское і сельскае апалчэнне[5]. Дружыннікі былі прафесійнымі ваярамі і мелі на ўзбраенні шаломы, кальчугі, пласцінкавыя панцыры, дзіды і мячы[6]. Апалчэнне было збольшага ўзброенае дзідамі й сякерамі[7]. Менскімі войскамі магла выкарыстоўвацца як рэгулярная тактыка правільнага бою, так і рэгулярная тактыка нечаканых нападаў і засад.

Магутным сродкам дыпламатыі для Глеба маглі быць ягоныя дынастычныя сувязі — шлюб з Настассяй, дачкой Яраполка Ізяслававіча, унука Яраслава Мудрага[8]. Шлюб гэты меў свае карані ў надзвычай складаных дачыненнях Глебавага бацькі Усяслава з трыма братамі Яраслававічамі: Ізяславам, Святаславам і Усеваладам. Калі ў 1060-я — пачатку 1070-х гг. браты выступалі супраць Усяслава маналітным хаўрусам, то ўжо ў 1073 г. гэты маналіт даў глыбокую трэшчыну і Ізяслаў быў сагнаны Святаславам і Усеваладам з кіеўскага стальца за тое, што нібыта чыніў супраць іх змовы з Усяславам[9]. Гэтая падзея паказвае, што паміж Яраслававічамі, якія падзялілі паміж сабой спадчыну свайго бацькі, існавалі вострыя супярэчнасці, у якія Усяслаў не спудлаваў забіць клін, наладзіўшы зносіны са старэйшым братам — Ізяславам і яго нашчадкамі. Амаль дакладна можна сцвярджаць: менавіта ён быў ініцыятарам шлюбу Глеба з Настассяй Яраполкаўнай. Гэты палітычны звяз атрыманы ў спадчыну Усяслававічам і Ізяслававічам, якія, як раней іхныя бацькі, з яго дапамогай супрацьдзейнічалі Святаслававічам і Усеваладавічам. Прынамсі, як паказалі пазнейшыя падзеі, Глеб мог разлічваць на ўскосную падтрымку дзядзькі сваёй жонкі, кіеўскага князя Святаполка Ізяслававіча, які быў зацікаўлены ў Глебе як сродку ціску на Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха і іншых сваіх супернікаў[10].

З гэтымі рэсурсамі Глеб і распачаў свае дзеянні. Цяпер, каб зразумець хаду падзеяў, неабходна зазірнуць на некалькі гадоў наперад. Пры апісанні падзеяў 1116 г., Іпацеўскі летапіс паказвае Друцк, Оршу і Копысь як падначаленыя ці хаўрусныя Глебу гарады[11]. З гэтага вынікае, што свой першы погляд ён звярнуў на Падняпроўе і звязаны з ім гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Друцк быў добра ўмацаванай крэпасцю, якая прыкрывала Менск з усходу і панавала над цячэннем Друці, аднаго з вялікіх прытокаў Дняпра. Орша і Копысь знаходзіліся непасрэдна на Дняпры, што дазваляла браць мыта з гандляроў, якія кіраваліся гэтым шляхам, а таксама прываблівіць купцоў непасрэдна ва ўладанні менскага князя. Гэта давала добры прыбытак у княскі скарб і ўзбагачала іншыя слаі менскага насельніцтва.

Узяцце Друцка войскамі Давыда Святаслававіча і Яраполка Уладзіміравіча ў 1117 г. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.



Макет Ю. Драгуна паводле рэканструкцыі Э. Загарульскага.

З падпарадкаваннем Друцка, яшчэ аднаго ўдзельнага княства Полаччыны, Глеб не павінен быў мець шмат цяжкасцяў, бо там на яго глядзелі як на законнага прадстаўніка адгалінавання сваёй дынастыі. Аб Оршы і Копысі справа ішла іншым чынам. Існуе меркаванне, што абодва гарады маглі быць перададзеныя Полацкаму княству трыма князямі Яраславічамі яшчэ ў 1060 г. пры Усяславе ў адплату за ўдзел апошняга ў паходзе на торкаў[12]. Але ў пачатку XII ст. яны найбольш верагодна належалі да Смаленскага княства, дзе правіў сын тады яшчэ пераяслаўскага князя Уладзіміра Манамаха Яраполк. Каб завалодаць імі, Глеб мусіў нейкім чынам пераадолець ягоны супраціў.

Падпарадкаванне Оршы і Копысі, мусіць, адбылося неўзабаве пасля ўзыходжання Глеба на менскі сталец, бо паход супраць яго быў арганізаваны ўжо ў 1104 г. У паходзе ўзялі ўдзел кіеўскія войскі пад кіраўніцтвам ваяводы Пуцяты і войскі Манамаха, якія ўзначаліў ягоны сын Яраполк. Чарнігаўскі князь Алег Святаслававіч выправіўся ў паход сам. Хаўруснікі накіраваліся на Менск, але «не успеша ничтоже и възвратишася опять»[13]. Прычынай паразы паходу мог быць неахвотны, як найменей, удзел у ім Святаполка, які выправіў замест сябе ваяводу і не быў зацікаўлены ў паразе Глеба. Ускосным доказам патурання Святаполка Глебу можа служыць той факт, што наступны паход супраць Глеба адбыўся толькі ў 1116 г., праз тры гады пасля смерці першага. У выніку Глеб застаўся гаспадаром ладнага ўчастку дняпроўскага шляху.

І ўсё ж якія б выгоды не прыносіў збор мыта на Дняпры, уласная вытворчасць маланаселенай, укрытай збольшага балотамі і лясамі Меншчыны была вельмі слабая. Стагоддзямі выпрабаваным спосабам вырашэння гэтай праблемы быў вывад у палон людзей з іншых тэрыторыяў і ўладанняў, што Глеб і рабіў з вялікім размахам, вылучыўшыся ў гэтым нават сярод жорсткіх сярэднявечных уладароў. Паводле гісторыка XIX ст. Тэадора Нарбута, ён неаднаразова нападаў як на літоўскія, так і на суседнія славянскія землі з мэтай вываду палону. Гэтыя напады суправаджаліся спусташэннямі і зверствамі. Акрамя рассялення палонных на сваіх землях, Глеб і ягоныя баяры займаліся продажам іх у рабства. Гэты гандаль быў пастаўлены на шырокую аснову і прыносіў вялікія прыбыткі. Цэнтрам гандлю рабамі стаў Друцк[14]. Цяжка сказаць, наколькі дакладна Нарбут пераказваў звесткі сваіх крыніцаў і ці не занадта змрочнымі фарбамі намаляваў ён партрэт Глеба ў сваім эмацыйным аповедзе. Тым не менш ягоныя словы пацвярджаюцца сведчаннем тагачаснай крыніцы — «Павучання» Уладзіміра Манамаха, дзе той кажа, што Глеб яго «люди заялъ»[15]. Гэтае паведамленне тычыцца нападу Глеба на тады падуладны Кіеву Слуцк у 1116 г.[16]. Горад быў бязлітасна спалены, а жыхары выведзеныя ў палон. Гэткім чынам менскаму князю ўдавалася засяляць бязлюдныя землі свайго княства і атрымліваць імгненную выгаду ад гандлю жывым таварам. У дадатак ягоныя паходы суправаджаліся рабункам іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. Ладная частка прыбыткаў, вядома, накіроўвалася на ўтрыманне войска і фінансаванне далейшых ваенных акцыяў. Фактычна за паўтысячагоддзе да славутага правадыра найманых полчышчаў Валенштэйна Глеб паспяхова ажыццявіў сумна вядомы прынцып: вайна корміць вайну.

Але напад на Слуцк выклікаў цяжкія для Глеба наступствы. У гэты час кіеўскім князем ужо быў Уладзімір Манамах, які ўзышоў на кіеўскі сталец у 1113 г. пасля смерці Святаполка. Разаслаўшы сваіх сыноў княжыць па розных гарадах, ён непасрэдна панаваў над большай часткай Кіеўскай дзяржавы, а сваіх супернікаў князёў Святаслававічаў прымусіў трымаць з сабой прыязныя дачыненні.

Улагодзіўшы нутраныя праблемы, Манамах вырашыў назаўсёды ўтаймаваць Глеба і вырашыць праблему пагрозы сваім уладанням з паўночнага захаду. Ён накіраваў да Глеба пасольства з суворым асуджэннем і парадай устрымацца ад далейшых варожых

дзеянняў. Глеб ганарліва і непрыязна сустрэў паслоў, якім, у сваю чаргу, выказаў пагрозы ў адрас Манамаха. Пасля правалу пасольства той напрыканцы 1116 г. самастойна выправіўся ў паход на Менск разам з сынамі Яраполкам і Вячаславам, смаленскім князем, і быў крэўна зацікаўлены ў вяртанні Оршы і Копысі, а таксама Давыдам Святаслававічам чарнігаўскім. У студзені 1117 г. войскі Вячаслава ўзялі Оршу і Копысь, а Яраполк і Давыд — Друцк. Пасля гэтага хаўруснікі падступілі да Менска. Глеб напачатку збіраўся адседзецца ва ўмацаваннях гораду. Але, убачыўшы, што яны рыхтуюцца да доўгатэрміновай аблогі, вымушаны быў разам з сям'ёй і баярамі выйсці з гораду і прасіць Манамаха аб літасці[17]. Нягледзячы на відавочную паразу Глеба, два бакі вымушаны былі пайсці на стратэгічны кампраміс. Глеб вырашыў праявіць пакорлівасць і такім чынам захаваць большую частку сваіх уладанняў. Манамах не стаў выпрабоўваць ваенную фартуну і вырашыў замацаваць вяртанне Оршы і Копысі мірным шляхам.

Мір, аднак, не пратрымаўся доўга. У 1119 г. Глеб, спрабуючы вярнуць страчанае, ізноў напаў на Смаленскую і Новагародскую землі (незразумела, ці гаворка ішла аб Ноўгарадзе Вялікім ці Наваградку)[18]. Манамах у адказ выправіўся ў паход на Менск, узяў яго, паланіў Глеба і прывёз у Кіеў, дзе той неўзабаве памёр[19]. Меншчына была далучана да Кіеўскай дзяржавы.

Глеб, энэргічны і рашучы, дапусціў шэраг памылак, якія дорага каштавалі яму і Менску. У натуральным для дзяржаўнага дзеяча імкненні ўзмацніць сваю дзяржаву Глеб не здолеў трымацца меры. Ён пераацаніў свае сілы і выступіў супраць Кіеўскае дзяржавы ў неспрыяльны момант, калі не мог разлічваць на яе нутраныя супярэчнасці. Больш за тое, на кіеўскім стальцы сядзеў ягоны вораг Манамах, якому ўдалося паставіць пад сваю ўладу бальшыню кіеўскіх даменаў. Пры такой неспрыяльнай палітычнай сітуацыі рэсурсы Меншчыны былі занадта малыя, каб можна было разлічваць на ваенную перамогу. «Эканоміка вайны» Глеба, якая прыносіла такія прыбыткі, таксама дала свой адмоўны вынік. Нават па мерах XII ст. вывад палону і гандаль рабамі ў такіх маштабах неслі занадта вялікую пагрозу жыццю і ўласнасці падданых Кіеўскай дзяржавы, каб дараваць. Гэта было яшчэ адной з прычынаў жорсткага адказу Кіева на паходы Глеба.

У летапісах няма звестак, дзе знаходзіліся Глебавы сыны Расціслаў, Валадар і Усевалад, пакуль Менск знаходзіўся пад кіеўскай уладай. Можна меркаваць, што адным з верагодных месцаў перабывання была Літва, даўні васал Полацка. Пасля распаду Полаччыны на асобныя княствы васалітэт некаторых літоўскіх князёў, хутчэй за ўсё, дастаўся ў спадчыну Менску з прычыны геаграфічнай блізкасці да Літвы. Магчымасць такога развіцця падзеяў ускосна пацвярджаецца тым, што менавіта ў Літве пазней перахоўваўся і збіраў свае сілы Валадар падчас нашэсця полацкага войска[20]. Яшчэ адным бяспечным месцам для Глебавічаў магла быць Польшча. Падставай для гэтага служыць факт шлюбу Валадара з Рыкісай, дачкой польскага караля Баляслава Крываротага. Шлюб гэты адбыўся каля 1135 г.[21].

Глебавічы вярнуліся да ўлады ў Менску пасля 1135 г., калі кіеўскі стаўленік Ізяслаў Мсціслававіч выехаў з Менска і затым атрымаў княжанне ва Уладзіміры Валынскім, больш у Менск не вярнуўшыся[22]. Па смерці Уладзіміра Манамаха і ягонага сына Мсціслава Кіеўская дзяржава канчаткова распадалася на асобныя княствы і не мела дастаткова сілаў, каб утрымаць у падпарадкаванні здаўна варожы ёй Менск.

Усё ж, нягледзячы на паслабленне Кіева, сумны досвед Глеба паказаў, што экспансія ў паўднёвым і ўсходнім кірунках можа



Менск XII–XIII стст. Рэканструкцыя Э. Загарульскага.



Усходняя частка менскай крэпасці. Рэканструкцыя Э. Загарульскага.

быць небяспечнай для Менска, аж да страты самой незалежнасці. Таму асноўным напрамкам знешняй палітыкі Глебавічаў стаў полацкі. У выпадку поспеху падпарадкаванне Полацку магло значна ўзмацніць Менск палітычна й даць яму панаванне на Дзвіне, па якой ішоў ажыўлены гандаль з балтыйскімі краінамі. Для ажыццяўлення гэтай мэты Расціслаў і Валадар мелі добрыя шанцы і законныя падставы, каб прэтэндаваць на ўладу ў Полацку, як нашчадкі Усяслава Чарадзея. А падзеі ў Полацку далі ім для гэтага добрую нагоду.

У 1151 г. полацкае веча пазбавіла ўлады князя Рагвалода Барысавіча і запрасіла на княжанне Расціслава Глебавіча. Гэткім чынам менскі князь бяскроўным шляхам стаў гаспадаром Полацка і аб'яднаў пад сваёй уладай большую частку Полаччыны[23]. Рагвалода ж увязнілі ў Менску. Глебавічы збіраліся трывала замацавацца ў Полацку і наладзіць сувязі з балтыйскімі краінамі, пра што выразна кажа шлюб паміж Соф'яй Валадараўнай і дацкім каралём Вальдэмарам Кнутсанам у 1157 г.[24].

Але княжанне Расціслава не працягнулася доўга. У хуткім часе Рагвалод быў выпушчаны з вязніцы, а ў 1158 г. ён з дапамогай северскага князя Святаслава Ольгавіча сцвердзіўся ў Друцку. Спробы Расціслава ўзяць Друцк былі няўдалымі, і ён заключыў з Рагвалодам мір, замацаваўшы яго крыжацалаваннем і перадачай Рагвалоду некалькіх воласцяў. Дачыненні Расціслава з полацкім вечам тым часам вельмі пагоршыліся. Гэта магло быць выклікана яго нежаданнем лічыцца з воляй веча ці прыўлашчваннем на сваю карысць мыта ад падзвінскага гандлю і падаткаў. Злосць на Расціслава дасягнула такой ступені, што ягоныя супраціўцы хацелі забіць яго падчас царкоўнага свята. Папярэджаны прыхільнікамі, ён надзеў даспехі пад вопратку, і ворагі не наважыліся выканаць свой намер. Яны пачалі рыхтаваць другую спробу, але Расціслаў не выпрабоўваў лёс. Ён сабраў дружыну і выехаў у Менск, дарогаю рабуючы полацкія землі і ўганяючы за сабой людзей і быдла. Рагвалод вярнуўся на полацкі сталец. Цяпер канфлікт паміж Менскам і Полацкам мог быць вырашаны толькі вайной[25].

З 1159 па 1161 год Рагвалод зрабіў тры паходы на Менскае княства. Нягледзячы на прыцягненне вялікіх вайсковых сілаў (у першым паходзе акрамя палачанаў бралі ўдзел смаляне, наўгародцы і пскавічы), адзіным ягоным поспехам быў часовы захоп Ізяслаўля (Заслаўя). У выніку ён вымушаны быў заключыць чарговы мір з Расціславам, змацаваўшы яго цалаваннем крыжа. Але Валадар крыжа не цалаваў, бо ён «ходяше под Литвою в лесех»[26].

У гэты момант наперад выступаюць новыя дзейныя асобы менскай гісторыі — князь Валадар Глебавіч і ягоныя літоўскія васалы. Мужны і рашучы, як дзед, бацька і брат, Валадар меў і дадатковыя якасці, якія дапамаглі яму дабіцца вялікіх перамог. Гэта выключнае ваеннае майстэрства, упартасць і здольнасць ператрываць цяжкі час, каб дачакацца свайго шанцу і паспяхова скарыстаць яго. Напэўна, менавіта таму ён не заключаў мір з Рагвалодам, а мэтанакіравана збіраў сілы для ўдару ў адказ. Ён не памыліўся і з выбарам сваіх хаўруснікаў. Даўнія васалы полацкіх князёў літоўцы былі грознымі ваярамі. Іхнія войскі складаліся з хуткіх конных дружынаў, якія на сваіх конях маглі рабіць імклівыя набегі, і стойкіх пешых апалчэнняў[27]. Літоўцы маглі як наносіць нечаканыя ўдары з засады, так і аказаць трывалы супраціў у палявым баі, пашыхтаваўшыся ў тры шэрагі, падобна фалангe[28]. Іхная якасная

зброя высока цанілася ў суседніх краінах і лічылася каштоўнай здабычай[29]. Праз некаторы час яны пачнуць прэтэндаваць на дамінаванне над землямі Полаччыны, але пакуль ішлі на вайну пад рукой менскіх князёў.

У 1162 г. Рагвалод здзейсніў чарговы паход на Меншчыну. Гэтым разам ён быў скіраваны супраць Валадара, а не Расціслава. Можна меркаваць, што Расціслаў да гэтага часу памёр, а Валадар пераняў у яго ўладу над Менскам. Пры набліжэнні войскаў Рагвалода ён засеў ва ўмацаваннях Гарадца і не ўступаў у бой, адчуваючы колькасную перавагу супраціўца. Але не збіраўся паўтараць пасіўную абарончую тактыку Расціслава. Уначы ўчыніў нечаканую вылазку з гораду з літвой і дашчэнту разграміў полацкае войска. Шмат палачанаў загінула і шмат пераможцы пабралі ў палон голымі рукамі. Баючыся расправы за ганебную паразу, Рагвалод не адважыўся вярнуцца ў Полацк. Веча абрала новым князем Усяслава Васількавіча[30].

Цяпер, адбіўшы пагрозу з боку Полацка, Менск і сам мог пагражаць сваёй былой сталіцы і прэтэндаваць на панаванне ва ўсёй Полаччыне. Але Валадар не быў схільны да паспешлівых дзеянняў. Толькі ў 1167 г., замацаваўшы ўладу ў Менску і назапасіўшы сілы, ён рушыў на Полацк. Усяслаў выступіў насустрач. У бітве, якая затым адбылася, Валадар зноў выявіў свой выключны ваенны талент. Са словаў летапісу можна зразумець, што полацкая княская дружына і гарадское апалчэнне рухаліся паасобна. Сувязі паміж часткамі войска не было. Па нечаканасці нападу мянянаў можна меркаваць, што выведка і ахова



Гарадзец. Малюнак Язэпа Драздовіча.

таксама наладжаныя не былі. Таму Валадару зноў удалося скарыстаць фактар нечаканасці і некалькімі раптоўнымі атакамі разбіць полацкае войска па частках, з'явіўшы проста класічны прыклад выкарыстання правілаў ваеннага майстэрства. Пасля бітвы ён заняў Полацк, а веча прызнала яго законным князем. Усяслаў уцёк у Віцебск да князя Давыда Расціслававіча[31].

Пасля рашучай перамогі менскі князь мог лічыць сябе гаспадаром большае часткі Полаччыны. Але справа не была завершана, пакуль у Віцебску сядзелі ягоныя супраціўцы, якія да таго ж чакалі сабе ў дапамогу смаленскага князя Рамана Расціслававіча. Таму ён неадкладна выступіў на Віцебск. Падчас паходу ўначы ўзнялася страшэнная бура, якая напалохала і цалкам здэмаралізавала забабонных ваяроў Валадара. Яны палічылі гэта за благі знак і запатрабавалі весці іх назад (калі частка войска складалася з літоўцаў, яны маглі папросту скарыстаць гэта як нагоду, каб не працягваць рызыкоўную барацьбу за чужыя ім менскія інтарэсы і спакойна вярнуцца дадому з ужо заваяванай здабычай). Як бы там ні было, але адступленне перайшло ва ўцёкі. У пагоню за ўцекачамі кінуўся Давыд. Многія з іх заблыталіся ў незнаёмай мясцовасці і трапілі ў палон. Усяслаў вярнуўся на княжанне ў Полацк[32]. Летапісныя звесткі пра Валадара на гэтым абрываюцца. Так няўдала скончылася смелая спроба менскіх князёў дамагчыся панавання над Полаччынай.

Вядома ж, можна было б лічыць гэтую паразу адной з тых выпадковасцяў, якія часта ўмешваюцца ў знешне заканамерны ход гісторыі. Але наўрад ці гэтая акалічнасць магла б спыніць мужнага і рашучага Валадара на шляху да ягоных мэтаў, дзеля чаго ён сам і ягоныя брат і бацька прыклалі так шмат намаганняў. Хутчэй за ўсё, спыненне барацьбы Валадара за Полацк было прадыктавана знешнепалітычным становішчам і недахопам сілаў і рэсурсаў у Менскага княства. Празмернае ўмацаванне пазіцыяў Менску ў краі парушала міждзяржаўную раўнавагу. Суседнія дзяржавы не маглі з гэтым мірыцца, як тое і паказала ўмяшальніцтва Смален-

ска. А шанцы перамагчы моцную кааліцыю былі няпэўныя. Паслабілі Менск і людскія страты. Маланаселеная Меншчына не магла пастаянна выстаўляць усё новых і новых людзей у войска, хай сабе і ў хаўрусе з Літвой. І нават пры пастаянным прытоку ваеннай здабычы эканоміка Меншчыны не мела досыць рэсурсаў, каб вытрымліваць доўгачасовую ваенную нагрузку. Валадар мусіў разумець гэта.

Але шматлікія паходы і бітвы не прайшлі дарэмна. Яны былі не проста праявай княскай пыхі ды хцівасці ці дэманстрацыяй ваеннага майстэрства менскіх ды літоўскіх дружынаў. Вынікам вайны стала неад'емная супрацьлегласць — мір. Хоць Менск і знік са старонак летапісаў на доўгія гады і не згадваўся як магутная палітычная ці ваенная сіла, але не згадваўся ён і як аб'ект варожых нашэсцяў і заваяванняў. Верагодна, паходы Глеба, Расціслава і Валадара зрабілі засцерагальны ўплыў на суседзяў, якія не рызыкавалі кранаць ваяўнічых мянян. Гэтыя войны таксама мелі значны ўплыў на эканамічнае развіццё Меншчыны. Рассяленне палонных, прыток матэрыяльнай здабычы і збор мыта на гандлёвых шляхах паспрыялі росту вытворчасці і абмену. Пра гэта яскрава сведчаць археалагічныя звесткі: калі ў XII ст. культурны слой Менска складаў 60—80 сантыметраў, то ў XIII ст. — ужо каля двух метраў[33]. Менскія князі забяспечылі свайму гораду не толькі бяспеку і эканамічнае развіццё, але і захаванне яго становішча. Ён не заняпаў, як Друцк ці Галоцічаск, а ўсё больш узвышаўся ў параўнанні з суседнімі гарадамі: Лагойскам, Заслаўем і іншымі, набываючы значэнне не толькі цвердзі й ваеннай базы княскай дынастыі, але і цэнтру, вакол якога засяроджвалася палітычнае й эканамічнае жыццё краю. Менск рос, каб са зменай палітычнай сітуацыі і развіццём сухапутных шляхоў зносінаў з цэнтру княства стаць галоўным горадам ваяводства, губерні, а калі надарыцца гістарычная магчымасць, то і сталіцай краіны.

ЗАЎВАГІ

[1] Штыхов Г. Города Полоцкой земли. — Мн., 1978. — С. 123.

[2] Археалогія Беларусі. Т. 3. — Мінск, 2000. — С. 229.

[3] Ипатьевская летопись. — Москва, 1998. — Ст. 259.

[4] Житье и хоженье Данила, Русьскыя земли игумена // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя. — Мн., 2003. — С. 138.

[5] Ласкавы Г. Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI — пачатку XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. Ч. 1. — Мінск, 1993. — С. 6—17.

[6] Кирпичников А. Древнерусское оружие. Вып. 1. — Ленинград, 1966. — С. 59.

[7] Тамсама. Вып. 2. 1967. С. 21—22.

[8] Ипатьевская летопись. Ст. 492. Загорульский Э. Генеалогия полоцких князей Изяславичей. — Мн., 1994. — С. 10.

[9] Ипатьевская летопись. Ст. 172—173.

[10] Загорульский Э. Возникновение Минска. — Мн., 1982. — С. 15—16.

[11] Ипатьевская летопись. Ст. 282—283.

[12] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. — Мінск, 2001. — С. 110—111.

[13] Ипатьевская летопись. Ст. 256.

[14] Narbutt T. Dzieje starożytne narodu litewskiego. T. 3. — Wilno, 1837. — S. 271—273.

[15] Владимир Мономах: завещено потомкам. — Ярославль, 1999. — С. 26.

[16] Ипатьевская летопись. Ст. 282.

[17] Тамсама. Ст. 282—283.

[18] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. С. 169—170.

[19] Ипатьевская летопись. Ст. 285.

[20] Тамсама. Ст. 496.

[21] Bo Lindwall. Konung Erik XIV:s antavla i fjorton generationer // Site «Nättidningen RÔTTER», http://www.genealogi.se/ — At: http://www.genealogi.se/erik.htm — 18.10.2004.

[22] Лаврентьевская летопись. — Москва, 2001. — Ст. 302.

[23] Ипатьевская летопись. Ст. 445—446.

[24] Красивая кожа // Джаксон Т. Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI — середина XIII в.). — Москва, 2000. — С. 167.

[25] Ипатьевская летопись. Ст. 493—496.

[26] Тамсама. Ст. 496.

[27] Пашуто В. Образование Литовского государства. — Москва, 1959. — С. 355—356, 361.

[28] Ипатьевская летопись. Ст. 856.

[29] Пашуто В. Образование Литовского государства. С. 255—256.

[30] Ипатьевская летопись. Ст. 519.

[31] Тамсама. Ст. 526.

[32] Тамсама. Ст. 526—527.

[34] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 194.

Георгій НАВІЦЫЯН.

Выява Беларусі на мапе Ідрысі

Арабскі географ сярэдзіны XII ст. ал-Ідрысі (Абу 'Абдалах Мухамад ібн Мухамад ібн 'Абдалах ібн Ідрыс ал-Хамудзі ал-Хасані), які жыў на двары хрысціянскага караля Рожэра II у Палерма, пакінуў пасля сябе некалькі працаў, улучна сусветную геаграфічную энцыклапедыю «Нузхат ал-муштак» і яе перапрацаваны скарочаны варыянт, вядомы пад умоўнай назваю «малы Ідрысі». Абедзве працы суправаджаюцца дбайна і рупліва выкананымі сусветнымі геаграфічнымі атласамі, складзенымі паводле тэкстаў твораў. Нягледзячы на тое, што гэтыя працы ўтрымліваюць даволі значны матэрыял, датычны геаграфіі Усходняй Еўропы (каля 70 тапонімаў), ім, так бы мовіць, не пашанцавала ў айчыннай гістарыяграфіі — яны не прыцягнулі да сябе ўвагі. Часткова сітуацыю можна тлумачыць звыклай экзатычнасцю арабскіх крыніцаў для вывучэння на іх падмурку гісторыі Старажытнай Русі, часткова досыць познім часам іх стварэння (звесткі арабскіх географаў класічнай школы — ал-Істахры і ібн Хаукала — вядомыя значна шырэй, хоць датычна русаў у іх прыгадваюцца толькі тры тапонімы — знакамітыя, але так і надалей спрэчныя, цэнтры Русі Куйаба, Артанія і Славія). Дастаткова зацеміць, што на рускай мове першую спецыяльную работу, прысвечаную мапе Ідрысі, напісаў у 1952 г. не знаўца Усходу, а археолаг — акадэмік Б. Рыбакоў, які абапіраўся на французскі пераклад П. А. Жабэра, выкананы яшчэ ў 1836—1840 гг. Спецыяльнае манаграфічнае даследаванне «Нузхат ал-муштак» з'явілася на паўстагоддзе пазней — у 1999 г. выйшла работа І. Канавалавай. У той жа час замежнае ідрысазнаўства развівалася не хутка, але бесперарыўна — Тамашэк, Недкаў, Левіцкі, Тальгрэн-Тууліё. Больш новыя працы можна пералічыць хіба ў спецыяльным артыкуле. Зразумела, у тых навуковых матэрыялах замежных даследнікаў Усходняй Еўропе надаецца толькі другараднае значэнне.

Пасля выдання ў Італіі ў 1970—1984 гг. поўнага крытычнага тэксту «Нузхат ал-муштак» у 2001 г. быў зроблены наступны крок — французская фірма «Montparnasse multimedia» сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Францыі ажыццявіла поўнае электроннае выданне аднаго з найбольш поўна захаваных рукапісаў «Нузхат ал-муштак» — парыжскага. На кампакт-дыску можна знайсці прыгаданае крытычнае выданне, поўны французскі пераклад (Жабэра, але выпраўлены і дапоўнены), адсканаваныя з высокай якасцю аркушы атласу Ідрысі з парыскага рукапісу, і вялікую колькасць навучальных ды тлумачальных матэрыялаў. Гэты кампакт-дыск пашырае нямецкая інтэрнэт-фірма Digento па адрасе http://www.digento.de/titel/100074.html, так што цяпер «Нузхат ал-муштак» з'яўляецца найбольш даступным усходнім атласам і сусветнай геаграфіяй. Менавіта яго адкрытасць да шырокага чытацкага кола дае падставы спадзявацца на ўздым цікаўнасці да твору Ідрысі і прыцягненне яго ўсходнееўрапейскіх матэрыялаў да вывучэння гісторыі рэгіёну. Тым больш што гэта — самы ранні па часе паўстання атлас, на якім паказаная Усходняя Еўропа. Не лічачы, вядома, атласу Пталемея, славутага эліністычнага астранома і касмографа II ст., тапонімы якога скрозь спрэчныя, ды і самі «пталемееўскія» карты не аўтэнтычныя, бо выкананыя ўжо ў XV—XVI ст. еўрапейцамі на падставе пталемееўскіх інструкцыяў і каардынатаў.

Дадамо, што для «Нузхат ал-муштак» 2004 год юбілейны. Паколькі ў самім творы указаны час заканчэння працы, які адпавядае пачатку 1154 г. (дарэчы, Нестар пісаў «Аповесць мінулых гадоў» у 1110-х гадах, г. зн. толькі на паўстагоддзе раней за Ідрысі — абедзве працы амаль сінхронныя), то ў 2004 г. яму споўнілася 850 гадоў. Да гэтага юбілею прымеркавана гэтае даследаванне па выяве Беларусі на мапе «Нузхат ал-муштак».

Ідрысі быў нашчадкам высакароднай арабскай сям'і, які прысвяціў жыццё навуковым даследам. Запрошаны на двор сіцылійскага герцага (а затым караля) Рожэра II нарманскага паходжання, ён прысвяціў напісанню «Нуз-

хат ал-муштак» 15 гадоў (1139—1154). Спалучэнне старадаўніх арабскіх традыцыяў з практычнымі ведамі скандынаваў мае асаблівае значэнне для вывучэння Старажытнай Русі: Ідрысі мог бы патлумачыць таямніцу трох цэнтраў Русі, і загадку Рускага каганату, і праліць святло на варажскае пытанне. Падрабязнае вывучэнне звестак па Усходняй Еўропе не пацвярджае такіх аптымістычных спадзяванняў. Ідрысі мала цікавіла гісторыя, ён апісваў менавіта геаграфію рэгіёну. І яго крыніцы належалі да дзвюх традыцыяў. Паводле ібн Хаукала, прадстаўніка класічнае школы арабскай геаграфіі, ён апісвае тыя рэгіёны, для якіх у яго неставала сучасных звестак — Паволжа і больш усходнія рэгіёны. Русь ён апісвае паводле звестак сучасных яму падарожнікаў. Гэта італьянцы, знаку выкарыстання ім скандынаўскіх (і рускіх) крыніцаў у Ідрысі няма. Таму, як ні дзіўна, Ідрысі хутчэй перадае еўрапейскую, чым усходнюю, геаграфічную традыцыю, што вылучае яго сярод усходніх пісьменнікаў. Пры гэтым нічога агульнага паміж русамі і скандынавамі Ідрысі не знайшоў.

Інфарматары Ідрысі канцэнтраваліся на гандлі, пераважна далёкім. Цікаўнасці іх сягалі ад берагоў Чорнага мора да Балтыкі, і рэгіён абмаляваны ў выглядзе сукупнасці гандлёвых трактаў — пералічэння паслядоўнасці гарадоў з указаннем адлегласцяў паміж імі, часам — накірункаў руху. Якраз да лакалізацыі тапонімаў зводзіцца праблема даследавання «Нузхат ал-муштак».

Акрамя народаў Паволжа, аповед пра якія ў асноўным адпавядае ібн Хаукалу (другая палова X ст.), Ідрысі ведае ва Усходняй Еўропе 3 народы: русаў, ан-нібарыйа і куманаў. Дарэчы, этнонім саклабаў-славянаў ён выкарыстоўвае толькі ў дачыненні да паўднёвых славянаў, суседзяў Бізанты; славянаў ува Усходняй Еўропе ён не ведае. Іхныя гарады і цікавяць нас у першую чаргу.

Некалькі дзесяткаў тапонімаў, прыгаданых паслядоўна ўздоўж маршрутаў з паказаннем узаемных адлегласцяў, прадугледжваюць нескладаную лакалізацыю іх на мясцовасці. На жаль, большасць тапонімаў Ідрысі не мае агульнапрынятай лакалізацыі. Асноўная прычына — асаблівасці арабскай графікі, кепска прыстасаванай для перадачы іншамоўных асабістых імёнаў. У арабскай шрыфтавой натацыі частка галосных апускаецца, частка перакручваецца пры ўспрыманні на слых. Аднак і становішча з зычнымі не лепшае. Шмат якія зычныя арабскага алфавіту пішуцца дужа падобна, рознічыся толькі размяшчэннем дыякрытычных кропак. Пры капіяванні кропкі нярэдка апускаюцца альбо перастаўляюцца. Таму арабскі запіс замежнага тапоніму, рэдка даўжэйшы за 4—5 знакаў (часцей — тры), можа быць прачытаны дзесяткамі спосабаў (пры дапамозе дадатку кароткіх галосных і перамяшчэння дыякрытычных кропак у зычных). Гэта прычына таго, чаму бальшыня арабскіх транскрыпцыяў старажытнарускіх гарадоў гучыць абсалютна не па-руску:

«Што тычыцца краіны ар-Русійа, то да гэтай секцыі далучаюцца [наступныя] яе гарады: Луніса, Зала, Саклахі, Галісійа, С(і)нубулі, Бармун(і)са, (А)рман, Барасаніса, Лудж(а)га, Саска, (А)всійа, Кав, Б(а)р(а)зула, Б(а)р(а)злав, К(а)нів, (У)л(і)скі, Муліса» *[пераклад І. Канавалавай]*, — піша Ідрысі. Фанетычна прыгадваюцца назвы рускіх гарадоў: Кав — Кіеў, Баразлав — Пераяслаў, Канів — Канеў, Галісійа — Галіч, і Уліскі — Алеш'е. Дзве трэція тапанімічных назваў застаюцца дастаткова спрэчнымі.

Таму лакалізацыя тапонімаў Ідрысі зводзіцца да размяшчэння цэлых гандлёвых маршрутаў, на якіх неабходна знайсці гарады з паказанымі адлегласцямі паміж імі, чые назвы дапускаюць прыведзеную ў тэксце «Нузхат ал-муштак» транскрыпцыю арабскім шрыфтам з улікам дапушчальных графічных скажэнняў.

Праблемы з лакалізацыяй гарадоў можна прадэманстраваць на прыкладзе таямнічага народу ан-нібарыйа, размешчанага ў Ідрысі на скрайняй поўначы Усходняй Еўропы:

«У прыгаданую Рускую рэку даплываюць шэсць вялікіх рэк, што пачынаюцца ў гары Кукайа, а гэта вялікая гара, якая цягнецца ад мора Цемры да краю населенай зямлі. Гэтая гара пашыраецца да краіны Йаджуджа і Маджуджа на скрайнім усходзе і перасякае яе, ідучы ў паўднёвым кірунку да цёмнага, чорнага мора, якое завецца Смольным. Гэта вельмі высокая гара; ніхто не здатны ўскараскацца на яе з прычыны моцнае сцюжы і глыбокага вечнага снегу на яе вяршынях. У далінах гэтых рэк жыве народ (кавм), вядомы пад найменнем ан-нібарыйа. У гэтага народу ёсць шэсць гарадоў з умацаваннямі, размешчаных паміж рэчышчамі гэтых рэк, што цякуць, як мы ўжо зацемілі, з гары Кукайа. Ніхто не можа скарыць гэтых людзей, яны маюць завядзёнку не развітвацца са зброяй

ні на імгненне, яны надзвычай асцярожныя і абачлівыя».

Назвы гарадоў адсутнічаюць у тэксце, аднак прыведзеныя на мапе: Бука, (А)ст(а)ркуда; Б(а)руні; Буніда; Бу'рада; (А)лгада.

Прапанаваныя лакалізацыі выкладзены ў працы І. Канавалавай: Наўгародская зямля (Канавалава), салтаўская культура ў вярхоўі Паўночнага Данца (Рыбакоў), «у мардоўскіх лясах» (І. Лелевель і К. Мілер, выдавец зводкі па мусульманскай картаграфіі), на поўначы Еўропы — Біярмія, Югра, Мурам (О. Тальгрэн-Тууліё). Як можна заўважыць, згоды няма не толькі па асобных тапонімах, але і па агульным рэгіёне іх размяшчэння. Крытыку дзвюх апошніх лакалізацыяў можна знайсці ў працах Б. Рыбакова й І. Канавалавай.



Краіна ан-нібарыйа на мапе Ідрысі — поўнач унізе (рэканструкцыя І. Канавалавай паводле матэрыялаў К. Мілера).



Краіна ан-нібарыйа на мапе Ідрысі — поўнач унізе (гарады ан-нібарыйа размешчаны пасярод разгалінаваных вытокаў ракі на стыку двух аркушаў у ніжняй частцы мапы).

У сувязі з гэтым можна прапанаваць іншую лакалізацыю прыгаданых тапонімаў, не выносячы іх на самыя ўскрайкі заселенага свету. Найбольш надзейна лакалізуюцца два апошнія гарады:

Бу'рада = Барысаў,

Алгада = Лагожск.

Абодва знаходзяцца ў Беларусі і размешчаны на адлегласці аднаго дня руху падарожніка адзін ад аднаго, як і паказана ў дарожніку з «малога Ідрысі». Менш упэўнена лакалізуюцца:

Буніда = Пінск.

Хоць ёсць праблемы з адлегласцямі, але добра вядомы гандлёвы тракт, які лучыць Пінск з Лагожскам і Барысавам.

Лакалізацыя трох астатніх тапонімаў больш спрэчная. Адна з магчымасцяў Бука = Выш(гарад), (А)ст(а)ркуда = Іскарасцень, Б(а)руні = Оўруч у цэлым адпавядае графічнай транскрыпцыі тапонімаў, не можа быць спраўджаная паводле адлегласцяў (не пададзены для гэтых гарадоў), але ўсе гарады размешчаны ўздоўж таго ж самага гандлёвага тракту і нават паслядоўнасць іх размяшчэння на мапе адпавядае іх паслядоўнасці знаходжання на тракце (перакажам сярэднявечныя тапонімы сучаснай мовай — Вышгарад, Іскарасцень, Оўруч, Пінск, Барысаў, Лагойск — менавіта ў такім парадку размешчаны гарады на сучаснай мапе).

Другі маршрут, які мае дачыненне да Беларусі, прыведзены ў апісанні краіны Куманіі:

«Да [ліку гарадоў] краіны Куманіі ці земляў куманаў належаць горад Фіра, горад Нарус, горад Нушы і горад Кінійу. ...Ад гораду Нушы да гораду Кінійу ў паўночна-ўсходнім кірунку сто міляў, ці чатыры пераходы. Горад Кінійу — вялікі горад пад гарой, вельмі



Лакалізацыя гарадоў краіны ан-нібарыйа паводле Б. Рыбакова — поўнач уверсе.



Краіна куманаў на мапе Ідрысі (поўнач унізе) (рэканструкцыя І. Канавалавай паводле матэрыялаў К. Мілера).

ажыўлены, пры ім шырокая населеная акруга. Гэтаксама ад гораду Нушы да гораду Нарус сто міляў у паўночна-заходнім накірунку. Гэты горад невялікі, у ім ёсць рынкі, дзе [наладжаны] купля-продаж. Ад гораду Нарус ва ўсходнім накірунку да гораду Салав сто трыццаць пяць міляў, а ад гораду Нарус да гораду Фіра на захад пяцьдзесят міляў, а ад [гораду] Фіра да гораду Набі на захад дваццаць пяць міляў».

Хоць этнонім «куманы» ёсць стандартным вызначэннем полаўцаў у еўрапейскіх крыніцах, невядомасць палавецкіх гарадоў згодна рускім летапісам змушае дасляднікаў лічыць названыя гарады рускімі, шукаючы іх на руска-палавецкім памежжы. Аднак прапанаваныя лакалізацыі альбо абапіраюцца толькі на арабскую транскрыпцыю назваў, ігнаруючы пададзеныя ў тэксце адлегласці *[Баруч, Носаў — В. Бейліс)]*, альбо пракладаюць маршрут паўз малавядомыя альбо зусім невядомыя населеныя пункты *[гарадзішча каля Гайварона, Дзеравіч, Карэц, горад у ваколіцах Роўна — Б. Рыбакоў]*. Разам з тым, усе названыя гарады адлюстраваныя на мапе Ідрысі, і можна прыгадаць іх правобразы на сучаснай мапе, пры гэтым размешчаныя практычна ў той жа форме: Нушы = Выш(гарад), Нарус = Оўруч, Фіра = Тураў (прапушчаны Пінск), Набі = Нобель, Кінійу = Чарнігаў.

Пры такой лакалізацыі Нушы і Нарус ёсць двайнікамі Букі і Баруні (Вышгарад і Оўруч), але Вышгарад, Оўруч, Тураў, (Пінск) і Нобель сапраўды размешчаны ўздоўж аднаго тракту, а Чарнігаў аддалены ад Вышгарада на ўзгаданую адлегласць у паўночна-ўсходнім накірунку. Усе згаданыя гарады на свой час з'яўляліся значнымі гарадскімі цэнтрамі.

Агульнае параўнанне характару звестак Ідрысі і Нестара паказвае якасную розніцу ў падыходах двух аўтараў. Нестар канцэнтруецца на гісторыі кіеўскай дынастыі і гісторыі праваслаўнай царквы і апісвае Русь як спадчыну аднае дынастыі, нутраныя сваркі якой якасна розняцца ад барацьбы са знешнім ворагам. Ідрысі не ведае ніводнага імя рускага князя, ні палітычнай структуры рэгіёну, абмяжоўваючыся толькі геаграфічным пералічэннем тапонімаў (і далучаючы часам эканамічныя звесткі, прыкладам, пра дастатак зерня і танныя кошты). Яго інфарматарамі былі гандляры,



Лакалізацыя гарадоў краіны куманаў паводле Б. Рыбакова (поўнач уверсе).

якія вялі дальні гандаль, пры гэтым іншамоўныя, што аўтаматычна дэтэрмінавала іх аддаленасць ад палітычнага жыцця Русі. «Нузхат ал-муштак» дае магчымасць зірнуць на Старажытную Русь з гледзішча, што засталося невядомым для манаха Нестара — з гледзішча ўдзелу Русі ў далёкім гандлі, у якасці мосту паміж Усходам і Захадам, Прычарнамор'ем і Балтыкай. Для Ідрысі няма дакладных палітычных межаў — ён лёгка пераходзіць ад русаў да маджусаў ці палякаў, а старажытнарускія гарады размяшчае ў Куманіі. Аднак гэты погляд на міжнародны аспект Старажытнарускай дзяржавы таксама можа быць цікавы і карысны.

Асаблівасцю звестак Ідрысі можна лічыць тое, што ён часта паведамляе пра адлегласці паміж гарадамі, якія пераадольваюць яго інфарматары, падаючы іх у днях дарогі або мілях. У выпадку выкарыстання меры «дней дарогі» можна звяртацца да суадносін: 1 дзень дарогі = 25 міляў; дакладная велічыня мілі, якую выкарыстоўваюць яго інфарматары, невядомая. І. Канавалава прапануе карыстацца велічынёй 1 міля = 1555 метраў, якую вылічыў Тамашак на падставе звестак Ідрысі па Балканскай паўвыспе. Для практычных ацэнак дастаткова прыблізнага вызначэння даўжыні мілі ў 1,5 кіламетра, у такім выпаку аднадзённы шлях роўны 37 км.

Пры перадачы адлегласцяў у днях дарогі Ідрысі амаль заўсёды прыводзіць іх у акругленых велічынях — адзін, два, тры дні дарогі, што цалкам натуральна. Аднак, калі паведамляецца адлегласць паміж гарадамі ў мілях, яна нечакана часта робіцца кратнай 25 мілям, альбо сярэдняму дзённаму пераходу гандлёвага каравану. Паказальныя ў гэтым сэнсе аповеды пра краіну Куманійа, што цытавалася вышэй: з пяці адлегласцяў, названых Ідрысі — 100, 100, 135, 50, 25 міляў, — толькі адна, пры гэтым самая вялікая, не кратная даўжыні дзённага пераходу. Такое ўражанне, што гарады размяшчаліся не проста там, дзе было зручна іхным насельнікам (ля ракі, пры ўчастках урадлівых глебаў альбо зручных да абароны), але спецыяльна шукалі месцы, прыдатныя менавіта для транзітнага гандлю (начлегі караванаў блізу мястэчак нашмат зручнейшыя, чым у голым полі; але і пераходы паміж імі не мусяць выглядаць закароткімі або задоўгімі). Кратнасць прыведзеных адлегласцяў, як можа стацца, была другаснай (у першапачатковых нататках інфарматараў адлегласці маглі падавацца ў дзённых пераходах, а Ідрысі ж падчас рэдагавання матэрыялаў мог пераводзіць звесткі ў мілі паводле стандартнага пераліку 1 дзень дарогі = 25 міляў. Таму цікава знайсці пацверджанні (або абвяржэнні) у незалежных крыніцах.

На шчасце, такія крыніцы існуюць. Трэба ўзяць сучасную гістарычную мапу Старажытнай Русі і вымераць адлегласці паміж суседнімі гарадамі, напэўна альбо меркавана злучанымі гандлёвым трактам. Вынікі вымярэнняў выглядаюць дастаткова нечаканымі.

«Квантаванне» адлегласцяў паміж гарадамі і паселішчамі ўздоўж трактаў існуе незалежна ад звестак Ідрысі. Яно існуе на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі, прычым часцей сустракаецца ў выглядзе адлегласці двухдзённага пераходу — 50 міляў, альбо 75 кіламетраў. Больш за тое, цяжка знайсці горад, для якога гэтае правіла цалкам бы не пасавала.

На агульным фоне яскрава вылучаюцца два рэгіёны:

1. Гарады ўсяго цячэння Паўднёвага Буга (ад вытокаў да Кучэльміна, з цэнтрам у Галічы) — квантаванне цалкам адсутнічае, адсутнічаюць і якія б кольвек гандлёвыя тракты. Перад намі сведчанне суцэльнага дамінавання мясцовых фактараў у размяшчэнні населеных пунктаў, адсутнасці ўплыву транзітнага гандлю.

2. Тэрыторыя Беларусі — практычна ўсе яе гарады выяўляюць яскравае квантаванне адлегласцяў, прычым пераважна ў выглядзе трохдзённага пераходу — 75 міляў альбо 110 кіламетраў.

Вось іх спіс: Мазырь—Тураў — 3-дзённы пераход; Тураў—Пінск — 3-дзённы пераход; Пінск—Нобель — 1-дзённы пераход; Пінск—Кобрын — 3-дзённы пераход; Кобрын—Бярэсце — 1,5-дзённы пераход (?); Кобрын—Ваўкавыск — 2-дзённы пераход; Ваўкавыск—Горадня — 2-дзённы пераход; Горадня—Візна — 3-дзённы пераход; Візна—Палтовеск — 3-дзённы пераход (і далей у Польшчу); Горадня—Турыйск — 2-дзённы пераход; Пінск—Клецк — 3-дзённы пераход; Клецк—Нясвіж — 1-дзённы пераход; Нясвіж—Мінск — 3-дзённы пераход; Нясвіж—Новагародак — 2-дзённы пераход; Мінск—Лагойск — 1-дзённы пераход; Мінск—Барысаў — 2-дзённы пераход; Барысаў—Друцк — 2-дзённы пераход; Друцк—Одрск — 1-дзённы пераход; Одрск—Орша — 0,5-дзённы пераход (?); Орша—Смаленск — 3-дзённы пераход; Тураў—Слуцк — 3-дзённы пераход; Слуцк—Мінск — 3-дзённы пераход; Мінск—Свіслач —

3-дзённы пераход; Свіслач—Стрэжаў — 3-дзённы пераход; Стрэжаў—Мазыр — 3-дзённы пераход; Мазыр—Чарнобыль — 3-дзённы пераход; Чарнобыль—Кіеў — 3-дзённы пераход.

Такім чынам, на ўсю тэрыторыю Беларусі сустракаем толькі два выпадкі «неквантаваных» адлегласцяў, пры гэтым абедзве пары гарадоў відавочна месцяцца на трасе гандлёвых трактаў.

Квантаванне закранае і сумежныя з Беларуссю рэгіёны: Кіеў—Оўруч — 4-дзённы пераход; Оўруч—Тураў — 3-дзённы пераход; Іскарасцень—Оўруч — 1-дзённы пераход; Оўруч—Мазыр — 2-дзённы пераход; Мазыр—Чарнігаў — 4-дзённы пераход.

У наваколлях Полацка таксама выяўляецца квантаванне: Барысаў—Полацк — 4-дзённы пераход; Полацк—Одрск — 4-дзённы пераход; Полацк—Лукомль — 3-дзённы пераход; Лукомль—Барысаў — 2-дзённы пераход; Лукомль—Одрск — 2-дзённы пераход.

Да якіх высноваў падштурхоўвае гэты пералік? Землі Беларусі, як высвятляецца, пакрыты сеткаю населеных пунктаў, стваральнікі якіх пры выбары месцаў для паселішча ўлічвалі не толькі выключна мясцовыя ўмовы, але і адлегласці да сваіх суседзяў, імкнучыся спрасціць рух гандлёвых караванаў паміж гарадамі. Вельмі істотна, што названы парадак пашыраўся на адлегласці ў сотні і сотні кіламетраў, практычна ахопліваючы ўсю Усходнюю Еўропу. Для сістэмнага разумення падобных феноменаў даводзіцца дапускаць наяўнасць эфектыўнай дзяржаўнай улады, здольнай прымаць стратэгічныя рашэнні і кіраваць рэсурсамі на вялікіх тэрыторыях.

Якім часам можна датаваць узнікненне гэтай сістэмы гандлю? Улічваючы яе надзвычайную працягласць, можна меркаваць пра паступовасць яе ўзнікнення — шмат якія з прыгаданых гарадоў (тыя ж Лагожск — Лагойск або Барысаў) заснаваны адносна позна, ужо ў XII стагоддзі. Аднак некаторыя населеныя пункты маюць надзвычай шанаваны ўзрост. Места Тураў, узведзенае ў сэрцы гандлёвага тракту, нават паводле летапісу існавала перад прыходам дынастыі Рурыкавічаў у Кіеў. Гарады Іскарасцень і Оўруч з'яўляліся цэнтрамі драўлянаў і былі заснаваныя таксама незалежна ад Рурыкавічаў. Не выпадае сумнявацца ў старадаўнім веку Кіева. І калі гэтыя чатыры гарады — Кіеў, Оўруч, Іскарасцень ды Тураў — узніклі ў перадваражскія часы, але падпадаюць пад сістэму квантавання адлегласцяў (г. зн. былі ўцягнутыя ў транскантынентальны гандаль з Усходам), дык можна, адпаведна, дапускаць, што падваліны гэтай сістэмы закладаліся яшчэ ў далетапісныя часы незалежна ад дынастыі Рурыкавічаў.

Што новае можа прынесці погляд на геаграфію Старажытнай Русі, заснаваны на дапушчэнні квантавання адлегласцяў ? Ці не найбольш яскравым узорам выглядае частка названай сеткі шляхоў — участак Мазыр—Чарнігаў. Ён мае даўжыню 4-дзённага пераходу, перасякаючы ў дарозе Дняпро каля Любеча. Звычайна Любеч лічыцца значным горадам Русі, паколькі стаіць на Дняпры і мог выкарыстоўвацца варагамі на шляху «з варагаў у грэкі». Аднак уважлівы погляд на мапу гэтага ўчастку прыцягвае ўвагу на размешчаныя на ім яшчэ гарады — Ліствен і Брагін. І якімі ж яны падзелены адлегласцямі?

Мазыр—Брагін — 2-дзённы пераход; Брагін—Ліствен — 1-дзённы пераход; Ліствен—Чарнігаў — 1-дзённы пераход.

Іншымі словамі, паміж усімі трыма гарадамі выяўляюцца ідэальна квантаваныя адлегласці. Гармонію лічбаў не парушае нават перасячэнне шляхам Дняпра. Любеч стаіць на сярэднім участку Брагін—Ліствен, і ягонае размяшчэнне на тракце вызначаецца ракой, а не задумкай будаўнікоў. Становішча можна схарактарызаваць наступным чынам: гарады Ліствен і Брагін былі заснаваныя менавіта дзеля таго, каб падтрымліваць працу тракту Чарнігаў—Мазыр, што праходзіў праз іх, роля Любеча зводзілася не

Участак тракту Мазыр—Чарнігаў на мапе з кнігі Л. Махноўца «Літопис Руський».

больш як да перавозу праз Дняпро караванаў, што рухаліся па тракце. Дняпро не рабіў значнага ўплыву на караванны гандаль, што перасякаў раку.

У выніку аналізу адлегласцяў можна выявіць і працяг разгледжанага намі маршруту на Усход: Чарнігаў—Уненеж — 2-дзённы пераход; Уненеж—Прылукі — 2-дзённы пераход; Прылукі—Лубны — 2-дзённы пераход.

Лубны месцяцца на беразе ракі Сулы, дзе землі рускіх гарадоў заканчваліся і пачынаўся Палавецкі стэп. Таму прасачыць тракт далей у стэп падобным жа чынам не атрымліваецца. Але менавіта з Лубнаў пачынаўся славуты Залозны шлях, на якім пазней паўстала Палтава са знакамітым Палтаўскім кірмашом (узнікла, дарэчы, на адлегласці раўнютка 3-дзённага пераходу ад Лубнаў...).

Сістэма транскантынентальнага гандлю не мае тлумачэння пры звыклым нарманісцкім падыходзе, магутны рэнесанс якога назіраецца цягам апошняга дзесяцігоддзя. Моцная прывязанасць звестак пра «пакліканне варагаў» да рускай Поўначы (Ізборск, Белавозера), дзе квантаванне адлегласцяў не прасочваецца і ў больш познія часы, характарыстыка варагаў як «находнікаў» паводле летапісу, цяглая ўвага нарманістаў да рачных, а не сухапутных шляхоў зносін ва Усходняй Еўропе, калі зусім адсутнічае рэгулярная сетка пунктаў «варажскай прысутнасці», — усё гэта робіць невытлумачальным у выпадку падобнага падыходу ўзнікненне сістэмы транскантынентальнага сухапутнага гандлю, пашыранай на сотні кіламетраў. Добра вядомыя месцы прысутнасці скандынаваў ва Усходняй Еўропе нешматлікія (Ладага, Сарскае ды Цімераўскае гарадзішчы, Смаленск, Чарнігаўскія курганы), яны не перакрываюць усіх тэрыторыяў і пакідаюць без вытлумачэння выпадкі відавочнага квантавання адлегласцяў у рэгіёнах кшталту Іскарасценя і Оўруча ў землях драўлянаў, дзе ўзнікненне пасяленняў нават паводле летапісу адбывалася без удзелу варажскіх князёў. Дэкларуючы наяўнасць насычанага руху па ўсходнееўрапейскіх рэках, адначасна не зважаючы на сухапутны караванны гандаль, можна істотна сказіць уяўленне пра рухаючыя матывы урбанізацыі ў рэгіёне.

Прасачыць сістэму гандлёвых трактаў на падставе звестак рускіх летапісаў практычна немагчыма, паколькі іхныя асноўныя складальнікі — манахі — не былі знаёмыя з гандлем, найперш з гандлем далёкім, і не надавалі яму адпаведнай увагі. Інфарматарамі Ідрысі з'яўляліся менавіта купцы, для якіх гандлёвыя тракты і кан'юнктура знаходзіліся на першых месцах. Мяркуючы па апісаннях Ідрысі, што да XII ст., дык сістэма яшчэ паўнавартасна дзейнічала. І менавіта з гэтае прычыны ягоныя звесткі прыцягваюць самую пільную цікавасць для рэканструкцыі ўсходнееўрапейскага шляху транскантынентальнага гандлю, які непасрэдным чынам паўплываў на агульны працэс урбанізацыі Старажытнай Русі.

ЛІТАРАТУРА

1. Коновалова И. «Восточная Европа в сочинении ал-Идриси». Москва, издательская фирма «Восточная литература» РАН, 1999.

2. Рыбаков Б. Русские земли по карте Идриси 1154 года // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института истории материальной культуры (КСИИМК). Вып. 43. М., 1952.

3. Махновець Л. «Літопис Руський» Київ, «Дніпро», 1989.

4. «La Geographie d'Idrisi». Мультымедыя-энцыклапедыя выдавецтва «Montparnasse Multimedia» і Нацыянальнай бібліятэкі Францыі, 2001.

5. Дадатковыя матэрыялы па «Нузхат ал-муштак» размешчаны ў Інтэрнэце па адрасе idrisi.narod.ru

Юры ТКАЧЭНКА (Кіеў),
ytkachenko@PN.Ukrtelecom.net

За вольную і сувэрэнную Беларусь

БРАНСКІ ПЭРЫЯД

Я пакінуў Менск 30 кастрычніка 1941 г. і разам з фэльдкамэндатурай, Г. Краацам, Міхасём Вітушкам і Радаславам Астроўскім паехаў на паўночны адцінак сярэдняга фронту.

Нямецкая армія набліжалася да Масквы. Надвор'е было дажджлівае. Аўтастрада Менск — Орша — Смаленск — Масква была моцна пашкоджаная цяжкімі нямецкімі танкамі, гарматамі, машынамі й пакрыта скрозь амаль паўмэтровым балотам. Грузавікі вязнулі ў балоце й не маглі дастаўляць на фронт амуніцыі й бензыны. Палявыя пабочныя дарогі былі непраходнымі. Усе спробы немцаў апошнімі высілкамі заняць Маскву паралізаваліся ня Чырвонай арміяй, але непагодай і непраходнымі дарогамі. Каб заняць Маскву, немцы чакалі на прымаразкі.

Зь вялікімі цяжкасьцямі на савецкіх трафэйных машынах супольна са штабам Г. Крааца дабраліся да Оршы, якую немцы занялі ў кастрычніку 1941 г.[1].

Раптам у ноч з 6 на 7 лістапада на ўсім адцінку сярэдняга фронту неспадзявана прыйшоў мароз. Тэрмомэтар упаў да мінус дзесяці градусаў Цэльсія. Афэнзыва на Маскву часова спынілася. Надыходзілі транспарты з амуніцыяй, бензынай, але вопраткі зімовай не было. Праз пару дзён мароз даходзіў да 20 градусаў. Немцы мерзьлі, зброя замярзала й не страляла. Настала марозная зіма. Краац разам з VII аддзелам камэндатуры быў скіраваны ў Бранск. Мы паехалі за ім.

Бранск быў вельмі важным стратэгічным чыгуначным вузлом зь якога ішлі цягнікі на поўнач, поўдзень, захад і ўсход Савецкага Саюзу. Горад быў разьмешчаны сярод лясоў і балотных далінаў. Тут генэрал Яроменка[2] падгатаваў абаронныя пазыцыі. Аднак панцырная армія генэрала Гудэрыяна[3] зьнянацкім абходам з боку Арла акружыла яго. 6 кастрычніка 1941 г. Бранск амаль бяз бою быў заняты 17-й панцырнай дывізіяй генэрала Арніма[4].

Больш за дзесяць дзён стараўся Яроменка прарвацца з акружэньня, аднак галоўныя сілы змушаныя былі капітуляваць. Сам генэрал цяжкаранены разам са сваім штабам змог прарвацца. Каля 700 000 байцоў і камандзіраў здаліся ў палон. Больш за 1000 танкаў і 5000 гарматаў былі зьнішчаныя або захопленыя немцамі.

Па бранскіх лясох і па вёсках акругі блукалі тысячы галодных байцоў-«акружэнцаў», якія не хацелі змагацца за Сталіна, але таксама не хацелі ісьці ў нямецкі палон, бо ўжо былі паінфармаваныя пра нямецкія зьдзекі ў лягерох для ваеннапалонных.

У Бранску ўжо была арганізаваная Гарадзкая ўправа ОД[5]. На чале ўправы стаяў п'яніца-«фольксдойч» — паволскі немец з Клінцоў, які самавольна тут гаспадарыў.

Першае спатканьне з жыхарамі Бранску й ягоных ваколіцаў — раённых цэнтраў і калгасаў — зрабіла на мяне вельмі прыемнае й пазытыўнае ўражаньне. Моўна Бранск быў менш зрусыфікаваны, чым Менск. Гэта самае можна было сказаць адносна райцэнтраў. Нягледзячы на моцную русыфікацыю, Бранск і ягоная акруга засталіся вернымі беларускай мове. Прыемна было чуць тут беларускае вымаўленьне.

Для арганізацыі абласнога жыцьця патрэбная была лучнасьць з раёнамі й арганізацыя аўтарытэтнага кіраўнічага цэнтру. Я абняў функцыю начальніка акруговага ОД, Міхась Вітушка пераняў функцыю майго заступніка.

Генэрал Гайнц Гудэрыян.

Пачатак у №№ 4, 5—6, 2001, № 1, 2002.

Радаслаў Астроўскі быў вызначаным кіраўніком акруговай управы. Патрэбныя былі людзі для ОД і для адміністрацыі. Савецкай жа трафэйнай зброі было дастаткова.

Выслухаўшы скаргі пазасталых яшчэ ў Бранску байцоў ОД, у суправаджэньні мясцовага ОД-канвою на грузавіках, паехаў у раённыя цэнтры акругі, пазнаёміцца з сытуацыяй і настроем мясцовых жыхароў.

Цягам некалькіх дзён былі наведаныя раённыя цэнтры: на ўсходзе Карачаў, які ляжаў на шашы Бранск — Арол, дзе знаходзіўся вялікі аэрадром, Наўля — на поўдні, Почап, Краснае, Выганічы — на паўднёвы захад, Жыраціно, Клетня — на захадзе, Дзяцькава й Жукаўка — на поўнач. Між іншага, Карачаў быў апошнім горадам на ўсход ад Бранска, дзе адчувалася пераважна беларуская гаворка. У гэтых раёнах я правёў шырокі абмен думкамі зь мясцовымі жыхарамі й пазасталым у раёнах адміністрацыйным пэрсаналам, выразна выказаў свае погляды на сталінскі атэістычна-камуністычны рэжым, сказаў, што я беларус з Заходняй Беларусі й за два гады бальшавіцкае акупацыі добра пазнаў савецкі рэжым і цяпер змагаюся з бязбожным камунізмам з надзеяй супольнымі сіламі здабыць вольнасьць і незалежнасьць для беларускага народу. Я ім сказаў, што яны адносяцца да беларускага племені й толькі сілаю гістарычных падзеяў былі адарваныя ад маці-Беларусі. Доказам гэтага ёсьць іхнае беларускае вымаўленьне. Я прапанаваў ім супольна змагацца за вызваленьне Бацькаўшчыны ад камунізму ды ад кожнага акупанта. Я верыў, што сярод мясцовага насельніцтва

Генэрал Юрген Ганс фон Арнім.

знойдуцца шчырыя патрыёты, якія будуць змагацца супраць кожнага акупанта за вольнасьць свайго краю.

Прысутныя прадстаўнікі раёнаў і калгасаў віталі й падзялялі мае пагляды. Яны выказалі гатоўнасьць арганізаваць баявыя аддзелы ОД для барацьбы зь лясными бандамі. Адначасна я акцэптаваў выбраных жыхарамі раённых цэнтраў кіраўнікоў ОД-аддзелаў для арганізацыі гэтых баявых адзінак, для наладжваньня парадку ў раёне й абароны населеных пунктаў ад нападаў тады яшчэ не арганізаваных акружэнцаў, якія рабавалі вёскі.

Хутка ўсе раёны былі арганізаваныя: ОД было добра ўзброенае савецкай зброяй, уключна з кулямётамі й гарматамі. Збройныя майстэрні ОД рамантавалі й складалі зброю. Сувязь з раёнамі была наладжаная. Нават нямецкія вайскова-адміністрацыйныя часткі фэльдкамэндатуры для лучнасьці са сваімі часткамі ў раёнах высылалі пры патрэбе сувязных пад аховай мясцовых байцоў. Дарогі й населеныя пункты ў Бранскай акрузе былі пад поўным кантролем ОД — Беларускага краёвага войска (БКВ).

Зіма прыйшла зьнянацку й лютая. Сьнег пакрыў увесь адцінак сярэдняга фронту. У канцы лістапада 1941 г. мароз даходзіў да мінус сарака градусаў. Лучнасьць ОД з раёнамі трымалася санкамі.

Да пачатку 1942 г. арганізаваных нападаў лясных бандаў не было — баявыя аддзелы ОД былі добра арганізаваныя й узброеныя. Лічба вайсковых аддзелаў ОД у Бранскай акрузе даходзіла да 5000 чалавек. Арганізаваныя конныя аддзелы ОД (г. зв. лятучыя аддзелы) прачышчалі непраходныя бранскія лясныя дарогі й кантралявалі акругу. Мясцовае насельніцтва ня верыла «акружэнцам» і прымала іх пераважна да працы ў гаспадарцы, рэдка — у шэрагі ОД — БКВ.

«Акружэнцы», пераважна, напраўляліся ў Локацкі раён, дзе інжынер Васкабойнік[6] арганізаваў збройныя атрады з гэтых «акружэнцаў» для абароны Локця й суседніх калгасаў. Ён загінуў у баі з бандамі. Камандаваньне над атрадамі й кіраўніцтва над Локацкім раёнам пераняў інжынэр Камінскі[7]. Ён назваў свае аддзелы *Русской Освободительной Народной Армией* (РОНА) і арганізаваў у Локаці Расейскую Нацыянал-Сацыялістычную Партыю, падобную, як ён казаў, да нямецкай. Гэтыя вайсковыя аддзелы пасьля адыходу немцаў з Локаця прайшлі праз усю Беларусь аж да Варшавы, здэмаралізаваліся й нанесьлі насельніцтву Беларусі вялікую шкоду й у Варшаве яны бралі ўдзел у зьнішчэньні Варшаўскага паўстаньня, дзе бязьлітасна грабілі й забівалі палякаў.

Як было ўжо вышэй згадана, арганізаваных партызанскіх атра-

даў у 1941 г. у Бранскай акрузе не было. Хутка арганізаванае ОД — БКВ не дало ім магчымасьці арганізавацца. Я ў суправаджэньні свайго абароннага канвою, які складаўся зь мясцовых жыхароў, разьяжджаў па лясных раёнах у санках. Часамі ў лясох зьяўлялася пара сотняў «акружэнцаў», але, пабачыўшы кулямёты на санках, хаваліся ў лесе.

Мясцовае насельніцтва прыхільна ставілася да немцаў. Гэтаму спрыяла разумная палітыка камандуючага 2-й панцырнай арміі генэрал-палкоўніка Рудольфа Шміта[8], які ў канцы сьнежня 1941 г. абняў камандаваньне гэтай арміяй. Ён бачыў пазытыўны вынік нашай працы зь мясцовым насельніцтвам і дапамогу, якую насельніцтва аказвала нямецкай арміі. Генэрал Шміт выдаў адпаведныя ўказаньні сваёй арміі прыхільна ставіцца да мясцовага насельніцтва й ОД і дапамагаць наладжваць нармальнае жыцьцё ў Бранскай акрузе. Стаўленьне генэрала, ягонага штабу й афіцэрскага корпусу да мяне й Міхася было сяброўскім. Вельмі шмат дапамагалі сваім прыхільным стаўленьнем і падтрымкай прапановаў і мерапрыемстваў Г. Краац, зондэрфюрэр Артур Доэльлерт, балтыйскі немец пры штабе 2-й панцырнай арміі, а таксама палкоўнік фон Бэнкендорф. Я й Міхась сталаваліся ў афіцэрскім казіно разам з генэралам Шмітам. Часта падчас супольнага абеду ці вячэры моцна крытыкаваліся стаўленьне аддзелаў да ваеннапалонных, няясная пазыцыя Бэрліна да лёсу народаў СССР. Аднак сярод вышэйшых афіцэраў штабу было пераконаньне, што гэтыя погляды хутка зьменяцца на карысьць насельніцтва на акупаваных немцамі



Катэдральны Ўсьпенскі сабор у Смаленску.

прасторах СССР. Франтавікі ведалі, што без дапамогі мясцовага насельніцтва яны не паканаюць сталінскі рэжым.

[...]

У першых днях студзеня 1942 г. франтавая сытуацыя ў Бранску раптоўна пагоршылася й стала небясьпечнай для ўсяго сярэдняга фронту. Прыбылі сыбірскія войскі. Успаможаныя амэрыканскай зброяй — танкамі й харчамі, — яны прарвалі паўночна-ўсходні нямецкі фронт паміж Калугай і Бялевам[9] і прасоўваліся ў кірунку Сухінічаў ды пагражалі акружэньнем Бранску й Вязьме[10], занятымі немцамі. Мароз і сьнег перашкаджалі нямецкаму адступленьню. Нямецкі франтавы штаб і VII аддзел камэндатуры, а таксама Вітушка й Астроўскі разам з Краацам былі эвакуаваныя з Бранску. Каб не рабіць панікі сярод насельніцтва й ОД у горадзе, апрача перадавых франтавых частак, застаўся я й палкоўнік фон Бэнкендорф. Сухінічы былі акружаныя савецкай арміяй; каля Людзінава[11], недалёка Бранску, ішлі ўпорыстыя баі.

Сталін выслаў у бой у перадавыя шэрагі штрафныя батальёны, за якімі ішлі войскі НКВД і стралялі ўсіх, хто ня йшоў наперад. За гэтымі батальёнамі ішлі выбраныя сыбірскія войскі 10-й арміі.

Немцы занялі пазыцыі й кулямётным агнём «касілі» ўсіх наступаючых байцоў. Карціна была жудасная. Забітыя байцы ляжалі цэлымі пластамі адзін на другім. Пасьля бязьлітаснага змаганьня ў канцы студзеня 1942 г. немцы вызвалілі сваю акружаную ў Сухінічах пяхоту. Затым у доўгіх баёх затрымалі савецкі прарыў. Штаб нямецкага камандаваньня вярнуўся ў Бранск. Бранскае ОД па-геройску змагалася супраць савецкай арміі й дапамагала ў вывазцы ў тыл параненых. За гэта ад камандаваньня атрымаў падзяку. Фон Бэнкендорф, мой сябра й прыяцель беларусаў, быў вызначаны камандзірам пяхотнага франтавога палка ў Людзінаве. Нягледзячы на блізкі фронт і цяжкія баі, мясцовае насельніцтва прыхільна ставілася да нямецкай арміі й памагала ёй у барацьбе з партызанамі, выкрываючы іхнія гнёзды, якія пачалі тварыцца з «акружэнцаў», і спэцыяльна пакінутымі ці перакінутымі самалётамі палітрукамі.

Я карыстаўся поўным даверам і падтрымкай у жыхароў Браншчыны. ОД павялічвалася й да канца красавіка дайшло да 10 000 чалавек. Былі арганізаваныя падафіцэрскія школы й збройныя майстроўні, якія дастаўлялі аддзелам ОД адпаведную зброю з трафэйных звалак зброі.

Зімою 1942 г. партызаны стараліся выбіць ОД — БКВ у Наўлі. Але сіла супраціву ОД была вялікая. Контратакаю нанесьлі партызанам вялікія страты, пасьля чаго Наўля была на даўжэйшы час за-

стаўлена партызанамі ў супакоі. У гэтым баі ОД Наўлі таксама панесла страты. Начальнік ОД С. загінуў у баі. На ягонае месца я вызначыў жыхара Наўлі М., які камандаваў ОД у Бранску. Камандаваньнем ОД у Бранску даручыў заходніку К. Заступнікам вызначыў жыхара Бранску інж. Ж., сьвядомага антыкамуніста.

Апрача арганізацыі збройных сілаў я браў актыўны ўдзел у арганізацыі царкоўнага жыцьця ў Бранскай акрузе. Дапамагаў архімандрыту Паўлу (Мялецьеву)[12], які ў 1937—1941 г., зь ягоных слоў і з паказаньня мясцовых жыхароў, жыў у Бранску нелегальна й патаемна адпраўляў набажэнства ў дамах вернікаў (г. зв. катакомбная царква). З прыходам нямецкай арміі пачаў арганізоўваць царкоўнае жыцьцё ў Бранску й ваколіцах.

З маёй дапамогай у Бранску й у раённых цэнтрах былі падрыхтаваныя адпаведныя будынкі для адпраўленьня набажэнства — і Павал пачаў адпраўляць божыя службы. У 1942 г. Павал атрымаў ад Беларускай мітраполіі богаславеньне на дзейнасьць у адраджэньні царкоўнага жыцьця ў Бранскай акрузе.

У другой палове красавіка Краац быў пераведзены ў Смаленск. Зь ім выехаў Радаслаў Астроўскі, які арганізаваў у вольнай ад партызанаў Бранскай акрузе цывільную адміністрацыю, пакінуўшы акруговым кіраўніком былога ваеннапалоннага агранома Пятрова. Зь Міхасём на некалькі дзён засталіся ў Бранску, каб палагодзіць справу кіраўніка ОД у горадзе Арджанікідзэградзе, на якога паступілі скаргі мясцовага насельніцтва. Гэта быў стары

Радаслаў Астроўскі. Здымак 40-х гг.

эмігрант-расеец з Бэрліна, якога сюды прывезла нямецкае СД.

Разгледзеўшы скаргі й расьсьледаваўшы ўсе абвінавачаньні ў няўмелым і нетактоўным абыходжаньні кіраўніка ОД зь мясцовымі жыхарамі, я зьняў яго з працы й на прапанову мясцовага актыву вызначыў кіраўніком ОД маладога й энэргічнага мясцовага жыхара Г. На другі дзень новапастаўлены кіраўнік ОД быў арыштаваны СД і пасаджаны ў турму. Я неадкладна зьвярнуўся да камандуючага генэрала, які адразу звольніў арыштаванага Г. і аднавіў яго на пасадзе кіраўніка ОД у Арджанікідзэградзе, дзе ён сумленна выконваў свае абавязкі да самага адступленьня нямецкай арміі.

Мая супраца з аддзеламі ОД Бранскай акругі была наладжана. Сярод камандзіраў і байцоў знайшоў адборныя й адданыя сілы, якія ў патрэбе змаглі б самааддана змагацца з кожным акупантам краю. Рыхтаваліся выбраныя камандзіры й байцы вызвольных атрадаў Беларускае Незалежніцкае Партыі.

Перад ад'ездам у Смаленск я наведаў усе аддзелы ОД Бранскай акругі, пажагнаўся з усімі камандзірамі й байцамі ОД, падкрэсьліўшы ім яшчэ раз, што мэтай нашага змаганьня ёсьць асягненьне вольнасьці й незалежнасьці сваёй бацькаўшчыны й паабяцаў трымаць з Бранскім ОД сувязь.

20 красавіка зь Міхасём заладавалі свае аўтамашыны на цягнік на Бранскай таварнай чыгуначнай станцыі, каб ад'ехаць у Смаленск і абняць ОД Смаленскай акругі.

Гэта быў дзень нараджэньня Гітлера. На станцыі стаялі прышыкаваныя да ад'езду эшалёны Чырвонага Крыжа з параненымі салдатамі, а таксама эшалёны з амуніцыяй і зброяй. Неспадзявана начную цемру й цішыню парушыў гул самалётаў. З усіх бакоў Бранску неба прарэзалі прамяні пражэктараў, якія скрыжоўваліся на небе ў малых бліскучых рухомых пунктах — савецкіх самалётах. Пачалася моцная страляніна супрацьсамалётных гарматаў. Неба пакрылася маленькімі, як мячык, клубочкамі дыму, гэта разрываліся снарады. Аднак самалёты далей збліжаліся ў кірунку таварнай станцыі. Даляцеўшы да яе, пачалі скідаць свой груз — бомбы. Першая бомба трапіла ў склад амуніцыі. Страшэнны выбух асьвятліў і ўскалыхнуў усю ваколіцу. Снарады й бомбы разрываліся па ўсёй таварнай станцыі. Параненыя прасілі паратунку. Не пасьпелі ўсе павыскокваць зь цягнікоў, як наступная хваля савецкай эскадрыльлі пачала ізноў скідаць свае бомбы на асьветленую выбухамі таварную станцыю.

Доктар Мікалай Мінкевіч, зяць Радаслава Астроўскага.

Гэтым разам бомбы трапілі ў вялізную цыстэрну з бэнзынам. Велізарны слуп полымя вышынёю каля 200—300 мэтраў падняўся ўгору й асьвятліў усю таварную станцыю й яе ваколіцы.

Выбухі бомбаў перамешваліся з выбухамі амуніцыі й артылерыйскай стралянінай. Экскадрыльля за экскадрыльляй ляцелі савецкія самалёты ды скідалі на бранскую чыгуначную станцыю й яе ваколіцы свой цяжкі груз, бомбы, на ўсе важныя вайсковыя аб'екты станцыі. Надзвычайнае відовішча гэтага налёту было тады, калі бомбы трапілі ў вайсковы склад, у якім перахоўваліся вайсковыя ракеты. Тысячы ракетаў агромістым, каляровым букетам укрылі ўсё неба.

Бомбы дзясяткамі падалі паміж вагонамі Чырвонага Крыжа й вайсковых эшалёнаў. На шчасьце, гэтыя бомбы не былі вялікага калібру. Я й падначаленыя выцягвалі з палаючых вагонаў параненых і забітых нямецкіх жаўнераў. Каля пяці гадзінаў трывала гэтая бамбёжка.

Толькі к вечару наступнага дня пасьля папраўкі рэйкаў мы паехалі ў кірунку Смаленску.

За паўгады працы я пераканаўся, што жыхары Браншчыны засталіся вернымі сваёй Маці-Беларусі й нягледзячы на сотні гадоў маскоўскага панаваньня не забылі на сваю беларускую крывіцкую мову, а пазасталі ёй вернымі. Яны пры першай магчымасьці схапіліся за зброю, каб вызваліцца ад акупацыйнага маскоўскага рэжыму й супольна з усім беларускім народам змагацца за свае чалавечыя, нацыянальныя й дзяржаўныя правы ў сваёй вольнай бацькаўшчыне.

СМАЛЕНСКІ ПЭРЫЯД

У Смаленск прыбылі 22 красавіка 1942 г., застаўшы амаль усю акругу занятай партызанамі. Горад быў літаральна разьбіты, а жыхары былі моцна зрусыфікаваныя. Як відаць, Масква старалася зьнішчыць беларускую гаворку. Бургамістрам быў былы савецкі юрыст Мяньшагін Барыс Георгіевіч[13], энэргічны і здольны расейскі шавініст. Заступнікам — расейскі салідарыст (НТС-вец) эмігрант Гандук. Кіраўніком смаленскага гарадзкога ОД быў таксама былы савецкі ўрадовец С. Ён быў інтэлігентным і дысцыплінаваным працаўніком. У нацыянальных адносінах быў вельмі талерантным. Гарадзкое ОД было добра арганізаваным і налічвала каля 150 чалавек.

На чале раённага кіраўніцтва быў савецкі настаўнік Бібікаў. Ён сядзеў у Смаленску й чакаў, пакуль раён будзе вольным ад партызанаў. Кіраўніком раённага ОД быў расеец Умноў, здольны інтэлектуаліст і вядомы вораг сталінскага рэжыму.

Яшчэ паўгады таму ўсе прасторы Смаленскай акругі былі вольнымі ад лясных бандаў. А ўжо вясною 1942 г. нельга было выехаць за горад на 3—5 км. Усюды былі партызанскія заставы, якія абстрэльвалі аўтамашыны. Партызаны чуліся гаспадарамі ў цэлай акрузе. Толькі ў раённых цэнтрах і населеных пунктах, дзе стаялі моцныя нямецкія гарнізоны, насельніцтва пачувалася бясьпечным ад лясных бандаў. Аднак і ў раённых цэнтрах немцы ня чуліся ўпэўнена й часта акружаліся ўмацаванымі бункерамі. Тэлефоннай сувязі раёнаў са Смаленскам не было. Тэлефонныя слупы банды падпілоўвалі альбо ўзрывалі мінамі. Ня было магчымасьці па некалькі разоў на дзень папраўляць тэлефонны дрот. Сувязь са Смаленскам трымалася цераз радыё.

Часам для сувязі з раёнамі па дарогах праяжджалі нямецкія танкі. Дарогі былі замінаваныя партызанамі. Для прачысткі ад мінаў гэтых дарогаў немцы змушалі калгасьнікаў, жыхароў вёсак, штодня правяраць гэтыя дарогі. Конь цягнуў барану, на якой ляжаў цяжкі камень, а калгасьнік доўгімі лейцамі кіраваў канём. Але й гэта не дапамагала! Часта калгасьнікі траплялі на міны, якія ўзрываліся, забівалі каня, ранілі альбо забівалі селяніна. Партызаны тады закладалі новыя міны. Насельніцтва было запужанае. З аднаго боку аддзеламі СС, якія часам праходзілі праз вёскі й ці забіралі ў калгасьнікаў харчовыя прадукты, ці для падтрымкі сувязі зь перадавымі бункерамі. Зь іншага — ляснымі бандамі, якія ім не давалі супакою, забіралі скот і правіянт і змушалі працаваць супраць немцаў.

Восеньню 1941 г. вёскі рабавалі «акружэнцы» й былыя ваеннапалонныя, якім удалося ўцячы зь лягероў. Вёскі арганізоўвалі самаабарону. У шэрагі самаабароны запісваліся ўсе калгасьнікі, спачатку ўзброеныя дубінамі, баранілі свае вёскі ад гэтых бандаў і адбівалі іх напады. Аднак зімою 1942 г. Масква пачала перакідаць у нямецкі тыл партызанскія дэсанты, якія складаліся з маскоўскіх палітрукоў і камандных саставаў, якія арганізавалі з «акружэнцаў» і былых ваеннапалонных партызанскія вайсковыя адзінкі. Гэтыя партызанскія атрады забіралі ад калгасьнікаў апошнія харчы й каровы ды змушалі дапамагаць ім у барацьбе супраць немцаў.

Тады немцы пачалі выдаваць на кожны абаронны пункт самаахровы па тры бэльгійскія вінтоўкі й па пяць патронаў на вінтоўку. Расейскіх вінтовак пад караю сьмерці немцы мець забаранілі. У такіх варунках самаахова не магла змагацца з добраўзброенымі маскоўскімі бандамі. Стаўленьне жыхароў Смаленшчыны да лясных маскоўскіх бандаў было негатыўнае й пасіўнае.

Масква гэта бачыла й ведала, што жыхары Смаленшчыны добраахвотна ня будуць дапамагаць лясным бандам. Дзеля гэтага яна рознымі правакатарскімі спосабамі імкнулася змусіць беларусаў змагацца за савецкую ўладу. Маскоўскія партызаны стараліся, каб немцы як мага больш рабілі крыўдаў народу, каб народ пачаў немцаў ненавідзець і змагацца зь імі. Сваёй правакатарскай працай, падрывам цягнікоў каля вёсак, падкладаючы міны й забіваючы немцаў каля населеных пунктаў, маскоўскія парашутысты спэцыяльна імкнуліся справакаваць нямецкія карныя атрады, якія затым бязьлітасна зьнішчалі пазасталых жыхароў гэтых вёсак, што не хацелі ісьці ў лес да партызанаў, а заставаліся ў вёсках.

Калі й гэты спосаб правакацыі не ўдаваўся й вайсковае нямецкае камандаваньне не карала жыхароў за забойства бандамі нямецкага жаўнера — маскоўскія партызаны ўжывалі іншую тактыку, каб уцягнуць калгасьнікаў у супрацу. Яны абвяшчалі некаторыя вёскі *ополченческими*, гэта значыць змушалі жыхароў вёсак пад кіраўніцтвам і пад наглядам сваіх людзей выконваць дробныя падрыўныя работы, прыкладам, выкапаць каля вёскі ямы для мінаў, разбурыць тэлефонную сувязь, падпілоўваць тэлефонныя слупы, узрываць малыя масты, псаваць шашу й г. д. З чыста ваеннага боку гэтая праца была дробнага характару, але маральнае й палітычнае значэньне яе было вялікае. Калгасьнікі былі сілаю ўцягнутыя ў такую дывэрсійную працу й рабіліся супрацоўнікамі партызанаў, замыкаліся ў сабе й не спрабавалі больш супраціўляцца партызанскаму руху.

Часта яны былі змушанымі ўцякаць у лес да партызанаў, ратуючы сваё жыцьцё ад нямецкіх карных атрадаў СС. Часта маскоўскія партызаны прысылалі ў вёску сваіх узброеных людзей і ўсіх мужчын сілаю забіралі ў свае атрады. Тых жа калгасьнікаў, якія не хацелі дапамагаць ім у падрыўной працы, маскоўскія палітрукі мардавалі — адразалі ім язык, вушы, нос, зьдзіралі палосамі зь цела скуру альбо забівалі. Калі ж мужчыны ўцякалі ў раённыя цэнтры, палітрукі мучылі іхніх жонак і бацькоў, тэрорам уцягвалі іх у дывэрсійную працу. Яны выразалі жанчынам грудзі, вырывалі валасы і г. д.

Напачатку немцы недаацэньвалі сілу мясцовага насельніцтва ў барацьбе з чырвонымі маскоўскімі партызанамі. Беларускі народ Смаленшчыны, як і ўсё беларускае насельніцтва ў акупаванай немцамі Беларусі, ненавідзеў маскоўскую камуністычную ўладу. Народ сам хапаўся за зброю, каб дапамагчы немцам скінуць маскоўскі чырвоны рэжым, каб жыць сваім вольным жыцьцём. Кожная сям'я ў Беларусі пацярпела ад гэтага рэжыму. Ён пазбавіў сялянаў зямельнай уласнасьці, парабіў іх прыгоннымі калгасаў, рабочых і службоўцаў на прадпрыемствах і фабрыках ператварыў у паслухмяных рабоў Крамля, ад працоўнай інтэлігэнцыі адабраў ініцыятыву й зрабіў яе робатам, які выконваў выключна волю маскоўскага дыктатара.

Мільёны людзей згінулі ў Сыбіры й на цяжкіх працах будовы каналаў і маскоўскага «мэтро». Гэты рэжым прынёс для ўсіх народаў СССР ня толькі мізэру й бязбожжа, але й паняволіў усе творчыя сілы народаў. На стражы ўсяго паставіў усімі ненавіснае НКВД.

Беларускі народ на Смаленшчыне спаткаў немцаў як саюзьнікаў, супольна зь якімі гатовы быў змагацца супраць Масквы ня толькі за паляпшэньне свайго гаспадарчага жыцьця, але за сваё вольнае й незалежнае ад Масквы жыцьцё. Народ імкнуўся да вольнасьці й хапаўся за зброю, каб адваяваць гэтую вольнасьць.

За сваю дзяржаўную свабоду й незалежнасьць усе народы Савецкага Саюзу прынесьлі найбольшую ахвяру ў барацьбе супраць агульнага ворага — маскоўскага камунізму. Немцы гэтага не разумелі альбо не хацелі разу-

мець. Зброі народу не далі, а калі й далі — ужо было позна. Народ на савецкі рэжым затаіў злосьць у грудзях, а да немцаў, нягледзячы на лютасьць аддзелаў СС, адчуваў крыўду й жаль. Яны разьбівалі ягоную надзею на вызваленьне ад ненавіснага бальшавіцкага ярма й у шмат выпадках нішчылі насельніцтва нараўне з бальшавікамі. Аднак, нягледзячы на ўсе зьверствы аддзелаў, народ спадзяваўся, што немцы зразумеюць свае памылкі, дапусьцяць да змаганьня з Масквою й дадуць народу доўгачаканую вольнасьць.

Галоўнае нямецкае франтавое камандаваньне сярэдняга фронту на чале з генэралам фон Шэнкендорфам, палкоўнікам генштабу фон Трэсковым[14], генэралам Вагнэрам ды іншымі разумела імкненьні да вольнасьці насельніцтва акупаванай тэрыторыі й бачыла, што без рэалізацыі гэтага імкненьня немцы не атрымаюць жаданай ад народу татальнай гаспадарчай і вайсковай дапамогі, патрэбнай для арміі, для канчатковай перамогі над Масквою.

[...]

БЕЛАРУСКАЕ КРАЁВАЕ ВОЙСКА ОД У СМАЛЕНСКАЙ АКРУЗЕ

Згодна з плянам БНП — арганізаваць ядро беларускай вызвольнай арміі, я распачаў арганізоўваць аддзелы ОД у Смаленскай акрузе для вызваленьня ад партызанскіх бандаў. Заданьне было ня лёгкае. Смаленская акруга была акружана з поўначы дзямідаўскімі лясамі, з захаду — віцебскімі. Ізалюючы ад гэтых лясоў Смаленскі, Касплянскі й Руднянскі раёны, можна было лічыць акругу ізаляванай і ад партызанскіх бандаў.

У дзямідаўскіх лясах знаходзіліся моцныя партызанскія злучэньні Грышына[15] й Баці[16], якія налічвалі некалькі тысячаў чалавек. Камандны склад і палітрукі былі дасланыя з Масквы, а гэтыя брыгады кантактавалі праз дзямідаўскія лясы з чырвоным войскам. У штабе партызанаў, які быў разьмешчаны ў вёсцы Апольле, знаходзіліся танкеткі. Нямецкае камандаваньне ведала пра гэта, але не высылала ў глухія лясы аблавы. Зімою 1941/42 раённы цэнтар Дзямідаў быў акружаны рэгулярнай савецкай арміяй і партызанскімі атрадамі. Акружаныя нямецкія войскі ды ОД мужна адбівалі напады Чырвонай арміі. Сувязь навонкі трымалася па радыё, а забесьпячэньне правіянтам і харчамі было наладжана самалётамі.

Дэлегацыі ад калгасаў Смаленскай акругі я выказаў свае думкі адносна змаганьня з камуністычнай Масквою й маскоўскімі партызанскімі бандамі. Сказаў, што — беларус з Заходняй Беларусі й змагаюся за вольнасьць і незалежнасьць усіх беларускіх земляў і падкрэсьліў, што смаляне належаць да беларускага крывіцкага племені й толькі ў выніку неспрыяльных для беларускага народу гістарычных падзеяў сталіся адарванымі ад Беларусі.

Народныя прадстаўнікі, сьвядомыя адносна сваёй прыналежнасьці да беларускага племені й Беларусі, прасілі ўключыць іх у вызвольную барацьбу ўсяго беларускага народу ды дапамагчы ім вызваліць вёскі ад маскоўскіх бандаў.

Пры маўклівай згодзе Смаленскай камэндатуры й генэрала Паоля я даў смалянам указаньне зьбіраць пакінутую падчас баёў у лясох і вёсках савецкую зброю, вінтоўкі, так званыя аўтаматы ППШ, кулямёты цяжкія й ручныя «Дзегцяровы» ды мінамёты і г. д. Апрача гэтага загадаў маскаваць супрацьтанкавыя гарматы, каб у патрэбную хвіліну можна было іх выкарыстаць. Без дазволу камэндатуры выдаваў калгасьнікам дазвол на права прывозу гэтай зброі ў Смаленск, у арганізаваную тут збраёвую майстэрню, дзе майстры зь мясцовых жыхароў яе рамантавалі. Зброі ды амуніцыі было дастаткова. У хуткім часе пачалі прыбываць транспарты зброі, замаскаванае ў саломе, якая ў майстроўнях прыводзілася ў парадак. У Смаленску знайшлося некалькі чалавек мясцовага каманднага складу, якія ў кароткі час праінструктавалі мясцовых калгасьнікаў у карыстаньні зброяй.

Былі арганізаваныя некалькі атрадаў ОД па 150 чалавек. Узброеныя аўтаматычнай зброяй і цяжкімі кулямётамі «Максім» ды кіраваныя мясцовым камандным складам, яны неспадзяваным нападам выбілі з найбліжэйшых трох вёсак партызанскія групы ды замацаваліся ў гэтых вёсках. У пачатковай акцыі мне значна дапамаглі браты Ўладзімер і Канстанцін Красоўскія з Заходняй Беларусі — сябры Беларускае Незалежніцкае Партыі.

У занятых вёсках былі пабудаваныя бункеры-дзоты, устаноўлены былі кулямёты, мінамёты й супрацьтанкавыя гарматы. Была наладжана сыстэма ракетнай сыгналізацыі й лучнасьці. Спробы маскоўскіх бандаў выбіць зь вёсак ОД не ўдаліся. Партызаны не чакалі моцнага агню абароны й вялікага баявога духу ў ОД — БКВ. Жыхары Смаленскага раёну пачуліся пэўнымі сваіх сілаў і поўнымі

ўздыму да змаганьня за свае чалавечыя правы й за свой дабрабыт. Вестка пра посьпехі ОД Смаленскага раёну хутка пашырылася па ўсёй акрузе. З усіх раёнаў акругі ў Смаленск у Галоўны штаб ОД прыбывалі дэлегацыі ад калгасьнікаў і прыносілі заявы з подпісамі жыхароў і просьбай дапамагчы ім вызваліцца ад маскоўскіх бандаў. Зброі было дастаткова, каб забясьпечыць ударныя атрады ОД. Добраахвотнікаў таксама было дастаткова. Бракавала толькі каманднага складу. Я згадаў, як у першых днях акупацыі Менску немцы вывозілі зь лягеру ваеннапалонных савецкіх камандзіраў — гэтыя камандзіры прасілі ў немцаў даць ім зброю, каб змагацца супраць бальшавікоў.

Атрымаўшы дазвол ад Паоля, паехаў у лягер ваеннапалонных, дзе знаходзіліся палонныя камандзіры Чырвонай арміі. Пасьля сяброўскай гутаркі з кожным камандзірам паасобку, падчас якой было выяўлена пры якіх акалічнасьцях камандзір трапіў у палон, адкуль родам, якой нацыянальнасьці, дзе знаходзіцца сям'я, стаўленьне да савецкай улады ці сябра кампартыі, такім чынам была выбрана першая група добраахвотнікаў з каманднага складу ад малодшага лейтэнанта да палкоўніка — разам 70 чалавек.

Для гэтай групы каманднага складу быў прыдзелены адпаведны вайсковы будынак. Афіцэры гэтай групы самі між сабою выбралі старшыню групы й былі абсалютна вольнымі ад вонкавага кантролю. Камандзіры адчувалі поўны да іх давер і маральна пачуваліся добра. Ніхто з былых ваеннапалонных камандзіраў ня выкарыстаў вольнасьці й ня ўцёк у лес, хоць ніякіх вартаўнікоў не было, каб іх пільнаваць. Цягам двух тыдняў яны прайшлі паўторны курс камандзіраў. Лектарамі былі кадравыя афіцэры Чырвонай арміі. Пасьля заканчэньня курсу афіцэры былі высланыя ў апорныя пункты ОД — БКВ. Яны ўсе апраўдалі ўскладзеныя на іх абавязкі.

У сьпешным парадку былі арганізаваныя трохтыднёвыя курсы для малодшага каманднага складу, а затым месячныя — для шараговага. Выкладчыкамі былі ўзятыя з ваеннага лягеру былыя чырвонаармейскія камандзіры. Зброя была савецкая: верхняя кашуля й штаны савецкай формы, а пінжакі — бэльгійскай уніформы. Харчаваньне было вайсковае.

Палітычнымі выкладчыкамі былі я, Міхась Вітушка і браты Красоўскія. З браку дастатковай лічбы каманднага складу ды арганізацыйных прычынаў спачатку прыходзілася абмяжоўвацца прытокам людзей суседніх вёсак, прызначаных для вызваленьня ад партызанаў.

Пры акруговым ОД арганізавалі Галоўны штаб ОД — БКВ з набранага ў лягеры каманднага складу. Шэфам я вызначыў былога савецкага палкоўніка Пятрова, былога начальніка адной Артылерыйскай афіцэрскай школы. Гэта быў энэргічны і здольны 41-гадовы афіцэр. Ён пазьней паехаў з намі ў Магілёў, дзе я вызначыў яго начальнікам афіцэрскай школы ОД.

У канцы траўня 1942 г. была скончана асноўная падрыхтоўка кадраў і шараговага складу ОД і па распрацаваным штабам ОД пляне былі вызваленыя вёскі Смаленскага раёну. Вёскі наладзілі паміж сабою вайсковую сувязь, каб у выпадку нападу маскоўскіх бандаў супольна абараняцца.

Вайсковыя атрады ОД былі арганізаваныя ў роты, батальёны й разам стваралі смаленскі полк. Сілы ОД хутка павялічваліся, і ўжо ў трэцім квартале 1942 г. лічба байцоў IV баявога аддзелу ОД — БКВ налічвала каля 5000 чалавек. Конныя гэтак званыя «лятучыя атрады» ОД кантралявалі днём і ўначы межы й лясныя ўчасткі раёну. Смаленскі раён быў вольны ад лясных бандаў. Мой ахоўны канвой складаўся з былых ваеннапалонных камандзіраў Чырвонай арміі. Гэта былі надзейныя й адважныя камандзіры, ворагі сталінскага рэжыму. Яны суправаджалі й ахоўвалі мяне падчас арганізацыйных і інспэкцыйных паездках па лясных пунктах ОД і ўдзельнічалі ў шматлікіх баях з партызанскімі злучэньнямі.

Акруговае ОД са сваім штабам і Смаленская акруговая ўправа разьмясьціліся ў вялікім трохпавярховым былым вайсковым блёку. Тут знаходзіўся й аўтамашынны парк ОД. Варта складалася таксама з былых ваеннапалонных камандзіраў Чырвонай арміі.

Каб спаралізаваць рост сілаў Смаленскага ОД, моцныя партызанскія злучэнні Баці і Грышына, падтрыманыя франтавымі чырвонаармейцамі й чатырма танкеткамі з партызанскага штабу вёскі Апольле, напалі на высунуты апорны пункт ОД. З дапамогай байцоў ОД з суседніх пунктаў партызанскі напад быў адбіты. Зь вялікімі стратамі партызаны адступілі. Камандзірам апорнага пункту СД быў мясцовы аграном Б.

Пазытыўна адбілася на выніку бою прысутнасьць у ОД каманднага саставу з былых савецкіх ваеннапалонных. Партызанскі штаб не разьлічваў на баявы дух байцоў ОД і іхны моцны й зьні-

шчальны агонь. З паказаньняў узятых у палон партызанаў было ўстаноўлена, што ў нападзе бралі ўдзел 800 чалавек партызанаў і 400 байцоў рэгулярнай Чырвонай арміі, якія для гэтай акцыі прыбылі праз дзямідаўскія лясы. Партызаны пакінулі на полі бою падбітыя танкеткі. Смаленскі раён быў вызвалены ад бандаў.

Акружаны зімою 1941/42 г. Дзямідаў быў вызвалены немцамі з акружэньня, але ў дзямідаўскіх лясох гаспадарамі былі маскоўскія партызанскія злучэньні Баці й Грышына. Гэтыя партызанскія злучэньні тэрарызавалі насельніцтва, забіралі ад яго прадукты харчаваньня, кароў і іншую жывёліну й сілаю змушалі калгасьнікаў браць актыўны ўдзел у падрыўной працы. Гэтыя банды рабілі зьверскія расправы над усімі, хто хоць трохі супраціўляўся іх загадам, палілі хаты, бязьлітасна зьдзеквaліся й зьнішчалі жыхароў. Часта ўзрывы мінамі нямецкіх аўтамашын на дарогах і забойства нямецкіх салдатаў каля вёсак выклікалі з боку немцаў рэпрэсіі.

Улетку 1942 г. нямецкія войскі ачысьцілі Касплянскі раён ад партызанскіх бандаў і перадалі Дзямідаў франтавы адцінак Смаленскаму ОД — БКВ.

ОД пад камандаю вопытных кадравых камандзіраў пераняла франтавы дзямідаўскі ўчастак. У даўжыню фронту былі пабудаваныя моцныя дзоты, якія адбівалі ўсе спробы лясных бандаў і рэгулярных сталінскіх вайсковых сілаў прарваць у гэтым участку лінію фронту. Новаарганізаваныя аддзелы ОД ачысьцілі ад бандаў увесь абшар Смаленскай акругі й замацавалі ўсе важныя пункты.

Генэрал Паоль гарантаваў вольнае жыцьцё ўсім жыхарам акругі сілаю змабілізаваных партызанамі, якія варочаліся ў свае вёскі. Партызаны масава са зброяй у руках варочаліся ў свае вёскі й уступалі ў шэрагі ОД. Былі арганізаваныя конныя «антыпартызанскія» атрады з былых партызанаў, і яны ўдзень і ўначы кантралявалі Смаленскую акругу. Увосень 1942 г. Смаленская акруга была вольная ад лясных бандаў. Лічба ОД у канцы 1942 г. у Смаленскай акрузе даходзіла да 15.000 чалавек.

Шмат разоў партызанскія злучэньні Грышына й Баці спрабавалі разьбіць ОД-блякаду, але заўсёды несьлі вялікія страты і былі поўнасьцю разьбітыя. Карныя экспэдыцыі аддзелаў СС спыніліся, і ў акрузе запанавалі супакой і парадак. Ізноў можна было ўдзень і ўначы бясьпечна езьдзіць па ўсіх дарогах акругі.

Яшчэ раз, вясной 1943 г., Грышын спрабаваў парушыць супакой у акрузе. З маскоўскім партызанскім злучэньнем у паўтары тысячы чалавек ён напаў на крайнія вёскі Касплянскага раёну, але арганізаваныя атрады ОД ужо былі паведамленыя аб нападзе й разьбілі атрад Грышына.

Другі раз, улетку 1943 г., лясныя бандыты выклікалі вялікае абурэньне й антыпартызанскую дэманстрацыю жыхароў Смаленску й акругі. Некалькі чалавек лясных бандытаў зрабілі засаду на смаленскіх артыстаў, якія грузавіком ехалі ў мястэчка Красны. Бандыты затрымалі машыну, забілі шафёра й на крыкі, што едуць безабаронныя жанчыны й артысты, адкрылі з ППШ агонь і забілі пяць жанчын-артыстак. Пазасталым у машыне параненым удалося выскачыць з машыны й схавацца ў высокім жыце. Бандыты ўцяклі.

Вестка пра бандыцкі напад і забойства артыстак хутка пашырылася па Смаленскай акрузе й

Віцебск у 1912 г. Фота С.Пракудзіна-Горскага.

выклікала вялікі гнеў і абурэньне. У дзень паховінаў ахвяраў бандыцкага нападу, труны з забітымі стаялі ў смаленскім Катэдральным саборы й танулі ў моры вянкоў і кветак. Тысячы жыхароў Смаленску й ягоных ваколіцаў прыйшлі выказаць сваю апошнюю пашану ахвярам нападу, выявіць салідарнасьць артыстам, запратэставаць супраць подлага забойства й прадэманстраваць нянавісьць да камунізму, да крамлёўскай сталінскай улады й да маскоўскага тэрору. Прысутнічала пераважна моладзь.

У перапоўненым народам саборы, з удзелам духавенства й царкоўнага хору, жалобную сьвятую службу й адпяваньне па нябожчыках адправіў япіскап Сьцяпан (Сеўба)[17], які быў хіратанізаваны ў Менску 17 траўня 1942 г. Панцеляймонам і Філафеем з тытулам смаленскі й бранскі. Затым у суправаджэньні Сьцяпана, хору, духавенства й прысутных жыхароў Смаленскай акругі, пахавальная працэсія скіравалася на могілкі, мейсца вечнага адпачынку.

Дзякуючы садзейнічаньню насельніцтва Смаленскай акругі, якое спантанна імкнулася вызваліцца з-пад маскоўскае камуністычнае дыктатуры, ад тэрору чырвоных лясных бандаў і ад карных экспэдыцыяў былі арганізаваныя моцныя збройныя сілы Смаленскага ОД, якія стаялі на варце інтарэсаў жыхароў Смаленшчыны й якія ў адпаведную хвіліну гатовы былі змагацца за вольную Беларускую дзяржаву.

У Смаленскай акрузе спыніліся нямецкія карныя акцыі. Насельніцтва акругі ў параўнаньні зь іншымі ваеннымі акругамі жыло спакойным жыцьцём, спадзеючыся на поўнае вызваленьне Бацькаўшчыны. Да канца ваенных дзеяньняў у Беларусі не было выпадку пераходу Бранскага й Смаленскага ОД і ягонага каманднага складу да лясных маскоўскіх бандаў.

Паоль, Краац, Тэсмэр усяляк дапамагалі мне. На жаль, інструкцыі й загады з Бэрліну часта перашкаджалі ў рэалізацыі вайсковых плянаў Краёвага войска ОД.

У такіх палітычных умовах вызвольная праца беларускага патрыятычнага актыву была вельмі цяжкай і небясьпечнай. Кожны дзень, кожную хвіліну беларускаму сьвядомаму актыву пагражала сьмерць — расстрэл.

НАРАДА АРГАНІЗАТАРАЎ БНП У ВІЦЕБСКУ

29 ліпеня 1942 г. разам зь Міхасём Вітушкам, Радаславам Астроўскім шашой праз руднянскія й лёзьненскія лясы, якія яшчэ так нядаўна былі запоўненыя маскоўскімі бандамі, наведалі ў Віцебску намесьніка гэтай акругі Ўсевалада Родзьку. Азнаёміліся з жыцьцём і ўмовамі працы, а таксама падзяліліся сваім практычным досьведам і інфармацыяй пра падзеі ў франтавой зоне Беларусі й на абшарах Генэральнага Камісарыяту Беларусі.

Утрох (я, Вітушка, Родзька) правялі нараду аб далейшай працы БНП. Радаслаў Астроўскі ў нарадзе ўдзелу ня браў, бо нават ня ведаў пра існаваньне арганізацыі.

Пасьля двухдзённай нарады мы ўзгаднілі праграму БНП і тактыку змаганьня з акупантамі Беларусі. Былі адзначаныя вялікія посьпехі ў арганізацыі збройных сілаў на сярэднім адцінку ўсходняга фронту, дзе вайсковае камандаваньне не перашкаджала ў арганізацыі й узбраеньні Беларускага краёвага войска (ОД). Беларусы спантанна й добраахвотна ўступалі ў шэрагі гэтага войска, каб бараніць ад бальшавіцкай небясьпекі свае вёскі й змагацца за сувэрэнную беларускую дзяржаву. Я праінфармаваў Усевалада Родзьку пра дзейнасьць сеткі БНП у Браншчыне й Смаленшчыне, а таксама пра далейшыя пляны — стварэньне вайсковых сілаў БНП ва ўсходняй частцы Беларусі.

У сваю чаргу, Родзька паведаміў пра колькаснае пашырэньне сеткі БНП на абшарах Генэральнага Камісарыяту Беларусі. Было адзначана, што ў Генэральным Камісарыяце Беларусі, дзе ўладу пераняла нямецкая цывільная адміністрацыя на чале з Кубэ, арганізацыя збройных беларускіх сілаў амаль не пасоўваецца наперад.

Было ўзгоднена, што:

1. Гітлер не зьмяніў свайго пляну калянізацыі Беларусі;

2. нямецкае франтавое камандаваньне зьяўляецца супраціўцам калянізацыі народаў СССР праз немцаў;

3. нямецкае франтавое камандаваньне разумее неабходнасьць шчыльнай супрацы насельніцтва Беларусі ў змаганьні з Масквою й ведае, што без збройнай дапамогі насельніцтва, акупаваных немцамі прастораў, яно не пераможа Маскву;

4. паміж гітлераўскім рэжымам і франтавой нямецкай арміяй пануюць вельмі непрыязныя дачыненьні;

5. нямецкае франтавое камандаваньне Сярэдняга фронту ёсьць супраць тэрарыстычных акцыяў СС і СД;

6. паміж франтавым нямецкім камандаваньнем і гітлераўскім штабам зь ягонымі аддзеламі СС і СД павінен надысьці канчатко-

вы канфлікт, у выніку якога гітлераўскі рэжым будзе зьменены новым дэмакратычным урадам;

7. лягічным ёсьць, што Захад павінен разумець маскоўска-камуністычную небясьпеку для ўсяго сьвету й не дапусьціць яе ўзмацненьня. У выніку гэтых гістарычных падзеяў новы нямецкі ўрад заключыць пакт з заходнімі дзяржавамі, каб супольнымі сіламі, у саюзе з паняволенымі Масквою народамі, перамагчы і зьнішчыць камуністычны рэжым і аднавіць вольныя й незалежныя рэспублікі;

8. заданьнем і мэтай Беларускай Незалежніцкай Партыі й далей ёсьць выкарыстаць гэтыя гістарычныя падзеі, арганізаваць і зцэмэнтаваць беларускія збройныя сілы і актыўна ўключыцца ў апошнюю фазу вайны супраць ворагаў беларускай незалежнасьці;

9. узмацніць стараньні ўтварыць беларускі дзяржаўны ўрад, які б злучыў усе народныя сілы і натуральныя багацьці для здабыцця вольнасьці й незалежнасьці;

10. навязаць кантакт з заходнімі дзяржавамі й паведаміць ім, што беларускі народ і ягоныя збройныя сілы змагаюцца супраць камуністычнай Масквы за сваю вольнасьць і незалежнасьць, а ня супраць вольных дзяржаваў сьвету;

11. выяўляць шкоднасьць русафільскай акцыі прапагандовага аддзелу галоўнага вайсковага кіраўніцтва ў Бэрліне й ягоных пададдзелаў на тэрыторыі ўсходняй франтавой часткі Беларусі, абсаджаных балтыйскімі й «рускімі» немцамі;

12. не дапушчаць да нішчэньня праз СС жыхароў Беларусі, а таксама не дапушчаць да самавольнага рабаўніцтва жывёлы праз нямецкія вайсковыя часткі й г.д. у мясцовага насельніцтва;

для гэтай мэты арганізаваць тайныя аддзелы БНП — беларускай антыфашысцкай партызанкі;

13. выдаваць тайны БНП бюлетэнь;

14. для поўнага азнаямленьня з сытуацыяй у Генэральным Камісарыяце Беларусі й для каардынацыі працы БНП ва ўсходняй і заходняй частках Беларусі пастаноўлена зрабіць паседжаньне ЦК БНП увосень 1942 году ў Менску;

15. навязаць цясьнейшыя кантакты з патрыятычным актывам паняволеных Масквою народаў з мэтай каардынацыі змаганьня за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі.

Пасьля гэтай нарады я й Міхась Вітушка вярнуліся ў Смаленск упэўненыя, што беларусы Віцебшчыны салідарныя з усім беларускім народам у барацьбе за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі.

ЗАЎВАГІ

[1] Паводле Энцыклапедыі гісторыі Беларусі (том 5, Мінск, 1999) і энцыкляпэдыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» (Мінск, 1990) Орша была акупавана нямецкімі войскамі 16 ліпеня.

[2] Яроменка Андрэй (1892—1970), савецкі военачальнік, Герой Савецкага Саюзу (1944), маршал Савецкага Саюзу (1955). Падчас Вялікай Айчыннай вайны камандаваў па чарзе войскамі Бранскага, Паўднёва-Ўсходняга, Паўднёвага, Калінінскага, 1-га й 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Ўкраінскага франтоў.

[3] Гудэрыян Гайнц Вільгельм (19.06.1888—14.05.1954), нямецкі военачальнік. Падчас Другое сусьветнае вайны камандаваў танкавым корпусам, танкавай групай і арміяй (да сьнежня 1941 г.). У 1944—45 гг. начальнік генштабу сухапутных войскаў.

[4] Арнім Юрген Ганс фон (4.04.1889—1.09.1969), нямецкі военачальнік, генэрал-палкоўнік (03.12.1942). Браў удзел у Польскай кампаніі (верасень 1939). З 5 кастрычніка 1940 г. камандзір 17-й танкавай дывізіі. З чэрвеня 1941 г. — на савецка-нямецкім фронце, у складзе групы армій «Цэнтар» браў удзел у баях пад Масквой у кастрычніку 1941 г. 6 кастрычніка 1941 г. імклівым ударам авалодаў Бранскам. У пачатку 1942 г. ваяваў у Афрыцы, камандаваў 5-й танкавай арміяй, пасьля адстаўкі Э.Ромэля ў сакавіку 1943 г. прыняў камандаваньне групай армій «Афрыка». У траўні 1943 г. капітуляваў з арміяй у Тунісе.

[5] ОД (OD — *Ordnungsdienst* — служба парадку) — дапаможная паліцыя. Стваралася зь мясцовага насельніцтва, займалася аховай грамадзкага парадку. Структуры ОД непасрэдна падпарадкаваліся бурмістрам. Паліцыя ОД стваралася ў сельскай мясцовасьці з разьліку адзін паліцыянт на 100 жыхароў, у гарадзкой рысе — адзін паліцэйскі на 300 жыхароў.

[6] Васкабойнікаў (Васкабойнік) Канстанцін (1895, м. Сьмела Чаркаскага павету Кіеўскай губэрні — 8.01.1942). Зь сям'і чыгуначніка. Вучыўся на юрыдычным факультэце Маскоўскага ўнівэрсытэту. У 1919—1920 гг. у Чырвонай арміі. У 1921 г. браў удзел у сялянскім антыбальшавіцкім паўстаньні, пасьля паразы якога нейкі час хаваўся. Легалізаваўшыся пад чужым імем, працаваў у Маскве ў Палаце мераў і вагаў. У 1931 г. асуджаны, тэрмін адбываў у Сыбіры. З 1938 г. жыў у мястэчку Локці (Брасаўскі раён Бранскай вобл.), выкладаў у Брасаўскім тэхнікуме леса-хімічнай прамысловасьці. Падчас нямецкай акупацыі — бурмістар Локацкай акругі. Разам з Браніславам Камінскім арганізаваў атрады самаабароны. 25 лістапада 1941 г. у Локці быў надрукаваны маніфэст Расейскай Народнай Сацыялістычнай Партыі «Вікінг» («Віцязь») за подпісам «інжынэр Зямля (Васкабойнік)». Паводле Васкабойніка, РНСП была створана яшчэ ў сыбірскіх канцлягерох. Асноўная яе мэта — поўнае зьнішчэньне камуністычнага й калгаснага ладу, бясплатная перадача сялянам зямлі, амністыя палітзьняволеным, адраджэньне расейскай дзяржавы. Канстанцін Васкабойнік загінуў 8 студзеня 1942 г. падчас партызанскага нападу.

[7] Камінскі Браніслаў (1899—19.08.1944). Нарадзіўся на Полаччыне ў каталіцкай сям'і. У 1918—1920 гг. служыў у Чырвонай арміі, потым вучыўся ў Петраградзкім хіміка-тэхналягічным інстытуце, працаваў на заводзе «Рэспубліка». У 1935 г. за крытыку калектывізацыі выключаны з ВКП(б), а ў 1937 г. арыштаваны па справе Працоўнай Сялянскай Партыі й асуджаны. У 1941 г. працаваў у Локці на сьпіртзаводзе. Пасьля сьмерці Васкабой-

ніка ўзначаліў атрады самаабароны (народнай міліцыі). Камінскі здолеў стварыць жыцьцяздольныя атрады самаабароны. Зь верасьня 1942 г. народная міліцыя Камінскага займела назву Расейская Вызвольная Народная Армія. Атрады народнай міліцыі складаліся з 14 батальёнаў і налічвалі 10 тыс. чалавек. Набор ажыцьцяўляўся зь мясцовага насельніцтва, а камандаваньне РВНА ня мела нямецкага кіраўніцтва, як было ў аналягічных «усходніх батальёнах». Нямецкае кіраўніцтва дало дазвол на самакіраваньне Локацкай акругі, што складалася з васьмі раёнаў Бранскай, Арлоўскай і Курскай абл., насельніцтвам у 580 тыс. Локацкая акруга стала пры Камінскім, які быў обэр-бурмістрам, міні-дзяржавай. Акруга дзялілася на раёны, якія кіраваліся бурмістрамі. 26 жніўня 1943 г. з-за наступу савецкіх войскаў была арганізаваная эвакуацыя РВНА. Батальёны былі пераведзеныя ў раён Лепеля (сёньняшняя Віцебская вобласьць), дзе вялі барацьбу з партызанамі. Потым брыгада Камінскага, папоўненая беларускімі паліцэйскімі, была пераведзеная пад Дзятлава (Наваградзкая акруга). Улетку 1944 г. на аснове брыгады была створаная 29-я грэнадзёрская дывізія СС. Некалькі батальёнаў Камінскага былі выкарыстаныя для задушэньня Варшаўскага паўстаньня (жнівень 1944 г.). Батальёны Камінскага арганізавалі ў Варшаве татальную разьню, у выніку якой загінулі таксама й немцы. Гэтая акцыя выклікала пратэсты сярод нямецкага камандаваньня. 19 жніўня 1944 г. Камінскі загінуў: ягоны аўтамабіль быў расстраляны аўтаматчыкамі.

[8] Шміт Рудольф (12.05.1886—7.04.1957), нямецкі военачальнік, генэрал-палкоўнік. Браў удзел у Польскай кампаніі 1939 г., заваяваньні Нідэрляндаў і Францыі (вясна — лета 1940 г.). Зь лета 1941 г. — на Ўсходнім фронце. 1 студзеня 1942 г. зьмяніў Гайнца Гудэрыяна на пасадзе камандуючага 2-й арміяй. Пасьля паразы на Курскай дузе падаў у адстаўку, пакінуўшы шэрагі вэрмахту. Жыў у Вэймары, у 1947 г. арыштаваны савецкай выведкай. Утрымліваўся ў Бутырскай, Ляфортаўскай, Уладзімерскай турмах. Асуджаны на 25 гадоў пазбаўленьня волі. У 1956 г. паводле абмену перавезены ў турму ў Заходняй Нямеччыне, дзе амаль адразу быў вызвалены.

[9] Сёньня горад у Тульскай вобласьці Расейскай Фэдэрацыі.

[10] Горад у Смаленскай вобласьці.

[11] Мястэчка ў Калускай вобласьці.

[12] Павал (Мялецьеў Трафім, 15.11.1880—19.05.1962). Нарадзіўся ў Архангельскай губэрні ў сям'і дыякана. Быў манахам Салавецкага манастыра, займаўся місіянэрскай дзейнасьцю на поўначы Расеі. У 20—30-я гады двойчы арыштоўваўся савецкай уладай, адседзеў у лягерох агулам 12 гадоў. Падчас нямецкай акупацыі працягваў займацца місіянэрствам. У 1943 г. хіратанізаваны ў япіскапа Бранскага. Зь лета 1944 г. — на выгнаньні. Дапамагаў перамешчаным асобам. Улетку 1946 г., унікаючы прымусовай дэпартацыі ў СССР, перайшоў у каталіцтва, атрымаў тытул біскупа Геракліопальскага. Жыў у Бэльгіі. Трагічна загінуў у Брусэлі — зьбіты аўтамабілем.

[13] Мяньшагін Барыс (26.04.1902—25.05.1984). Паходзіў зь сям'і юрыста. З 1919 па 1927 г. — у Чырвонай арміі, па дэмабілізацыі атрымаў юрыдычную адукацыю. У 1928 — 1931 гг. служыў у калегіі адвакатаў пры абласным судзе Цэнтральна-Чарназёмнай вобласьці, затым — вядомы адвакат у Смаленску. Абараняў сялянаў падчас калектывізацыі й «ворагаў народу». У ходзе справы аб шкодніцтве ў жывёлагадоўлі «дайшоў» да генэральнага пракурора СССР А. Вышынскага й дабіўся адмены сьмяротнага прысуду.

З арганізацыяй гарадзкой управы ў Смаленску улетку 1941 г. пераняў абавязкі начальніка гораду. Зь верасьня 1943 г. займаў пасаду бурмістра Бабруйску. Зь лета 1944 па травень 1945 г. працаваў у штабе Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі. Быў інтэрнаваны амэрыканскімі войскамі.

У траўні 1945 г. пасьля добраахвотнага зьяўленьня ў савецкай камэндатуры (шукаў сям'ю) быў арыштаваны. Па іншых зьвестках, перададзены саветам амэрыканцамі. Шэсьць гадоў знаходзіўся пад сьледствам. У верасьні 1951 г. засуджаны на 25 гадоў пазбаўленьня волі. Утрымліваўся ва Ўладзімерскім цэнтрале, большую частку зьняволеньня знаходзіўся ў адзіночнай камэры. Выйшаў на волю ў 1970 г. Па вызваленьні пражываў у дамах для інвалідаў у Мурманскай вобласьці. Пакінуў *Воспоминания* (выдадзеныя ў Парыжы ў 1988 г.).

[14] Трэскоў Генінг фон (10.01.1901—21.07.1944), нямецкі вайсковы дзеяч, адзін з удзельнікаў руху Супраціву ў Нямеччыне. Улетку 1941 г. у чыне падпалкоўніка накіраваны на Ўсходні фронт, займаў наступныя пасты: камандзіра палка, начальніка штабу 2-й арміі, штабу групы армій «Цэнтар». Адзін з кіраўнікоў замаху на Гітлера ў Смаленску 12 сакавіка 1943 г., які мусіў адбыцца ў Смаленску. Пасьля правалу замаху на Гітлера 20 ліпеня 1944 г. скончыў жыцьцё самагубствам. Пахаваны на сваёй радзіме ў Магдэбурзе, але пасьля таго як высьветлілася, што браў удзел у падрыхтоўцы замаху на фюрэра, ягонае цела была выкапанае й спаленае ў Бэрліне.

[15] Грышын Сяргей (18.03.1917—25.06.1994), Герой Савецкага Саюзу (1943), кандыдат ваенных навук (1964). З 1939 г. у Чырвонай арміі. Падчас нямецка-савецкай вайны — камандзір палка «Трынаццаць» (з чэрвеня 1944 г. — брыгада), што дзейнічаў на Смаленшчыне, у Магілёўскай і Віцебскай абласьцях. Па вайне працаваў выкладчыкам у розных ваенных навучальных установах.

[16] Каляда Нікіфар (псэўд. Баця, 9.02.1891—1.03.1955), адзін з арганізатараў партызанскага руху на Смаленшчыне. Удзельнік Першай сусьветнай вайны, скончыў вайну ў чыне штабс-капітана. У 1918—1922 гг. у Чырвонай арміі, арганізатар партызанскай барацьбы на Падольшчыне й Далёкім Усходзе. У ліпені 1941 г. прыбыў на Смаленшчыну, сфармаваў атрад № 1 з супрацоўнікаў партгасактыву. Да лютага 1942 г. Баця аб'ядноўваў больш за 20 атрадаў на тэрыторыі Смаленшчыны й Браншчыны, да лета 1942 г. у падпарадкаваньні Баці знаходзіліся пяць брыгадаў. 6 верасьня 1942 г. узнагароджаны ордэнам Леніна, а 8 кастрычніка Н. Каляда па лжывым абвінавачаньні асуджаны на доўгі тэрмін зьняволеньня. Рэабілітаваны ў 1954 г.

[17] Стэфан (Сьцяпан) (Сеўба Сямён, 1872—25.01.1965). Нарадзіўся ў вёсцы Цялуша (сёньня Бабруйскі раён Магілёўскай вобласьці). Скончыў Менскую духоўную сэмінарыю. У 1896 г. рукапакладзены ў сьвятара, служыў у Менскай япархіі. Пасьля падзелу Беларусі ў 1921 г. застаўся на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Быў зацятым супраціўцам аўтакефаліі ПАПЦ, за што перасьледаваўся й неаднаразова ўтрымліваўся ў турмах. У 1942 г. узьведзены ў сан япіскапа Бранскага й Смаленскага. Зь лета 1944 г. — у эміграцыі, перайшоў у РЗПЦ. Быў вызначаны япіскапам венскім і зальцбурскім. Памёр у Зальцбурзе.

Падрыхтоўка да друку,
камэнтары Алега ГАРДЗІЕНКІ.

Далей будзе.

РЭЦЭНЗІІ

“І за гарою пакланюся...”

Санько С., Валодзіна Т., Васілевіч У. і інш. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік, Мінск: Беларусь, 2004, 592 с., 3000 экз.

Да трэцяга тысячагоддзя дажыў выяўлены словам у казках і песнях, дзействам у абрадах і скоках, узорамі-абярэгамі на тканінах і рэчах сусвет прашчураў-дзядоў. І пад іхнай апекай створаны ў выдавецтве «Беларусь» энцыклапедычны слоўнік «Беларуская міфалогія» *(Мінск, 2004)*: сабраны плён працы даследнікаў-відавочцаў, якія два стагоддзі рупіліся сабраць і захаваць тую спадчыну. Ім і за гарою пакланюся...

Навукоўцам, што ўрабляюць наш цалік тае навукі, пакланюся за смеласць вырачыся стэрэатыпаў, выяўленых, прыкладам, у выданні «Мифологический словарь» *(Москва, 1991)*. У тым фаліянце нашы міфы не згаданы, хоць вядомыя. Як напісаў у прадмове да «Беларускай міфалогіі» Сяргей Санько, «незвычайная глыбіня фальклорнай “памяці” нашага народа, адметная даўніна беларускага матэрыялу» заўважана Вяч. Іванавым і Ул. Тапаровым ды агалошана імі ўжо ў 1972 г. Паводле іхнага меркавання, каравайныя аздобы, прыкладам, выявы сонца, месяца, жывёлаў або частак іх, шышкі дакладна супадаюць з «наборам рытуальных сімвалаў, якія малююцца каля сусветнага дрэва... а таксама на старажытных малюнках у Пярэдняй Азіі і Індыі» *(Іванаў Вяч. Ус., Тапароў Ул. М. Архаічныя рысы рытуалаў, павер’яў і рэлігійных уяўленняў на тэрыторыі Беларусі // Беларускае і славянскае мовазнаўства. Мн., 1972. С. 166)*.

Выпадае самым паказаць скарбы духоўнае культуры продкаў. А спадчына багатая: толькі ў гэтым слоўніку пададзена 736 артыкулаў. І шчыраваць ёсць каму: Сяргей Санько, Таццяна Валодзіна, Уладзімір Васілевіч, Людміла Дучыц, Эдвард Зайкоўскі, Іван Крук, Уладзімір Лобач, Андрэй Прохараў, Лія Салавей. Менавіта яны прадвызначылі годны навуковы ўзровень выдання. Багатым зборам абрадаў ды «жаночых сакральных “ведаў”» падзялілася Таццяна Валодзіна. Падала свае міфалагічныя знаходкі археолаг Людміла Дучыц. Лія Салавей нагадала пра падабенства міфалагічных уяўленняў нашых прашчураў ды хетаў і адхінула рубок таямніцы некаторых зёлак.

Веды, эрудыцыя аўтараў, а таксама асобныя не згаданыя вобразы паэтычнага светаўяўлення нашага народу, прыкладам, асець, Баян, купальнік (Arnica Montana), маці-радзіцельніца, куцця, святое дрэва, цьма ‘начныя матылькі’ ды іншыя, даюць падставу чакаць перавыдання «Беларускай міфалогіі» ды нават Беларускую міфалагічную энцыклапедыю з «малюнкамі — канспектамі міфаў» манаграфіі Міхаіла Кацара «Беларускі арнамент».

АРХАІЧНЫЯ ПОВЯЗІ: СПРОБА НОВАГА ПАДЫХОДУ

Некаторыя навукоўцы сягнулі па-за межы славянскага рэгіёну, падалі паралелі з асяцінскай, грэцкай, індыйскай, хецкай міфалогіяў. Верагодна, толькі выдавецкія нормы ды форма выдання — слоўнік — прымусілі аўтараў у некаторых выпадках абмежавацца згадваннем паралеляў, прыкладам: пчаліная матка — хецкая Камрусэпе *(«Пчала». С. 400)*; падабенства выяваў Ярылы (Перуна) і хецкага «**богавершніка** Пірвы, апекуна царскае дружыны» *(«Пярун». С. 405)*. Повязі можна сачыць і праз падабенства прававога стану пэўных мужчынскіх групаў: тэрмін «ты стаў ваўком» хецкіх законаў *(«Воўк». С. 90)*, згаданая Герадотам уласцівасць неўраў «абарачацца ў ваўка» ды наша казачнае выслоўе «скінуўся воўкам». Ёсць і непасрэднае падабенства міфаў.

Так, Андрэй Прохараў згадвае сюжэт пра 30 братоў (казка «Мал-Малышок»), што «ва ўсіх асноўных матывах цалкам адпавядае хецкаму міфу аб 30 сынах і 30 дочках царыцы Канеса, які лічыцца найбольш старажытным зафіксаваным тэкстам у індаеўрапейскай мове» *(Артыкул «Трыццаць братоў». С. 509)*. З ягонага меркавання вынікае, што і казка «Мал-Малышок» — адзін з самых старажытных міфаў.

Тое ж можна сказаць і пра казку «Каза Дарота», у якой захава-

ліся звесткі пра архаічныя культы казы ды бога-продка — Дзеда. У казцы распавядаецца, што за непавагу да козаў дзед пакараў кожную сваю дачку ды жонку, а пасля дзіўна пахаваў іх: «...пад печ падкінуў, ступай закаціў, скаародкай завесіў, саломкай падпаліў». І гэта не выдумка казачніка-вычвора. Незвычайныя пахаванні дзяцей — пад печчу ды пад адкрытым агменем — выяўлены ў Паўночнай Месапатаміі. Так хавалі маленькіх нябожчыкаў у паселішчах хасунскай архаічнай культуры (канец VII—V тысячагоддзе да Х. Н.) *(Антонова Е. Обряды и верования первобытных земледельцев Востока. М., 1990. С. 70)*. Больш распаўсюджаным быў звычай пахавання дзяцей «пад сценамі, парогамі і падлогай дамоў». Яго, як мяркуюць археолагі, выкарыстоўвалі ў нейкіх абрадах носьбіты раннеземляробчых культураў старажытнай Месапатаміі, а таксама і Еўропы *(Мерперт Н., Мунчаев Р. Погребальный обряд племен Халавской культуры (Месопотамия) // Археология Старого и Нового Света. М., 1982. С. 28)*. Водгулле, відаць, падобных абрадаў нашых прашчураў — вядомы звычай продкаў закопваць пад парогам «дзяціннае месца» *(«Парог». С. 367)*.

Хацелася б даведацца, ці ёсць падставы звязваць рытуальнае спажыванне ўсходнімі беларусамі запечанай галавы свінні — «старажытнага салярнага сімвала і сімвала ўрадлівасці» *(«Аўсень». С. 29)* — падчас «аўсеневага» свята ды старажытнахецкі падзел народаў на цывілізаваных і дзікіх — паводле прыкметы: «тыя, што ядуць свініну» і «што не ядуць свініну» *(«Свіння». С. 457)*.

ПРА «ШКОДНЫЯ» ЎПЛЫВЫ

Этнографы, фалькларысты, гісторыкі ўсцяж будуць разважаць пра культурную значнасць і навуковую вартасць гэтага слоўніка. Што да ўдзячных аматараў даўніны, то іх ацэнка вядомая: «Беларуская міфалогія» вельмі хутка знікла з кнігарняў.

Асмелюся і я «свае тры грошыкі прыткнуць», як то пісаў Якуб Колас, стваральнік «Казак жыцця». Ды падобна як над Коласавым Міхалам звісае лёс «страшнаю марою», так і над аўтарамі слоўніка вісіць, «бы кара цёмнае праклёны», балцкасць: арэал, уплывы, міфалогія. Не маюць аўтары такіх паралеляў, як да хецкіх міфаў ды звычаяў жыхароў Месапатаміі. Не грунтуюць свае меркаванні на архаічных тэкстах, археалагічных знаходках. Ды не могуць вырачыся даўніх балцкіх чараў, хоць і самі бачаць «супярэчлівасць тых крыніцаў, на якія абапіраліся». Як зазначыў у «Прадмове» Сяргей Санько, «уплыў з боку суседніх культур і панавальных ідэалогій» ужо спрычыніўся да ўзнікнення сур'ёзных хібаў выдання.

Прыклад негатыўнага ўплыву бачны ў артыкуле пра зайца, дзе ён названы «ўвасабленнем урадлівасці і плоднасці». Але ж ці слушна рабіць такія высновы толькі з сюжэтаў некаторых казак пра жывёл, чарадзейных казак ды адной летапіснай згадкі? Зазначаюць жа аўтары, што значна радзей сустракаецца заяц у абрадавым фальклоры: каляндарная абрадавая паэзія не выкарыстоўвае анекдатычных сюжэтаў. Не пераканаўчы і прыклад — казка «Сіняя світа», бо гэта «беларускі варыянт сюжэту казкі "Алена Прамудрая"» *(Чарадзейныя казкі. Частка II. Мн., 1978. С. 588)*. У нашым фальклоры няма твору пра зайца, што можна было б супаставіць з нашымі міфамі, у якіх дзейнічаюць воўк, конь. А ў казках «Іван і Кусюлька», «Мал-Малышок», «Шкляныя горы», «Шывар-маладзец», дзе адлюстраваліся архаічныя* ўяўленні нашых прапрашчураў, конь і воўк — сапраўдныя дэміургі.

* Архаічныя элементы нашых казак, фактычна міфаў: Іван у зялёным футры з казкі «Іван і Кусюлька», Мал-Малышок у «шубе касматай» з казкі «Мал-Малышок». Да іх маем сапраўды архаічныя паралелі: Хедзін, 'у футра апрануты ваяр', — персанаж германа-скандынаўскага міфа-эпічнага твору *(«Мифологический словарь». М., 1991. С. 590)*, а таксама пахаванне ў шкурах *(Меларт Дж. Древнейшие цивилизации Ближнего Востока. М., 1982. С. 87)* ды цырыманіяльнае адзенне з звярыных шкураў у жыхароў паўднёвай Анатоліі цягам VII—VI тысячагоддзяў да Х. Н. *(Антонова Е. Обряды и верования... С. 191)*. Сюды ж можна далучыць і «парсюка, залатая шарсцінка, сярэбраная шарсцінка» з казкі «Шывар-маладзец», шуканне жонкі Івана Знайдзёна, героя казкі «Шкляныя горы», з дапамогай ваўка і «ваўчынае шэрсці». Сюжэт аб зніклай жонцы, дарэчы, адлюстраваны ў «Панчатантры» *(Чарадзейныя казкі. Частка II. Мн., 1978. С. 561)*. А вобраз Шкляных гор — месца куды паляцела жонка галоўнага героя — вельмі нагадвае «Свет памерлых» старажытных жыхароў Месапатаміі. «Увогуле, гара, як і пустыня і вада, паводле традыцыі Месапатаміі, — элементы "чужой" прасторы, не заселенай і не культываванай, таму натуральнае ўяўленне аб іх як пра месца знаходжання памерлых» *(Антонова Е. Обряды и верования... С. 251)*. Прыкладам, паводле акадскіх тэкстаў «Свет памерлых» — гэта не толькі Ніжняя зямля, але і гара *(Тамсама. С. 101)*. «Уяўленне пра гару як "Свет памерлых" вядомае і паводле ўгарытскіх тэкстаў заходніх семітаў» *(Тамсама. С. 97, 102)*.

Земляробы, пачынаючы ад шумераў, за сымбаль плоднасці мелі казла *(Антонова Е. Обряды и верования первобытных земледельцев Востока. С. 241)*. Старажытныя грэкі ўяўлялі апекуна расліннасці таксама ў выглядзе казла. І нашы шчадроўнікі спяваюць: «дзе каза нагою, там жыта капою». Таму прыпісанае зайцу «ўвасабленне ўрадлівасці і плоднасці» падаецца надуманым. Варта пагартаць «Мифологический словарь», каб пераканацца, што культ зайца не ўласцівы індаеўрапейцам.

Аўтараў артыкулу пра зайца ўвялі ў зман, відаць, галіцка-валынскія летапісцы або рэдактары «Аповесці мінулых гадоў». Пра нашага першага караля Міндоўга, які хрысціўся паводле лацінскага абраду, яны напісалі: «Крещение же его льстиво бысть: жряше богомъ своимъ вътайне, первому Нънадееви, и Телявели, и Диверикъзу, заечему богу и Меидеину...» *(ПСРЛ. Т. II. Ипатьевская летопись. Издание 2-е. СПб., 1908. С. 817)*.

Паводле акадэміка А. Арлова, «уся "Аповесць мінулых гадоў"... адрэдагавана на паўднёвым захадзе», г. зн. у Галіцка-Валынскай зямлі. «Былі два галіцка-валынскія рэдактары... Першы працаваў пасля 1240 года... другі ж рэдактар дзейнічаў яшчэ пазней, але ўсё ж у XIII стагоддзі» *(Орлов А. О галицко-волынском летописании. ТОДРЛ. Т. V. М., Л-д, 1947. С. 32)*. Значыць, плётка з'явілася ў той час, калі Міндоўг быў вялікім князем у Наваградскім княстве, землі якога хацелі захапіць галіцка-валынскія князі. Іх намер касаваўся хрышчэннем і каранацыяй Міндоўга, што азначала пераход Наваградскага княства пад апеку святога Пятра, гэта значыць, Папы рымскага. Таму абвінавацілі Міндоўга ў падмане: маўляў, ён застаўся паганцам.

Магчыма, хтось скажа, што не варта звяртаць увагу на тую байку пра Міндоўгава пакланенне «Диверикъзу». Так, вядомы мовазнаўца, даследнік міфалогіі Аляксандр Брукнер у сваёй кнізе «Старажытная Літва. Народы і багі» напісаў: «...містычная літоўская фантазія не адыходзіла ... ад прымітыўнага ачалавечвання прыроды, прыкладам, *Мядзініс* значыць *Лясны* (бог)... *Пяркун*, таксама першабытная персаніфікацыя грому... Пры такой персаніфікацыі з'яваў прыроды не дзівіць нас, калі побач з лесам і Перуном знойдзем і вясёлку — прынамсі, пакуль што Дзівірыкса лепш вытлумачыць не ўмеем. Літовец і сягоння называе вясёлку *orarykszte* «паветранай розгай»... магла калісьці называцца і *dieworikstem* "божай розгай"» *(Brückner A. Starożytna Litwa. Ludy i bogi. Olsztyn, 1984. C. 74)*. А. Брукнер жа, як сцвярджаюць, добра ведаў не толькі літоўскую мову: «яму даручалі агляды даследаванняў славянскіх і балцкіх моваў» *(Brückner A. Starożytna Litwa. Ludy i bogi. C. VIII)*.

Дарэчы, аўтары артыкулу пра зайца пацвярджаюць сваю думку чамусьці не літоўскімі, скажам, прыкладамі, а «прускімі ватыўнымі формуламі, накшталт "O Deiwe Rikijs..." — "О, Гасподзь Бог..."» *(«Заяц». С. 186)*, Але ж мовазнаўца Казімерас Буга адвяргаў тлумачэнне назвы «божая розга» праз слова прускага паходжання Rikis 'кароль' *(Грэймас Альгірдас Юліус. Пра багоў і людзей. У пашуках этнічнай памяці. Мн., 2003. С. 295)*. Альгірдас Юліус Грэймас жа «адабраў» у «заечего» бога імя, маўляў, слова Дзівірыкс тлумачыцца як «Божы Наглядчык». Гэтае словаспалучэнне ён прызнаў за «эпітэт Пяркунаса», але не галоўнага паганскага бога, а ўсяго толькі «выканальніка даручаных яму паліцыйных абавязкаў» *(Тамсама. С. 328)*.

Нашым аўтарам не варта падаваць тых прыдуманых бостваў. Ужо толькі праз згадванне іх падтрымваецца меркаванне, што Міндоўг — літоўскі кунігас, а не Наваградскі князь і кароль. Таму абвяржэнне выдумкі валынскага летапісца не прыхамаць, а спроба аднаўлення сапраўднага, хрысціянскага — як вынікае з розных крыніцаў, — светапогляду Міндоўга. А сведчанні пра хрысціянскае веравызнанне першага Наваградскага караля знаходзім у Густынскім летапісе *(ПСРЛ. Т. 2. СПб., 1843. С. 341)*, ва Уваскрасенскім летапісе... *(ПСРЛ. Т. 7. СПб., 1856. С. 165)*, у «Лівонскай рыфмаванай хроніцы» *(Die Livlȣndische Reimchronik von Dittlieb von Alnpeke. Reval, 1848. Радок 6383)*, у папскіх булах пра хрышчэнне яго і каранаванне на «Dei graciae rex Litowiae» (Божай ласкай караля Літвы) *(Kętrzyński W. O dokumentach Mendoga, króla litewskiego. Kraków, 1907. C. 22)*, у ягоным гербе, г. зн. пячатцы з імем «Миндовга», адным з элементаў якога з'яўляецца крыж *(Труды музея палеографии. Выпуск 1. Л-д, 1928 // Лихачев Н. П. Материалы для истории византийской и русской сфрагистики. С. 247)*.

ПРА СОВІЯ І АЛЬЦЫСА

Аднак штучна ўтвораныя «вобразы» літоўскай міфалогіі, прыкладам, Палямон ды Швінта-

рог ушанаваны асобнымі артыкуламі і ў «Беларускай міфалогіі». Перавандравалі сюды і Совій *(«Сварог». С. 454)* з Альцысам *(«Шатрыя». С. 565)*. Пра «асобу» першага даведваемся ад вядомага расейскага гісторыка В. Істрына. Ён падае цытату з «Хронікі» Іаана Малалы, бізантыйскага храніста VI ст., які паходзіў з Анціохіі: «Въ та же лета Сави некто, боляринъ Антиохия, пришедъ съ Авгоустомъ въ Римъ, оумре въ Риме, пороучивъ память свою градоу своемоу творити... игры скомрашьскыя и скоуколныя...» *(Истрин В. М. «Хроника» Іоанна Малалы в славянском переводе. Книги 8 и 9 // Сборник ОРЯС Императорской АН. Т. 89. № 7. СПб., 1912. С. 17)*.

Як вынікае з тэксту «Хронікі», згаданы Саві (Совій) — гэта звычайны чалавек з рымскай калоніі ў Малой Азіі ў эпоху Юлія Цэзара ды ягонага пляменніка «Авгоуста» — імператара Аўгуста Гая Актавія, які правіў з 44 года да Х. Н. па 14 год пасля Х. Н. Няма нічога незвычайнага і ў з'яўленні Саві ў Рыме. І ператвараць яго ў нейкае боства, тым больш у літоўскае боства, не маем падставы. А гэтак названы міф пра Саві — адвольная ўстаўка. В. Істрын пісаў: «У той частцы Архіўскага хранографа, дзе аповед з Хронікі Малалы разрывае XI глава кнігі Быція, змешчана звестка пра ерась нейкага Саві, паганская цуднасць якога ўвайшла і «в литовский род, и Ятвезе, и в Прусы, и в Емь, и во Ливь» *(Истрин В. Первая книга Хроники Иоанна Малалы // Записки Императорской Академии наук. VIII серия по историко-филологическому отделению. Т. I. № 3. СПб., 1897. С. 24)*.

В. Істрын меркаваў, што рэдактар «Иудейского хронографа XIII века», «выпісаўшы з Малалы паданне пра Саві, звярнуў увагу і на тагачасны такі ж звычай паліць трупы памерлых ды прыпісаў яго Саві» *(Истрин В. Александрия русских хронографов. Исследования и текст. М., 1893. С. 360)*. Выснова В. Істрына ясная, адназначная. Гэтак названы літоўскі «міф» пра Саві створаны храністам або рэдактарам у 1262 г.: такую дату напісання Віленскага хранографа падае В. Істрын у іншым артыкуле.

Але, як уяўляецца, падставай для эмацыйнага каментару летапісца пра «паганскую ерась нейкага Саві» маглі стаць падзеі пасля забойства Міндоўга ў 1263 г. Тады былі разбураныя хрысціянскія храмы ў Горадні, Ваўкавыску, Менску, Наваградку. Пэўна ж аднавіўся, верагодна, нават дэманстратыўна, паганскі звычай спальвання нябожчыкаў. Паганскія жрацы пачынаюць актыўна ўмешвацца ў дзяржаўную палітыку, пра што сведчыць і перанос сталіцы Вялікага Княства Літоўскага ў паганскую Вільню. «Фактычна, гэта азначала наданне паганскаму культу характару дзяржаўнай рэлігіі», — так ацэньвае тыя падзеі епіскап Наваградскі і Лідскі Канстанцін *(Константин, епископ Новогрудский и Лидский. История Новогрудской епархии от основания до настоящего времени // Другія «Наваградскія чытанні». Навагрудак, 1993. С. 22)*.

Бясспрэчная яшчэ адна выснова: калі б сапраўды быў такі міф, то да Літвы ў сучасным разуменні гэтага тэрміна, ён не меў бы ніякага дачынення, бо згадана не краіна, а толькі «літоўскі род», магчыма, прафесійныя ваярылітва, якія служылі Наваградскаму княству. Дарэчы, ні пра Саві, ні пра паленне нябожчыкаў абазнаныя ў «літоўскіх» звычаях хрысціянскія галіцка-валынскія летапісцы не згадваюць, хоць, як мяркуюць даследнікі, ім славянскі пераклад «Хронікі» Іаана Малалы быў вядомы.

Аднак звестку пра Саві некаторыя даследнікі, прыкладам, аўтары артыкулу «Совий» у даведніку «Мифологический словарь», падаюць за міф балцкіх народаў. Там чытаем: «Совий, в литовской мифологии основатель традиции трупосожжения и проводник душ. Трупосожжение, бытовавшее у балтов и других народов в 1-м — нач. 2-го тыс. н. э., считалось наиболее легким способом помочь душе достичь небесного царства и обрести там новую жизнь, воскресение» *(Мифологический словарь. М., 1991. С. 505)*. (Не будзем звяртаць увагу на дзіўнае спалучэнне паганскага абраду з хрысціянскім уяўленнем пра «нябеснае царства».) Згаданы міфолаг А. Грэймас асмеліўся на яшчэ большае абагульненне: «Совій — гэта не толькі павадыр душаў, але і рэлігійны рэфарматар, літоўскі Заратустра» *(Грэймас Альгірдас Юліус. Пра багоў і людзей. У пашуках этнічнай памяці. С. 314)*.

Падобнага гонару, відаць, не дачакаецца «Альцыс — старажытны літоўскі казачны волат, што мае шмат падабенства з Альцыдам (першае імя Геркулеса)» *(Киркоръ А. Литовская мифология // Древности. Труды Московского археологического общества. Т. I. Вып. 2. М., 1865-67. С. 21)*. І ўвогуле, ці варта падаваць артыкул «Шатрыя» — пра гару з магілай Альцыса. Мабыць, толькі дзеля пацвярджэння меркавання Тэадора Нарбута, што «літоўская міфалогія была створана з грэцкай»

(Narbutt Teodor. Dzieje starożytne narodu litewskiego. T. I. Wilnia, 1835. S. III). Бо ў «Беларускай міфалогіі» варта было б згадаць нашага волата Каваля-Вярнідуба. А мы ўсё яшчэ азіраемся на чужыя ўзоры, прыкладам, на «боскага каваля Целявеля — памочніка Пяркунаса» *(«Каваль». С. 207)*, штучнасць якога выкрыў Аляксандр Брукнер, заўважыўшы, што чамусьці «...у цэнтры салярных літоўскіх міфаў — не сонца, як у арыйскіх народаў, а бог-каваль» *(Brückner A. Starożytna Litwa. C. 75)*.

Ад здані балцкіх «паралеляў», уплыву неабгрунтаваных гіпотэзаў аўтары «Беларускай міфалогіі» вызваляцца:

— дапусціўшы, што літва — гэта не племя, а ваярскі стан, сацыяльная група — заходнеславянскія прафесійныя ваяры. Яны на пачатку XI стагоддзя, як то вынікае з паведамлення Кведлінбургскіх аналаў пра гібель святога Бруна Кверфуртскага «in confinio Rusciae et Lituae» (паміж Літвой і Руссю, верагодна, сучаснымі паселішчамі Stara Litwa і Stara Ruś, што па-над рэчкай Слінай, прытокам Нарава), аселі ў Пабужжы, а таксама і на нашых землях, у Панямонні, дзе заснавалі вядомыя цяпер пяць вёсак Літва;

— не атаясамліваючы адназначна літву, ліцвінаў з продкамі сучасных літоўцаў, не саромеючыся сінанімічнасці тэрмінаў «літоўскі» ды «старабеларускі» (увогуле неабавязкова абсалютызаваць пэўныя элементы міфаў запазычаныя славянамі ў балтаў, яны могуць быць і ў славянаў, і ў балтаў рэліктамі вельмі даўніх агульных архетыпаў, бо для нашых міфаў маем хецкія, індыйскія, скандынаўскія адпаведнікі. Інакш будзем узоравацца, як згадваў А. Брукнер, на «міфалагічныя песні, нібыта запісаныя з вуснаў народу, а ў сапраўднасці падкінутыя "міфолагамі", якім "давяраць нельга"» *(Brückner A. Starożytna Litwa. C. 59)*;

— не падаючы славянскага паганскага святара Крыве (Kriwe) за «паганскага вярхоўнага святара балтаў (прусаў) Крывэ-Крывейтэ» *(С. 261)*, «вярхоўнага жраца старажытных балтаў — Krivis» *(С. 261)*, або за «Ліздзейку, «найвышэйшага паганскага біскупа» крыве-крывэйтэ» *(С. 289)*;

— выбіраючы з летапісаў імя Даўспрунк, а не форму Даўспрунгус *(«Ваўкамір». С. 72)*, што згадваецца толькі адзін раз;

— задумваючыся, чаму гэта летоўцы ў мінулым стагоддзі выракліся спрадвечнага імя гораду Ваўкамір ды назвалі яго Укмерге;

— згадваючы не толькі кнігу Міхаіла Кацара ў спісе выкарыстанай літаратуры да артыкулу «Жывёлы», але і шмат што з ягонага даробку хоць бы ў артыкулах «Вышыўка» ды «Ромб»;

— заўважаючы хоць бы Міцкевічавага гусляра (казляра) з «Дзядоў», а не «літоўскіх» вайдэлотаў, што нібыта спявалі ў прусаў.

І калі шаноўныя аўтары «Беларускай міфалогіі» рашуча выракуцца прыдуманых, кніжных міфаў і псеўдаміфічных вобразаў, я трэці раз ім пакланюся. І нават не буду чакаць, пакуль яны выправяць дробязныя памылкі ды апіскі (на жаль, шматлікія!) — дзеля другога выдання.

Здзіслаў СІЦЬКА.

У дадатак падаем меркаванне літоўскага даследніка пра рэцэнзаваную кнігу, надрукаванае ў Naujasis židinys // Aidai, 2004 06, Nr. 6, p. 287.

Бітым і цёртым гісторыяй, нашым суседзям беларусам нялёгка: сярод славянаў яны чамусьці не адчуваюць сябе славянамі, а балты не лічаць іх балтамі. З іншага боку, яны б хацелі быць і тымі, і другімі. Унутраны хаос адбіўся і ў першай спробе абагульніць беларускую міфалогію: асобным артыкулам уганараваны літоўскі жрэц Ліздзейка, але апісаныя і багі г. зв. Кіеўскага пантэону (XI ст.). Яшчэ ёсць жаданне быць найстарадаўнейшымі і «найбольш доўга захаванымі». Міфалагічная спадчына бачыцца як бесперапынны працяг індаеўрапейскага светапогляду, а апошняе паганскае свяцілішча разбуранае нібыта толькі ў 1937 г. Усё гэта перамешана са структуралізмам і аўтэнтычнымі звесткамі фальклору XIX—XX стст., так што кнігай можа скарыстацца толькі асцярожны чытач.

Пранас ВІЛЬДЖУНАС.

Ілюстрацыі да нумару падабраныя Аляксеем Хадыкам, Алесем Белым, Зміцерам Герасімовічам і аўтарамі артыкулаў.

На першай старонцы вокладкі: Полацк у XII–XIII стст. Рэканструкцыя Віктара Сташчанюка; праект новага беларускага герба, выкананага на грунце даўняй геральдычнай традыцыі (паводле матэрыялаў артыкулу Аляксея Шаланды, кампутарная графіка Андрэя Леўчыка).

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ І ПАДПІСЧЫКІ «СПАДЧЫНЫ»!

У сувязі з вялікім спазненнем па фактычным выхадзе часопіса рэдакцыя прыняла рашэнне выпускам гэтага нумару завяршыць 2003 падпісны год, а ў 2004–2005 гг., на якія падпіска не ажыццяўлялася альбо звернута, не выпускаць выданне. Часопіс перарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі і іншых дзяржаўных органах як квартальнік, і з 2006 г. будзе выдавацца ў рэальным часе.
Шукайце нас у падпісных каталогах, падпісвайцеся, купляйце!

ШАНОЎНЫЯ АЎТАРЫ «СПАДЧЫНЫ»!

Рэдакцыя часопіса будзе шчыра ўдзячная за выкананне нашых пажаданняў пры падачы матэрыялаў.

Тэкст у кампутарным наборы ў рэдактары Word, фармаце файла rtf падаецца ў рэдакцыю па дамоўленасці (тэл. 778-18-68) на дыскеце або электроннай поштай p_university@open.by. Пажадана пазбягаць формы машынапісу. Карэспандэнцыю дасылаць на адрас: вул. Коласа, 25-1-1, Мінск, 220013, Рэспубліка Беларусь.

Параметры набору: гарнітура Times, кегель 10 (асноўны тэкст) і 8 (спасылкі напрыканцы тэксту). Загалоўкі друкуюцца вялікімі літарамі, кегель 16, або малымі, кегель 14.

Увага! Матэрыялы мусяць быць ілюстраваныя (электронны выгляд або якасныя адбіткі).

Напрыканцы падаецца імя, імя па бацьку і прозвішча аўтара. Для зручнасці камунікацыі з чытачамі рэдакцыя прапануе паведамляць пры артыкулах электронны адрас аўтараў, а для патрэбаў рэдакцыі ў допісах дасылаць тэлефон і паштовы адрас.

У Інтэрнэце «Спадчыну» можна чытаць:
http://kamunikat.fontel.net/spadczyna.htm